УДК 336.71(476)(091)
ББК 65.262.1(4 Беи)
Б23

Аўтары:
Ш.І. Бекцінееў, С.П. Віцязь, А.В. Іоў, А.Л. Кіштымаў, Н.І. Курбанава,
Ю.П. Латушкова, С.А. Рыбчонак, Е.Н. Філатава, А.І. Шаланда, У.А. Юргенсон,
Т.У. Бялова, Л.П. Грынько, Ю.А. Барысюк

Рэдакцыйная калегія:
А.А. Каваленя, чл.-кар. НАН Беларусі, д-р. гіст. навук (гал. рэд.),
В.М. Ананіч (нам. гал. рэд.), С.П. Віцязь, д-р. гіст. навук,
Л.П. Грынько, В.В. Даніловіч, канд. гіст. навук,
А.А. Місуна, канд. экан. навук, А.І. Шаланда, канд. гіст. навук,
В.Д. Бажэнава, д-р. мастацтвазнаўства, праф., Т.У. Бялова,
С.Ю. Баравіцкая, К.М. Чарапок, М.В. Чэчко

Рэцэнзенты:
С.У. Амелька, канд. гіст. навук, С.М. Токць, канд. гіст. навук

Фотаздымкі:
А.Э. Смольскі, А.П. Дрыбас, Д.Ю. Важнік

У выданні выкарыстаны фатаграфічныя матэрыялы і дакументы
Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь,
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі,
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна,
Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва,
Архіва Відэа Гуку і Фатаграфіі "Niezbudka" (Рэспубліка Польшча),
Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея,
Музея ААТ «ААБ Беларусбанк»,
з архіва ААТ «ААБ Беларусбанк»,
з прыватнай калекцыі В.В. Мазуркевіча

Б23 **Банкаўская справа Беларусі. Гісторыя** / Аўт. Ш. І. Бекцінееў [і інш.] ; – рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беловагрупп, 2017. - 360 с. : іл.

ISBN 978-985-7154-17-3

Выданне прысвечана гісторыі банкаўскай справы Беларусі. Разглядаецца шэраг аспектаў, звязаных з гісторыяй станаўлення грашовага абарачэння і фарміравання банкаўскай справы на беларускіх землях. Усебакова аналізуюцца плацежныя сродкі, іх сацыяльнае суправаджэнне, станаўленне акумулюючай і крэдытнай фінансавых сістэм, афармленне протабанкаўскіх функцый, іх інстытуалізацыя, з'яўленне і развіццё банкаў, складанне і рэарганізацыі банкаўскай сістэмы. Абмяркоўваюцца перасаналіі і элементы прафесійнай банкаўскай культуры ад старажытных часоў па сённяшні дзень на прыкладзе ААТ «ААБ Беларусбанк» як першага праваперaемніка ашчаднай справы Беларусі.

Кніга выдаецца з нагоды 95-годдзя ААТ «ААБ Беларусбанк».

УДК 336.71(476)(091)
ББК 65.262.1(4 Беи)

ISBN 978-985-7154-17-3

© ААТ «ААБ Беларусбанк», 2017
© Афармленне. ТДА «Бяловагруп», 2017



БАНКАЎСКАЯ СПРАВА БЕЛАРУСІ. ГІСТОРЫЯ

95 гадоў
ААТ «ААБ БЕЛАРУСБАНК»



Паважаны калега!

Кніга, якую Вы разгарнулі, прысвечана гісторыі банкаўскай справы Беларусі.

Вопыт пакаленняў – гэта той падмурак, на якім заўсёды будуць грунтавацца і ўдасканальвацца Вашы прафесійныя веды. Упэўнены, што Ваш выбар звязаць свой лёс з Беларусбанкам зроблены свядома, таму Вы будзеце ўзорна выконваць свае абавязкі, шанаваць кодэкс гонару банкаўскага працаўніка.

Поспех любой справы залежыць ад якасці старту. Беларусбанк – цудоўны пачатак працоўнага шляху: гэта грунтоўна, аўтарытэтна, прэстыжна!

Гісторыя айчыннай банкаўскай справы цесна пераплецена з гісторыяй краіны. Перагортваць старонкі банкаўскага летапісу надзвычай цікава не толькі таму, што яны даюць магчымасць вывучаць шлях развіцця ад звычайных канторскіх лічыльнікаў да высокіх тэхналогій, ад першых спроб захоўнасці пазык да сучаснага еўрапейскага ўзроўню банкаўскага бізнесу, аднак жа і паглядзець на мінулае з пазіцый канкрэтнага напрамку – банкаўскай справы.

Датай заснавання Банка афіцыйна прызнана 26 снежня 1922 г., калі выйшла пастанова Саўнаркама РСФСР «Аб заснаванні дзяржаўных ашчадных кас».

Такая ўсталявалася звычка ў савецкай гісторыі – за пункт адліку прымаць паслярэвалюцыйны грамадскі лад.

Аднак гісторыя мае свае пункты адліку – яе карані заўсёды знаходзяцца ў глыбінях часу, і банкаўская справа якраз і сведчыць аб тым.

Стварэнне сістэмы грашовага абароту і фінансавай сістэмы наогул, развіццё ашчаднай, разліковай, крэдытнай дзейнасці і, у прыватнасці, банкаўскай справы на беларускіх землях – гэта доўгі эвалюцыйны шлях.

Пісьмовыя гістарычныя крыніцы сведчаць: перад тым, як з'явіліся банкі, на тэрыторыі Беларусі ўжо існавала самаарганізаваная актыўная рэгіянальная фінансавая сістэма; якую змястоўна магчыма вызначыць, як «брацка-цэхавую», яна даволі паспяхова выконвала шэраг банкаўскіх функцый у XV–XVIII стст.

Найбольш пэўна і шырока ашчадна-крэдытная дзейнасць на нашай зямлі разгарнулася з канца XVI ст.

У 1579 г. езуіт Пятро Скарга стварыў у сталіцы Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) Вільні «пабожны банк» («montes pietatis»).

20 лістапада 1592 г. вялікі князь ВКЛ Жыгімонт III Ваза зацвердзіў Статут цэха мінскіх шаўцоў.

У 1598 г. ў Нясвіжы князь Мікалай Радзівіл Сіротка заснаваў першы на тэрыторыі сучаснай Беларусі «пабожны банк»...

Першая ашчадная каса дзейнічала ў Магілёве ўжо ў 1813 г., яшчэ да падпісання адпаведнага Указа імператара расійскага Мікалая I ад 1841 г.

Сапраўды, у часе рэвалюцыйных перабудаванняў банкі царскай Расіі былі нацыяналізаваны, па сутнасці, знішчаны, і ашчадныя касы спынілі сваю работу, аднак жа засталіся знаўцы сваёй справы, таму засталася і сама справа і яе арганізацыя, захаваліся дзелавая школа і прафесійны вопыт.

Спецыялісты фінансавай сферы вучылі моладзь і рабілі гэта з пакалення ў пакаленне, а ў наш час ішло навучанне бізнесу і ягонай сацыяльнай адказнасці. Разам усё гэта і стварыла той трывалы падмурак, на якім грунтуецца сучасная айчынная банкаўская сістэма, тыя яе эканамічныя асновы, прынцыпы, філасофія, якіх заўсёды трымаецца Беларусбанк, і Вы павінны іх прыняць і развіваць.

«Доўгая дарога пачынаецца з першага кроку», – гаворыць старажытная прыказка.

Доўгая дарога – гэта Ваша дарога.

Вам давядзецца адказваць на тыя цяжкія пытанні, якія будзе ставіць час; Вам давядзецца будаваць банк будучыні!

Вырашаючы складаныя дзяржаўныя і сацыяльна важныя задачы, авалодваючы сучаснай практыкай, інавацыямі, якасным абслугоўваннем, наш Банк імкліва здабывае статус высокатэхналагічнай фінансавай установы.

Вы сваёй працай, руплівасцю і талентам абавязкова павялічыце поспехі і аўтарытэт нашага Банка.

Жадаю Вам плённай шчаслівай дарогі!

Старшыня Праўлення
ААТ «ААБ Беларусбанк» *Віктар Ананіч*

ДАБАНКАЎСКІ ПЕРЫЯД

























Адпраўны крок на шляху да банка — фарміраванне грашовага абарачэння. У сваю чаргу, грашовае абарачэнне складаецца на развітой эканамічнай аснове, што ўключае ў сябе элемент таварнай вытворчасці. Таварны абмен прыводзіць да з'яўлення пэўнага вартаснага эквіваленту — спачатку ў таварнай форме, затым у грашовай. Грошы, універсальная мера кошту — ключавое звяно пабудовы эканамічных адносін і фінансавых сістэм, аснова банкаўскай справы.

НА ШЛЯХУ ДА ГРОШАЙ

ГРОШЫ – СВАЙГО РОДУ ДАМОВА ПАМІЖ БАКАМІ АБ АЦЭНЦЫ ЗНАЧНАСЦІ ІХ УКЛАДУ. Гэта ацэнка мела рознабаковы характар, у тым ліку, у розных адносінах, долі эканамічнай значнасці, сацыяльнай, асобаснай. З'яўленню грошай, меры кошту, папярэднічала складанне вартасных ацэнак, сістэм рэгіянальных каштоўнасцей. Гэтыя паняцці асвойваліся здаўна.



Неапрацаваны крэмень



Вусце крэмнездабывальнай шахты ў п. Краснасельскі (III–I тысячагоддзі да н.э., Гродзенская вобл.)

У старажытнасці асаблівае значэнне меў крэмень — камень высокіх функцыянальных уласцівасцей. Сёння ён амаль не прыцягвае ўвагі, але некалі яго россыпы вызначалі ўзровень жыцця чалавецтва, забяспечвалі магчымасці асваення навакольнай прасторы.

Напамінам пра гэта служаць скарбы крамянёвай сыравіны і вырабаў пачынаючы з IX тысячагоддзя да н.э., выяўленыя археолагамі на тэрыторыі Беларусі, а таксама помнік еўрапейскага ўзроўню – крэмнездабывальныя шахты (некалькі сотняў) III–I тысячагоддзяў да н.э. у п. Краснасельскі. Навукоўцамі абмяркоўваецца палажэнне, што нарыхтоўкі з крэменю выконвалі ролю самых старажытных разліковых сродкаў, протагрошай.

Наступная пасля каменнага веку эпоха, бронзавы век, мае толькі намінальнае дачыненне да рэгіёна Беларусі, хутчэй ідэалагічнае. З той прычыны, што тут зусім адсутнічаюць радовішчы каляровых металаў. Рэдкасцю было і паступленне іх звонку, аж да ранняга сярэднявечча. Таму ў эвалюцыі рэгіёна працяглы перыяд спалучаліся новыя погляды і старыя матэрыялы, той жа крэмень. З VII ст. да н.э. была засвоена вытворчасць жалеза з мясцовай, балотнай руды, што мела вынікам распаўсюджванне новых інструментаў і тэхналогій, кардынальна змяніла рэгіён, паскорыла яго эканамічнае развіццё.



Антычныя манеты I ст. н.э. з Лышчыцкага скарбу (1974 г., Брэсцкая вобл.)



Балтыйскі бурштын
(знаходкі ў Брэсцкай вобл.)



Асноўныя водныя гандлёвыя шляхі ранняга сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі

Тэрыторыя Беларусі размешчана ў лясной паласе Усходняй Еўропы. Спрадвечны ландшафт складалі незлічоныя рэкі, азёры і балоты, размешчаныя сярод шырокіх лясных масіваў. Рэгіён ляжыць у вобласці кантынентальнага водападзелу Балтыйскага і Чорнага мораў, многія рэкі бяруць тут выток. Нядзіўна, што рэгіён уцягваўся ў дзейнасць рачных гандлёвых шляхоў, якія пранізвалі лясныя гушчары. Яркі след пакінуў «бурштынавы» гандлёвы шлях першай паловы I тысячагоддзя н.э. (Рымская імперыя – узбярэжжа Балтыкі). Яго «рэхам» сталі знаходкі бурштыну, правінцыйна-рымскіх імпартаў і рымскіх манет.

Аднак, тыя манеты яшчэ не з'яўляліся сродкам мясцовага грашовага абарачэння. Яны, як і раней крэмень, увасаблялі толькі сыравінную каштоўнасць.

Да канца I тысячагоддзя н.э. праз тэрыторыю Беларусі пралеглі чарговыя трасы транскантынентальных гандлёвых шляхоў, уключаючы найважнейшыя — шляхі «з варагаў у грэкі» (узбярэжжа Балтыкі — Візантыя, арабскі Усход).

Спачатку рух гандляроў быў транзітным, з часам іх кантакты з мясцовымі жыхарамі набылі саюзныя дачыненні, абудзілі спачатку абменныя, а затым гандлёвыя аперацыі. Адначасна адбывалася асваенне новых матэрыялаў, тэхналогій, стыляў, інструментаў. На памежжы I і II тысячагоддзяў н.э. у рэгіёне фарміравалася таварная вытворчасць і адпаведная ёй шкала каштоўнасцей. Ролю ранніх «грошай» эпізадычна выконвалі рознага роду вартасныя эквіваленты: шкляныя пацеркі (яны з'явіліся менавіта ў гэты перыяд, завозіліся з Візантыі), ракавіны кауры (з Індыі, Кітая), прасніцы з ружовага шыферу (з радовішчаў на Валыні), а таксама мясцовыя футравыя шкуры, металічныя манеты-імпарты (у пачатку IX – пачатку XI стст. – арабскія дырхемы, у X – пачатку XII стст. – заходнееўрапейскія дэнарыі), зліткі з каляровых металаў.



Каштоўнасці Паўднёвага Усходу ў рэгіёне Беларусі: сярэбраныя дырхемы – Абасіды, Аль-Махдзі (775–785); Абасіды: Аль-Мустафі (902–908); Саманіды, Ісмаіл ібн Ахмад (892–907)

Ракавіны кауры (XII ст., Полацкае гарадзішча), шкляныя пацеркі (XI ст., Гарадзішча на Менцы)







Брылеўскі скарб канца IX ст. (2000 г., Мінская вобл.): сярэбраныя дырхемы, сярэбраная шыйная грыўня, фрагмент скандынаўскага мяча

Адметнай рысай ранняга сярэднявечча з'яўляецца масавае распаўсюджванне скарбаў у рэгіёне. Тыя скарбы адлюстроўваюць радыкальныя перамены грамадскага светапогляду, ладу жыцця і гаспадарання — пераход ад супольных традыцый да індывідуальных, ад даверных адносін да разліковых. Скарбы эпохі сярэднявечча ўключаюць невядомыя раней разнастайныя ўпрыгожванні і зліткі з каляровых металаў, адлюстроўваюць новае разуменне каштоўнасцей, выхад за рамкі прагматычнай утылітарнасці, крок да раскошы.

Паказальным з'яўляецца склад Брылёўскага скарбу канца IX ст., знойдзенага ў вярхоўях Заходняй Дзвіны. Ён уключае традыцыйныя элементы рыштунку раннесярэднявечнага купца-вікінга: меч, гіркі-разнавагі, а таксама «сродкі разлікаў»: арабскія сярэбраныя манеты — дырхемы, вітая сярэбраная грыўня. У дадзеным выпадку абодва «сродкі разлікаў» раўназначныя для тагачаснай еўрапейскай ляснай паласы — рэдкі каляровы метал, наміналам якога была ўласная вага, а вонкавае афармленне з'яўлялася толькі адлюстраваннем рэгіянальнага стандарту якасці.

Адначасна з развіццём гандлёвых сувязей і саюзных адносін рэгіён увайшоў у сферу ўплыву Балтыкі і Русі, здабыў адпаведную адміністрацыйную будову, формы ранняй дзяржаўнай арганізацыі — старажытнарускіх княстваў (Полацкае, Тураўскае). Геаграфія адносін натуральным чынам вызначала ўплывы і тэндэнцыі ў фарміраванні ранняга грашовага абарачэння.







Міліарысій (Візантыя)



Намісма (Візантыя)



Грыўня з Брылеўскага скарбу



Дэнарый (Чэхія)

Еўрапейскія манеты, якія мелі хаджэнне на тэрыторыі Беларусі ў раннім сярэднявеччы

МАНЕТНЫЯ ІМПАРТЫ

СКЛАД МАНЕТНЫХ СКАРБАЎ КАНЦА I – ПАЧАТКУ II ТЫСЯЧАГОДДЗЯ Н.Э. СВЕДЧЫЦЬ аб незвычайна шырокіх эканамічных сувязях рэгіёна: арабскі Усход, Індыя, Іран, Візантыя, заходнееўрапейскія дзяржавы і інш.

Найбольш у скарбах прадстаўлены арабскія дырхемы (вядома больш за 180 скарбаў). Разам з дырхемамі (тут іх называлі «куны», «нагаты») з'яўляліся адзінкавыя экзэмпляры сярэбраных драхмаў сасанідскіх цароў Ірана IV–VII стст., а таксама перайманні дырхемаў з Волжскай Булгарыі, Хазарыі, Русі. З канца X ст. на тэрыторыю Беларусі траплялі манеты краін Заходняй Еўропы, у асноўным германскія пфенігі, англасаксонскія пені, дэнарыі Венгрыі, Чэхіі, іншых краін, мелі хаджэнне і візантыйскія манеты – залатыя намісмы, сярэбраныя міліярысіі, часам медныя фолісы.

Аканка першых грашовых знакаў вялікіх кіеўскіх князёў пачалася неўзабаве пасля прыняцця хрысціянства на Русі ў 988 г. Прататыпам для іх паслужылі візантыйскія манеты. Уласная чаканка ў Старажытнай Русі праводзілася абмежавана, толькі ў канцы X — пачатку XI стст., мела пераважна прэстыжны характар і не атрымала шырокага распаўсюджвання.

Разлікі вяліся не паводле наміналаў манет, а на аснове вагавых суадносін. Гэта сведчыць, што манеты з'яўляліся толькі прамежкавым абменным эквівалентам, але не выконвалі фінансавай функцыі. Такая спецыфіка ярка раскрылася на наступным этапе фарміравання мясцовай сістэмы плацёжных сродкаў, калі на змену іншаземным манетам прыйшлі мясцовыя металічныя зліткі.

Грашовы абарот у ранні перыяд не быў паўсюдным. Грошы абарочваліся пераважна ў гарадскім рамесна-адміністрацыйным і ваенна-купецкім асяроддзі (зноў-дзеныя ў сельскай мясцовасці манеты выкарыстоўваліся ў якасці ўпрыгожванняў).



Дэнарый (Чэхія)



Дэнарый (Гільдэсгейм)

Дэнарый (Англія)

Раннесярэднявечныя манеты захаду і поўначы Еўропы ў рэгіёне Беларусі



Адна з ранніх манет Русі: Уладзімір Святаслававіч, сярэбранік, Кіеў (каля 1011 г.)

ПАЧАТАК ФАРМІРАВАННЯ МЯСЦОВАЙ СІСТЭМЫ РАЗЛІКОВЫХ СРОДКАЎ

З ПАЧАТКУ XII СТ. ДА СЯРЭДЗІНЫ XIV СТ. У РЭПЁНЕ СПЫНІЎСЯ ПРЫТОК ІМПАРТНЫХ манет (са знешніх прычын, сярод якіх – карэнная рэарганізацыя манетнай справы ў Еўропе, ваенныя паходы крыжакоў у паўднёва-ўсходнюю Балтыку і інш.).



Аснову мясцовага грашовага абарачэння склалі металічныя зліткі «грыўні» і футравыя «куны». Матэрыялам для зліткаў служылі назапашаныя раней дырхемы і дэнарыі, а таксама ляпёшкападобныя германскія зліткі, якія паступалі праз Ноўгарад. Вызначаны лік аднолькавых па вазе манет служыў мерай вагі зліткаў-грыўні. Першапачаткова слова «грыўня» азначала шыйны абруч. Затым яно набыло вагавае значэнне, якое адпавядае вызначанай колькасці (масе) срэбра (грыўня срэбра). Паколькі грыўня срэбра магла складацца з некалькіх аднолькавых манет, то з'явілася грыўня кун, па ліку манет.

Грыўня срэбра (вагавая) і грыўня кун (падліковая) сталі плацежна-грашовымі паняццямі. У грашова-вагавых разліках на тэрыторыі Беларусі асноўную ролю мелі грашовыя сістэмы суседніх рэгіёнаў: паўночная і паўднёвая. Асновай паўночнай сістэмы абарачэння паслужыў наўгародскі рубель – грыўня срэбра. З'явіўшыся ў XIII ст., ён да XV ст. выконваў ролю ўніверсальнай для рускіх зямель плацежнай адзінкі. Паўднёвая сістэма будавалася на кіеўскай грыўні. Таксама сустракаюцца «заходнерускія» або «літоўскія» зліткі (палова наўгародскага – «полтина» («паўрубель»)). Недахоп манетнага срэбра ва ўнутраным гандлі кампенсаваўся скуркамі пушных звяроў («куна», «векша»), якія замянялі разменныя грошы. У грашовым абарачэнні ўдзельнічалі яшчэ і грыўні, адлітыя ў золаце, але яны ўжываліся вельмі рэдка. Таксама захоўвалася роля непасрэдна тавараабменных аперацый.

Грашовае абарачэнне гэтага перыяду ілюструе склад скарбу, знойдзенага на гарадзішчы XII—XIII стст. Вішчын Рагачоўскага раёна: дзясяткі залатых і сярэбраных рэчаў, у тым ліку рознатыповыя плацежныя зліткі, разнастайныя жаночыя ўпрыгожанні.

Важна падкрэсліць, што ў гэты перыяд ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне адбывалася складанне ўласнай плацежнай сістэмы, у аснову якой ляглі арыгінальныя плацежныя сродкі, зліткі з рэдкіх для рэгіёна каляровых металаў – грыўні.

У другой палове XIII ст. землі Беларусі былі аб'яднаныя ў новым дзяржаўным утварэнні – Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) і займалі ў ім цэнтральнае месца ў перыяд усёй, больш чым паўтысячагадовай гісторыі. У княстве ішоў актыўны працэс развіцця феадальнай гаспадаркі, з паступовым пашырэннем рознаўзроўневага абмену, усталяваннем таварна-грашовых адносін.



Вішчынскі скарб XII–XIII стст. (1979 г., Гомельская вобл.): плацежныя зліткі-грыўні тыпаў: кіеўскага (унізе), наўгародскага (у цэнтры) і літоўскага (уверсе, справа і злева); залатыя і сярэбраныя ўпрыгожанні

ПЕРШЫЯ ЭМІСІІ ЎЛАСНЫХ МАНЕТ У ВКЛ

У ВКЛ СКЛАДВАЛАСЯ ЎЛАСНАЯ ГРАШОВАЯ СІСТЭМА. XIII СТ. ПАКІНУЛА ТАКІЯ падліковыя паняцці, як «грыўня», «рубель», «полтина» («паўрубля»). Пазней адзначана бытаванне пражскай грыўні, якую ў другой палове XV ст. выцесніла грыўня кракаўская.

Важны прэцэдэнт канца XIV ст. — у ВКЛ упершыню быў праведзены выпуск уласнай манеты — «літоўскага дэнарыя» («пенязь»). Але, з прычыны дэфіцыту сыравіны, сама сярэбраная манетка была маленькай, і яе эмісіі не праявіліся заўважным чынам у грашовым абарачэнні. Да цяперашняга часу не зарэгістравана выпадкаў адкрыцця скарбу гэтага дэнарыя на тэрыторыі Беларусі; вядомыя толькі адзінкавыя знаходкі.

Як бачна, сродкі грашовага абароту ў рэгіёне былі неаднастайныя, прадстаўленыя наміналамі занадта буйнымі (рублі, паўрублі) — з аднаго боку, і занадта дробнымі (дэнарыі) — з другога. Яны, натуральна, не маглі ў поўнай меры задаволіць запыты тавараабароту, які развіваўся і патрабаваў больш разнастайных і «гнуткіх» грашовых адзінак.

Сярэдневяковыя мініяцюры з выявай майстроў (мінцмайстроў) за вырабам загатовак і ручной чаканкаю манет пры дапамозе малатка









Першая ўласная манета ВКЛ – пенязь, канец XIV ст.


РЫГА
ЛАТГАЛЫ
ПОЛАЦК
ВІЛЬНЯ
НОВАГАРОДАК
Ваўкавыйск
Горадна
Слонім
Менск
Віцебск
СМАЛЕНСК
Друцк
Свіслач
ПІНСК
Тураў
Дубровіца
Берасце
Кобрын
Камянец
Ратна
Уладзімір
Луцк
Крамянец
Львоў
Перамышль
ГАЛІЧ
Цярабоўля
Бельз
Холм
Люблін
Полацкае княства
Віленска-Троцкае княства
Смаленскае княства
Полацкае княства
Віцебскае княства
Полацкае княства
Полацкае княства
Полацк

ДОБАНКОВСКИЙ ПЕРИОД

ДОБАНКОВСКИЙ ПЕРИОД — САМЫЙ ДЛИТЕЛЬНЫЙ НА ПУТИ К ОРГАНИЗАЦИИ банковского дела (его протяженность на территории Беларуси — с конца IX тысячелетия до н.э. по XIV век н.э.). При отсутствии местных месторождений цветных металлов в регионе принимались разнообразные ценностные эквиваленты.

Важную роль в сложении региональной системы ценностей сыграли коммуникации, водные пути, что естественно для территории Беларуси, лежащей в водоразделе рек двух европейских морей – Балтийского и Черного. Появление первых монет на территории Беларуси было результатом транзитных обменных связей на пути между Древним Римом и населением Балтийского побережья («Янтарный путь»). Новый приток монет осуществился благодаря очередному включению региона в торговые отношения («Путь из Варяг в Греки», Балтийско-Черноморский) между Севером и Югом (особое место имели арабские дирхемы), и затем между Западом и Русью (западноевропейские денарии и др.). Свидетельством этих устойчивых контактов стало распространение монетных кладов.

Контакты по водным путям оказали влияние на развитие экономики, на сложение государственности. Торговые связи стимулировали оформление расчетных отношений и денежного обращения. В результате происходило формирование товарного производства, товарного рынка и как следствие – сложение основ региональной денежной системы.

PRE-BANK PERIOD

PRE-BANK PERIOD WAS THE LONGEST PERIOD ON THE ROAD TO BANKING. ON THE territory of Belarus it lasted from the end of the 9th millennium BCE to the 14th century CE. In the absence of local non-ferrous metals deposits various value equivalents were used in the region.

An important role in the development of the regional system of values played communication routes, such as waterways. It was natural for the territory of Belarus, which lies in the watershed of two European seas – the Baltic and the Black. Appearance of the first coins on the territory of Belarus was the result of exchange links on the route between Ancient Rome and the population of the Baltic Sea ("Amber Road"). The new influx of coins owes to the further incorporation of the region into trade (Route from the Varangians to the Greeks, from the Baltic to the Black Sea) between the North and the South (an important role played Arab dirhams), and then between the West and Russia (the West European denarii, and others). The evidence of these contacts was the distribution of coin hoards.

Contacts by waterways had an impact on economic development and the formation of statehood. Trade relations stimulated relations between settlements and monetary circulation. This resulted in the formation of commodity production, commodity market and, as a consequence, the emergence of the regional monetary system.



ПРОТАБАНКАЎСКІ ПЕРЫЯД






O LICHWIE
y
Trzech przednieyszych
KONTRAKCIECH:
Wydzierkowym/
Czynszowym/ y
Towarzystwá Kupieckiego/
NAVKA KROTKA.
PISANA
Przez X. D. Marcińá Smigleckiego
Societatis IESV, Theologiey Pro-
fessorá/ w Akademiey Wileńskiey.
Y powtore wydána.
W WILNIE
W Drukárniey Akademiey Wileńskiey Societ. IESV. CHRI-
STOPHORA PAVLO Roku Páńskiego, 1594.
Permissu Superiorum.










Roku 17 Miesiąca
Zapłacił do Skarbu Rzpltey W. X. L. za
Złotych
Z odebrania kwitując podpisuję się; Da
ut supra


Nro. Dnia z Parafii
Roka 1793 Miesiąca Początku
z Maietności
Raty do
w Ogule Zł. Pol:
Kassy Powiatu Grodzień: cum Solario opłacono







Стварэнне банка ў гістарычным плане — вынік працяглай сацыяльнай эвалюцыі, эканамічнага развіцця, арганізацыйнага афармлення асобных протабанкаўскіх функцый у форме новага сацыяльнага інстытута. Протабанкаўскія функцыі складваліся натуральным чынам і выконваліся праз мясцовыя сацыяльна-эканамічныя механізмы. Іх афармленне, рэгламентацыя дзеянняў адлюстроўваюць гістарычныя асаблівасці, традыцыі рэгіёнаў і складаюць змест протабанкаўскага перыяду. У сярэднявеччы эканамічнае жыццё рэгіёна Беларусі ўвасобіла ў практыцы шэраг дзеянняў, якія па сутнасці з'яўляліся протабанкаўскімі паслугамі. Сукупны комплекс такіх паслуг, выкананых досыць трывала і рэгулярна, можна ўмоўна вызначыць як «віртуальны» банк, протабанк.

У другой палове XIII ст. у выніку палітычнага аб'яднання беларускіх і літоўскіх зямель (у сучасным разуменні этнарэгіёнаў) ва Усходняй Еўропе паўстала новае дзяржаўнае ўтварэнне — Вялікае Княства Літоўскае і Рускае (пазней дадалося — Жамойцкае). Грашовае абарачэнне на тэрыторыі гэтай дзяржавы (ВКЛ) меў сваю спецыфіку.

ГРАШОВАЕ АБАРАЧЭННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У АДСУТНАСЦІ ЎЛАСНЫХ РАДОВІШЧАЎ КАЛЯРОВЫХ МЕТАЛАЎ ГРАШОВАЯ СІСТЭМА ВКЛ стваралася на аснове прыцягнення іншаземных эмісій. У выніку палітычнага і эканамічнага развіцця Вялікага Княства Літоўскага ў XIV–XV стст. быў сфарміраваны новы фонд сродкаў рынкавага абарачэння і плацяжу, які якасна адрозніваўся ад папярэдняга перыяду. З ім, перш за ўсё, суадносіцца буйная сярэбраная манета — пражскі грош. Яго чаканка была распачата ў 1300 г. у чэшскім горадзе Кутна Гора. Эмісіі гроша заваявалі агульнаеўрапейскае прызнанне і сталі асновай грашовай гаспадаркі ВКЛ да канца XV ст.



Пражскі грош караля чэшскага Яна I Люксембурга (1310–1346 гг.), Чэхія

Карта Вялікага Княства Літоўскага XV – першай паловы XVI ст.





Карта Рэчы Паспалітай, другая палова XVI ст.



Пражскі грош настолькі ўсталяваўся ў Вялікім Княстве Літоўскім, што нават стаў адсюль пастаўляцца на Усход — у рускія землі.

У беларускіх пісьмовых крыніцах пражскі грош фігуруе звычайна ў суправаджэнні эпітэтаў, якія падкрэсліваюць яго вялікі памер («шырокі») і паўнавартаснасць («добры»), часам — паходжанне («прагский», «ческий»). У грашовых разліках умацаваліся паняцці: капы і паўкапы, рубля і паўрубля – «полтины». Спачатку капа (60 грошаў) амаль адпавядала тэрміну «рубель». Але падзенне якасці пражскіх грошаў (скарачэнне вагавай долі срэбра), з сярэдзіны XIV ст., абясцэніла іх удвая адносна вагавага рубля да пачатку XV ст. Неўзабаве імпарт чэшскага манетнага срэбра ў ВКЛ спыніўся зусім: з 1419 г. Чэхія ўступіла ў паласу Гусіцкіх войнаў і спыніла чаканку манеты. Выпуск пражскага гроша, адноўлены з 1457 г., ажыццяўляўся ў значна меншых тыражах. Кутна Гора страціла значэнне найбуйнейшага эмісійнага цэнтра Еўропы.

Пры панаванні пражскага гроша ў грашовай гаспадарцы ВКЛ, акрамя зліткаў і дэнарыяў, абарочваліся і іншыя грашовыя адзінкі: шылінгі Лівонскага Ордэна, сярэбраныя (дырхемы) і медныя (пулы) манеты Залатой Арды XIV–XV стст. У другой палове XV ст. у грашовы лік рэгіёна Беларусі ўключылася польская грыўня, пазней — залаты венгерскі («вугорскі») дукат, залаты англійскі нобль (т. зв. «карабельнік»). Развіццё міжнароднага гандлю патрабавала вялікай колькасці манет буйнога наміналу. Пры недахопе золата на рынках Еўропы да канца XV ст., у лішку было срэбра, што паходзіла з багатых радовішчаў у Багеміі і Ціролі. Таму на рубяжы XV і XVI ст. на нямецкіх землях з'явіўся новы від буйной сярэбранай манеты — талер, які быў уведзены як замяняльнік залатога фларына. У Вялікім Княстве Літоўскім талер вядомы з 1529 г.

Прыток іншаземнай манеты не заўсёды быў пазітыўным для грашовага абарачэння. Так, з пачатку XVI ст. у ВКЛ паступалі манеты з сілезскага горада Свідніцы, якія дакладна капіравалі польскі паўгрош, але адчувальна саступалі яму па намінале. Прыём гэтай «подлай», як тады называлі, манеты быў катэгарычна забаронены ў Вялікім Княстве Літоўскім.





Іоахімсталер графа Стэфана Шліка. Чэхія, каля 1519 г.



Вільня часоў Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівіл (рэканструкцыя), XVI ст.

Прысутнасць іншаземнай манеты, з аднаго боку, сведчыла аб шырокіх гандлёвых сувязях ВКЛ, з другога — выявіла патрэбу ў іншым узроўні грашовых адносін. У канцы XV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім быў адкрыты ўласны Віленскі манетны двор. Спачатку ён выконваў масавую чаканку дэнарыя (пенязя) і паўгроша, але ўжо ў першай палове XVI ст. манетныя эмісіі ВКЛ сталі больш разнастайнымі па наміналах і маштабнымі па аб'ёмах. Разам з тым, пры разліках і плацяжах, нягледзячы на высокі ўзровень развіцця грашовай гаспадаркі ВКЛ, выкарыстоўвалася не толькі наяўная звонкая манета (называлася «гатавізна», «грошы одлічаныя», «грошы гатовыя», «грошы рукадайныя»), але і тавары («фанты»). Найбольш ужывальнымі з'яўляліся футры пушнога звера, назвы якіх запазычаныя некаторымі відамі падаткаў («кунічнае»).

Неўзабаве пасля аб'яднання ў 1569 г. Вялікага Княства Літоўскага з Польскім Каралеўствам у саюзную дзяржаву Рэч Паспалітую, Віленскі манетны двор спыніў працу.

Спачатку Рэч Паспалітая не чаканіла манеты, карыстаючыся прадукцыяй грашовай вытворчасці мінулых гадоў. Некаторы час манеты чаканіліся ў замку Дальхольм пад Рыгай. З прычыны іх нізкапробнасці выпускі былі спыненыя, а сам манетны двор зачынены.

Пасля сыходу з жыцця караля Жыгімонта Аўгуста, перапынілася дынастыя Ягелонаў, і ў Рэчы Паспалітай наступіла анархія, выкліканая барацьбой за ўладу кандыдатаў на трон ад розных магнацкіх фракцый.

У другой палове XVI ст. адзначалася інтэнсіўная ўцечка дабраякаснай манеты з Рэчы Паспалітай за мяжу, пераважна ў Германію. Для стабілізацыі становішча прымаліся самыя рашучыя меры – забараняліся замежныя паездкі купецтва, аб'яўляліся па-за законам «талеры злые і неважные». Тым не менш, эканамічнае становішча ВКЛ прыкметна пагаршалася, адбывалася падзенне рэальнага кошту разменных грашовых наміналаў. Абраны на прастол Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый здолеў паставіць дзяржаўныя фінансы на трывалую аснову. Немалую ролю ў стабілізацыі фінансавай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага часоў яго праўлення сыграў падскарбі Лаўрын Война.

Война Лаўрын, сын Мацея (?—1580), адзін з вядомых падскарбіяў земскіх ВКЛ. Паходзіў з вядомага беларускага шляхецкага роду Войнаў герба «Трубы». Верагодна, атрымаў адукацыю ў Еўропе. Кар'еру пачаў пры панаванні Жыгімонта Аўгуста ў якасці каралеўскага двараніна. У 1561—1566 гг. па загадзе манарха праводзіў аграрную рэформу (т.зв. валочную памеру) у Пінскім старастве. Яго стараннасць было заўважана, і ўжо ў 1566 г. Война стаў вялікім пісарам, а у 1569 г. атрымаў другую важную пасаду — падскарбія дворнага або асабістага каралеўскага скарбніка, адказнага за забеспячэнне матэрыяльных патрэб манарха. Пасля некалькіх гадоў бескаралеўя Лаўрын Война прыняў актыўны ўдзел у выбарах новага караля Стэфана Баторыя. У 1576 г. Баторый прызначыў свайго падскарбія дворнага на пасаду падскарбія земскага ВКЛ з утрыманнем за ім і пасады пісара ВКЛ. Гэта быў вельмі адказны момант, паколькі Інфлянцкая вайна ўступіла ў рашаючую стадыю, і Стэфан Баторый асабіста ўзначаліў паход войска з мэтай вызвалення захопленых зямель Полацкага ваяводства ад праціўніка. У тым, што паход аказаўся ўдалым, несумненна, ёсць і асабісты ўклад падскарбія земскага Вялікага Княства Літоўскага.

Падскарбі земскі падпарадкоўваўся непасрэдна манарху, ён адказваў за захаванасць дзяржаўнай казны, паступленне падаткаў і пошлін, кіраваў дзейнасцю манетнага двара і каралеўскіх рэвізораў, паборцаў і іншых чыноўнікаў па гаспадарчай частцы (фактычна яго пасада адпавядае сучаснай пасадзе міністра эканомікі і фінансаў). У распараджэнні падскарбія былі і бягучыя дзяржаўныя выдаткі, у тым ліку і выплата грошай войску.



Чаканка манет пры дапамозе молатавай прылады (XVI–XVII стст.)

Жыццёўленыя намаганні прынеслі свой плён. Рэч Паспалітая паступова стала найважнейшым пастаўшчыком на рынку Заходняй Еўропы хлеба, мёду, попелу, футра, лёну, пянькі і найбуйнейшым імпарцёрам медзі, жалеза, срэбра, іншых тавараў. Праз беларускія землі ВКЛ пашыраліся эканамічныя сувязі Рэчы Паспалітай з Расіяй і іншымі ўсходнімі краінамі.



Уладкаванне французскага манетнага двара, гравюра XV ст.

Вальцавальны варштат для чаканкі манет (XVII ст.)





Талер ВКЛ кароля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста, 1564 г.



Падскарбінскі жэтон Лаўрына Войны з яго асабістым гербам, 1577 г. Выкарыстоўваўся для падліковых аперацый (надпіс на жэтоне: «Пан Лаўрэнцій Война, (верны) слуга Яго Каралеўскай Вялікасці, Вялікага Княства Літоўскага земскі падскарбі, год 1577»)



Самы дробны манетны намінал у ВКЛ – абол, 1547 г.

Аднак існаванне самастойных манетных сістэм Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы патрабавала правядзення збалансаванай грашовай палітыкі. У 1578 г. Варшаўскі сейм Рэчы Паспалітай заявіў: «Вельмі неабходна біць манету як у Літве, так і ў Польшчы; што ж тычыцца іншаземных манет, то адныя варта зняць, а іншыя пераацаніць». Кракаўскі сойм Рэчы Паспалітай у 1579–1580 гг. абвясціў аб уніфікацыі літоўскай і польскай манетных сістэм, усталяваўшы адзіныя якасныя і метралагічныя нормы для іх эмісій.

Асноўныя звёны манетнай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай матэрыяльна ўвасаблялі: абол, дэнарый, двайны дэнарый, паўгрош, грош і вытворныя ад яго наміналы (двайны, трайны, пачацвераны і пашасцераны грош), талер і дукат. Характэрна, што ўсе яны (акрамя абола) выступалі ў дваякай ролі: як рэальныя манеты і як лічыльна-грашовыя паняцці. У рынкавым ужытку захоўваліся і лічыльна-грашовыя адзінкі папярэдняга перыяду – капа і паўкапа, рубель і паўрубель – «полтина». У пераважнай большасці выпадкаў яны выкарыстоўваліся для падліку літоўскіх манет або пражскіх грошаў, зрэдку – польскіх манет. Шырокае распаўсюджванне атрымала новая падліковая адзінка – залаты (злоты). Пераважна пры штрафных санкцыях выкарыстоўваліся вярдунок і грыўня.

У практыцы фінансавых аперацый паўсюдна выкарыстоўваліся «лічбы» — сістэмы пераразліку больш-менш буйных сум, прадстаўленых рознымі наміналамі на аднастайнай аснове — рынкавыя курсы літоўскага, польскага або пражскага грошаў. Станаўленне «лічбаў» — своеасаблівых крос-курсаў — не было спантаннай падзеяй, але адсочвалася і карэкціравалася з цягам часу спецыяльнымі пастановамі.

Гродна. Гравюра, 1568 г.



ФІНАНСАВЫЯ ІНСТЫТУЦЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

НАЙБОЛЬШ ВАЖНАЙ ФІНАНСАВАЙ УСТАНОВАЙ ЭКАНОМІКІ ВКЛ У XV–XVIII СТСТ. з'яўляўся дзяржаўны земскі скарб (казна). У сённяшнім разуменні гэта — міністэрства эканомікі і фінансаў, важнай функцыяй якога было фарміраванне «бюджэту краіны». У канцы XV ст. са структуры гэтай установы была вылучана спецыяльная служба, якая займалася выключна фінансавымі пытаннямі вялікакняскага дамену — надворны скарб. Такім чынам, пытаннямі збору грашовых сродкаў на абслугоўванне функцыянавання дзяржаўных устаноў, арганізацыю палітычнага жыцця краіны, а таксама забеспячэннем асабіста кіраўніка дзяржавы і яго акружэння загадвалі з канца XV ст. два фінансавых органы: агульнадзяржаўны — земскі скарб і вялікакняскі — надворны скарб.



Дэнарый Вялікага Княства Літоўскага, 1556 г.

Штат супрацоўнікаў скарбу не быў вялікі. Установу ўзначальваў падскарбі, якога прызначаў кіраўнік дзяржавы. Сфера абавязкаў падскарбіяў рэгулявалася заканадаўча. У пачатку XVII ст. яны павінны былі дзейнічаць у рамках законаў 1607 г. «Аб пасадзе падскарбія», «Аб скарбавым працэсе». Дзяржаўныя чыноўнікі — падскарбіі — карысталіся паслугамі падначаленых, сярод якіх вядучую ролю іралі іх намеснікі — скарбнікі. Акрамя іх у скарбе працавалі тры пісары, два з якіх сачылі за прыбыткамі, а адзін загадваў расходнай часткай дзейнасці скарбу.

Для кантролю супрацоўнікаў прадугледжвалася спецыяльная працэдура прысягі, падчас якой трэба было паклясціся ў бескарыслівым стаўленні да працы. Так, у законе 1634 г. утрымліваліся наступныя словы прысягі скарбавага пісара: «… ніякіх падарункаў, карупцыі, браць, стварацъ штучныя цяжкасці і гандляваць грашыма не буду». Зборам грошай у ваяводствах і паветах ВКЛ займаліся зборшчыкі — паборцы, якія таксама прысягалі на вернасць манарху.

Для вырашэння спрэчных фінансавых пытанняў у Вялікім Княстве Літоўскім у 1591 г. быў заснаваны Скарбовы Трыбунал ВКЛ, г.зн. вышэйшы фінансавы суд. Першапачаткова ён быў закліканы прымаць разлікі розных служачых. Скарбовы Трыбунал ВКЛ меў магчымасць выкарыстоўваць самыя суровыя санкцыі: ад грашовых штрафаў да канфіскацыі маёмасці. Функцыянаванне фінансавага суда было цесна звязана з дзейнасцю парламента Рэчы Паспалітай, які прымаў рашэнне аб яго скліканні.

Дзейнасць скарбу мела сесійны характар і залежала ад справаздачных перыядаў. Як правіла, скарбнікі былі абавязаныя асабіста прыязджаць на пасяджэнні парламента Рэчы Паспалітай і выступаць з дакладам аб прыбытках і выдатках скарбу за справаздачны перыяд.

Асноўным інструментам фарміравання дзяржаўных рэсурсаў Вялікага Княства Літоўскага з'яўляліся падаткі. Падаткавы цяжар у той час усталёўваўся не адвольна, а з улікам меркавання шляхецкага грамадства. Напрыклад, адной з найважнейшых кампетэнцый парламента Рэчы Паспалітай было ўвядзенне закона аб падатках. У ВКЛ у канцы XV–XVI стст. галоўнымі крыніцамі паступленняў былі прыбыткі ад дзейнасці манетнага двара, мытныя і карчомныя зборы, тэрытарыяльныя зборы і інш.

У канцы XVI—XVIII стст., ужо знаходзячыся ў скла-дзе Рэчы Паспалітай, у ВКЛ спаганяліся падаткі: пазямельны (ланавы); падатак на вытворчасць і продаж алкаголю (чопавы); яўрэйскі падушны падатак; татарскі падушны падатак; падатак на купцоў; падатак на трымальнікаў дзяржаўных зямельных фондаў. Акрамя гэтага прыбытковай часткай лічыліся мытныя зборы, т.зв. мыта.



Nro.

Roka 1793 Miesiąca Wrz 30 Dnia z Parafii
Paplanskiey z Maietności Burmiew Podatku Podymnego
Siesiemnastk. Stkz dwa Stkiz 2 Kopowego złkk
Zygmunt Ld dwa Stkiz 2 Dorosłymi Władysław
Stkiz 2 Angiela Palenkowa złkz dwa Stkiz 2
w Ogule Zł: Pol: Raty Złotowych do
Kassy Powiatu Grodzień: cum solario opłacono

Скарбовы квіток аб уплаце Тадэвушам Сезянеўскім і Ангелай Паценковай у скарб ВКЛ падымнага падатку, 9 сакавіка 1785 г.



Roku 17 85 Miesiąca marca Dnia Dnieszego
z Parafij Zyzymontowskiey Kholiny
Burmiewa JJP. Paden Sieniewskii,
y Angiela Paczenkowa Dymow 2 Podymnego
Zapłacił do Skarbu Rzpltey W. X. L. za Ratę teraznieyszą
groszow Złotych Cztery y solarium —
Z odebrania kwitując podpisuję się; Datt w Grodnie
ut supra

Квіток аб уплаце Тадэвушам Сезянеўскім, Янам Эйсімонтам, Лаўрынам Эйсімонтам і Ангелай Паценковай у Гродзенскую павятовую касу падымнага і чопавага падаткаў, ВКЛ, 30 верасня 1793 г.



Герб роду Сапегаў



Леў Сапега

Інтэнсіўнасць падаткаабкладання шмат у чым абумоўлівалася рытмамі палітычнага жыцця краіны. Асабліва вялікія былі паступленні ў скарб падчас ваенных дзеянняў. Адной з галоўных праблем эканомікі таго часу была адсутнасць надзейнай сістэмы забеспячэння дзяржавы грашовымі сродкамі. Падаткі, якія збіраліся, не заўсёды пакрывалі дэфіцыт сродкаў.

Для аплаты дэфіцыту сітуатыўна ўводзіліся надзвычайныя зборы, у шэрагу выпадкаў манарх нават пазычаў немалыя сумы. Гэта ўказвала на тое, што неабходна было сістэмна вырашыць праблему папаўнення бюджэту — разумна пераразмеркаваць фінансы ў грамадстве. Іншымі словамі, наспела перадумова фарміравання банка, як адмысловага фінансавага інстытута, які вырашае задачу мабілізацыі і эфектыўнага выкарыстання свабодных сродкаў не фіскальнымі, а эканамічнымі метадамі.

У традыцыйным грамадстве, якім яно было на беларускіх землях у XV–XVIII стст., галоўнай сферай эканомікі з'яўлялася сельская гаспадарка. Менавіта яна давала асноўную частку прыбыткаў як дзяржаве, так і землеўладальнікам — магнатам і шляхце.

Аб'ёмы грашовых сродкаў, якія збіраліся з магнацкіх гаспадарак, дасягалі значных памераў. Напрыклад, у сярэдзіне XVII ст. самы вялікі ў Вялікім Княстве Літоўскім гадавы прыбытак меў сын знакамітага Льва Іванавіча Сапегі — Казімір Лявон, чый сумарны даход дасягаў «500 000 залатых рэнты», што было супастаўна з прыбыткамі манарха ў Рэчы Паспалітай. Неверагодныя для таго часу фінансавыя магчымасці прадвызначалі аб'ём палітычнай вагі магната. Нядзіўна, што і пасада падскарбія ВКЛ у канцы XVII — пачатку XVIII ст. знаходзілася ў руках прадстаўнікоў роду Сапегаў, сярод якіх вылучаецца Бенядзікт Павел.



Партрэт Бенядзікта Паўла Сапегі з сімвалам пасады падскарбія ВКЛ – ключом, копія XVIII ст.

Сапега Бенядзікт Павел (1643–1707), адзін з вядомых падскарбіяў земскіх ВКЛ. Паходзіў са шляхецкага роду Сапегаў гербу «Ліс», сын Паўла Яна, ваяводы віленскага і Ганны Барбары з Копцяў. У 1657 г. наведваў калегіум езуітаў у Грацы, ў 1661 г. — універсітэт у Лёвене. Пачатку яго службовай кар'еры паспрыяў уплыў бацькі: у 1661 г. ён атрымаў пасаду падстолія, а ў 1665 г. — стольніка ВКЛ. Пазней пачаў самастойную грамадскую дзейнасць, спрабуючы знайсці саюз з Радзівіламі і супрацьстаяць гегемоніі роду Пацаў. Палітычную інтуіцыю Сапегі ілюструе яго дакладныя ацэнкі пры выбарах каралёў Рэчы Паспалітай: у 1669 г. ён паспяхова падтрымаў Міхаіла Вішнявецкага (пасля абрання той надаў яму ў 1670 г. пасаду крайчага ВКЛ, а неўзабаве надворнага падскарбія), у 1674 г. — Яна III Сабескага (пры ім Сапега ў 1676 г. выкупіў пасаду земскага падскарбія, пад заступніцтвам караля значна ўзмацніў пазіцыі), у 1705 г. — Станіслава Ляшчынскага (пры ім Сапега быў канцлерам, маршалкам і галоўным дарадцам).

Да 1667 г. вайна Рэчы Паспалітай з Маскоўскім царствам скончылася, і бакі былі гатовыя падпісаць мірнае пагадненне. Аднак шляхта Вялікага Княства Літоўскага была незадаволеная стратай на ўсходзе значных зямельных уладанняў. У якасці кампрамісу ўзнікла ідэя аб выплаце царом грашовай кампенсацыі. Пытанне абмяркоўвалася на сойме 1667 г., і кароль прызначыў Бенядзікта Паўла Сапегу камісарам для атрымання ад цара названай сумы. У 1671 г. на пасяджэнні Скарбовай Камісіі ВКЛ у Вільні абмяркоўвалася пытанне аб выплаце скарбам Рэчы Паспалітай пазыкі спадчыннікам ваяводы віленскага Паўла Яна Сапегі. Бенядзікт Павел з роднымі братамі адмовіліся ад часткі сумы (400 000 польскіх злотых), што зусім не паменшыла іх багацця. У 1696 г., на думку замежных дыпламатаў, Бенядзікт Павел Сапега з'яўляўся некаранаваным манархам ВКЛ.

Публічны грашовы фонд Вялікага Княства Літоўскага у канцы XVII – пачатку XVIII стст., які павінен быў выкарыстоўвацца на абслугоўванне бягучых патрэб дзяржавы, імкліва скарачаўся. Пры гэтым прыбыткі магнатаў – Сапегаў, Радзівілаў, Пацаў і інш. – раслі. За выдаткамі дзяржаўнага скарбу пастаянна сачыла шляхта ВКЛ. З'яўляючыся падаткаплацельшчыкам, яна патрабавала на соймах і соймiках строгай справаздачнасці па фінансавых пытаннях. Аднак на практыцы дамагчыся гэтага было нялёгка.



Палацавы комплекс Сапегаў у Ружанах

Экстрэмальнай формай захавання грашовых сродкаў з'яўляліся скарбы, якіх нямала выяўлена для XVI—XVIII стст. Пры гэтым значная частка рэсурсаў выводзілася з абарачэння, што з'явілася адным з фактараў тыповага для таго часу крызісу наяўнасці. З'ява была настолькі значнай, што ў заканадаўстве ВКЛ з'явіліся адпаведныя артыкулы. У дзявятым раздзеле III Статута ВКЛ 1588 г. ёсць Артыкул 30 «О найденью скарбу захованого в земли або в яком поклаженью», які абвяшчае:

«Уставуем: коли бы се трафило кому знайти в земли який скарб: гроши, серебро, золото або што иншое яко се притрафляеть находити, тогды если на своем грунте найдеть, маеть скарб быти, чий грунт, а если бы на чыем иншом знашол, тогды половицу маеть тому дати, на чией земли знашол, а половицу собе взяти. Так теж и на заставной земли наполы розделити мають. Ведь же хто бы ся ку такому найденью кладу не знати хотел, а тот, хто бы того искал, бралсе до присеги, тогды тая противная сторона, на ком ищуть, ближшая будеть от того отприсягнутися, же не нашол».



Машна,
Гродна, Стары замак, XVI ст.;
скураная каліта,
Гродна, XVII–XVIII стст.



Скарб манет Рэчы Паспалітай першай паловы XVIII ст., Столін

ЗАХАВАННЕ І АШЧАДЖАННЕ ГРОШАЙ

ФІНАНСАВАЯ СІТУАЦЫЯ Ў ВКЛ У ЗНАЧНАЙ СТУПЕНІ АБУМОЎЛІВАЛАСЯ ЭКАНАМІЧНЫМ ростам і стабільнасцю нацыянальнай валюты. Уласны манетны двор ВКЛ спрыяў стварэнню досыць надзейнага грашовага рынку. Свая валюта — дэнарый — мела большы давер, чым замежная, у тым ліку польская, што аказвала станоўчы ўплыў на грашовае абарачэнне ў цэлым.



Шкатула для захавання грошай.
Медзь, Гродна, XVIII ст.

Захаванне грошай і каштоўнасцей у першую чаргу забяспечвалася самімі ўладальнікамі. У найбольш выгадным становішчы знаходзіліся магнаты, чые фінансавыя сродкі ахоўваліся сценамі замкаў і палацаў. Іншая сітуацыя была ў простых людзей. Матэрыяльны побыт у XV–XVIII стст. не прадугледжваў шырокага выбару варыянтаў. Распаўсюджаным спосабам адносна надзейнага захавання грошай было захоўванне іх у гліняным посудзе. Манеты і іншыя каштоўныя рэчы загортвалі ў тканіну і захоўвалі ў зацішным месцы ў хаце ці па-за ёй. Тыповым было захаванне гатоўкі і іншых каштоўнасцей у спецыяльных скарбонках — «шкатулах». Як правіла, для абароны ад выпадковых людзей яны забяспечваліся адмысловымі замкамі.

Беларусы ў XVI–XVIII стст. насілі і захоўвалі свае зберажэнні па-рознаму: у спецыяльных кашальках — машнах (з барановай або цялячай машонкі) і калітах (рабілі са скуры, насілі на пасе), мяшэчках (ворках) або торбах (выраблялі з тканіны і насілі ў зручным для ўладальніка месцы), чарэсах (шырокіх скураных пасах), хустках, ручніках, панчохах і г.д.



Ініцыял « J » з прывілея кароля польскага і вялікага князя літоўскага Яна III Сабескага для Гродзенскага аб'яднанага цэха мулярoў, цесляроў, ганчароў і бондараў ад 20 студзеня 1679 г.

Акрамя індывідуальных намаганняў па захоўванні грашовых сродкаў прадпрымаліся таксама намаганні калектыўныя. Своеасаблівым тыпам мэтавага ўкладу, у сучасным разуменні, былі статутныя зборы грашовых сродкаў рэлігійнымі і прафесійнымі саюзамі – брацтвамі. На тэрыторыі Беларусі такія саюзы вядуць адлік ад першай згадкі ў крыніцах Полацкай братчыны сярэдзіны XII ст. Царкоўныя «мядовыя» братчыны ў перыяд XII–XV стст. набывалі вопыт грамадскай арганізацыі і справаводства. Да сярэдзіны XV ст. з'явіліся рамесныя брацтвы, якія праз стагоддзе рэарганізаваліся ў больш рэгламентаваныя і аднастайныя саюзы – рамесныя цэхі. З канца XVI ст. царкоўныя братчыны таксама пераўтварыліся ў брацтвы, дзейнасць якіх стала больш рэгламентаванай як у рэлігійнай, так і арганізацыйнай галінах.

Паводле даследаванняў А. Цітова, першай афіцыйнай датай стварэння цэхавых арганізацый у Мінску варта лічыць 16 ліпеня 1569 г. Аднак, самы ранні з тых, што захаваліся, Статут цэха металістаў (кавалёў, катляроў, слесараў, рымараў, пушкароў, мечнікаў, нажаўшчыкоў і залатароў) датуецца 2 снежня 1591 г. Менавіта ён разам са Статутам цэха мінскіх краўцоў (ткачоў) быў зацверджаны 20 лістапада 1592 г. польскім каралём і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам III Вазам у якасці асноватворных дакументаў, па якіх павінны былі жыць і працаваць рамеснікі названых спецыяльнасцей.

Сярод пералічаных у дакументах прывілеяў, нормаў і абавязкаў асаблівая ўвага звярталася на неабходнасць мець цэхавыя касы – «скарбонкі». У іх захоўваліся важныя цэхавыя дакументы (прывілеі, Статут, рэестры, лісты, аблігацыі) і грошы. Касы папаўняліся за кошт унёскаў ахвяраванняў і штрафаў. Акрамя гэтага яны выконвалі пэўную рытуальную функцыю – унясенне і адкрыццё «скарбонкі» азначала пачатак сходу ўдзельнікаў цэха («братоў»), а яе закрыццё і вынас – заканчэнне «сходкі». Загадвалі «скарбонкай» абраныя на сходзе шафары (скарбнікі). Зачынялася яна на два ключы, якія захоўваліся ў двух розных людзей. «Скарбонка» не магла быць вынесена за межы горада. Грошы з касы выдаткоўваліся на патрэбы «братоў»-цэхавікоў і членаў іх сем'яў. Напрыклад, з агульнай касы аплачвалася праца пісара. Аднак асноўныя сумы размяркоўваліся на ўтрыманне цэхавых «брацкіх» алтароў у цэрквах і касцёлах Мінска, на лячэнне «братоў» цэха, на матэрыяльнае забеспячэнне пажылых рамеснікаў, удоў і сірот, пахаванне, на агульныя выдаткі па рамонце цэхавых памяшканняў, вырабу цэхавай харугвы і пячаткі і г.д. Трэба адзначыць, што падобныя правілы функцыянавання цэхавых кас былі абавязковымі і ў іншых беларускіх гарадах, якія мелі Магдэбургскае права.

Такім чынам, цэхавыя «скарбонкі» па сваіх функцыях выконвалі ролю ашчадных кас узаемадапамогі, сродкі з якіх ішлі на розныя сацыяльныя і рэлігійныя патрэбы галоўным чынам рамеснікаў і членаў іх сем'яў. Таму 1592 г. можна прыняць этапным у арганізацыі ашчаднай справы на тэрыторыі Беларусі. Падкрэслім, што брацтвы былі досыць лакалізаваныя ў тэрытарыяльным, сацыяльным, функцыянальным планах. У грамадстве выспявала ідэя стварэння больш мабільнага, пабудаванага на ўніверсальных прынцыпах інстытута па грамадскай захаванасці фінансавых назапашванняў.

У сацыяльнай характарыстыцы брацтваў і цэхаў XV–XVIII стст. важныя такія ўласцівасці, як самаарганізацыя і самакіраванне. Рэлігійныя брацтвы меліся амаль пры кожным храме. Зацвярджэнне Магдэбургскага права ў рэгіёне спрыяла шырокаму распаўсюджванню і развіццю ў гарадах і мястэчках рамесных і гандлёвых брацтваў і цэхаў. Гэтыя саюзы акумулявалі грашовыя сродкі сваіх членаў у брацкай скарбніцы. Тыя сродкі мэтавым чынам накіроўваліся на рэалізацыю мерапрыемстваў, намечаных калектывам братчыкаў, у адпаведнасці з іх Статутам. Збор і захаванне брацкіх сродкаў рэгламентаваліся Статутам і выконваліся спецыяльна абранымі для гэтай мэты братчыкамі, дзейнасць якіх падлягала рэвізіі.



Пасяджэнне цэха. Гравюра XVII ст.

КРЭДЫТНЫЯ АДНОСІНЫ

У XIII–XVI СТСТ. КРЭДЫТНЫЯ АДНОСІНЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ЗВЕДАЛІ ПЭЎНУЮ эвалюцыю і станавіліся неад'емнай часткай эканомікі ВКЛ.

Развіццё гандлёва-эканамічных сувязей Вялікага Княства Літоўскага з суседнімі дзяржавамі спрыяла зацвярджэнню міжнароднага крэдыта. Іх раскрываюць яшчэ гандлёвыя дамовы Полацка і Віцебска з Рыгай у XII–XIV стст. У іх, акрамя сустрэчных паставак тавараў, меркавалася і ўзаемнае крэдытаванне купцоў.

Ліхвяр



Важнае месца займала самая простая форма крэдыта — ліхвярства. Ліхвярскі капітал быў распаўсюджанай з'явай у беларускіх гарадах і вёсках. Ён выступаў у асноўным у дзвюх характэрных формах: у выглядзе пазык дробным вытворцам (рамеснікам, сялянам, гараджанам), а таксама ў форме прадастаўлення грашовых крэдытаў шляхце. У Беларусі з XIV ст. працэнт за грашовую пазыку або аддадзеную ў заклад рэч называўся «ліхва» (адсюль тэрміны «ліхвяры», «ліхвярства» і абарот «атрымаць з ліхвой»), у XVI ст. да іх дадаліся вызначэнні «навезка» і «гасцінец».

Ліхвярскія аперацыі ў значнай ступені кантраляваліся мясцовым яўрэйскім насельніцтвам, якое ў выніку забароны на валоданне зямлёй займалася рамяством і гандлем, што паслужыла важнай крыніцай першапачатковага назапашвання капіталу. Ва ўмовах хранічнага дэфіцыту наяўнасці многія былі залежнымі ад фінансавых рэсурсаў яўрэйскага насельніцтва — шляхта, часам каталіцкая царква, самыя ўплывовыя асобы. Яркае пра тое сведчанне — гісторыя з выгнаннем яўрэяў з тэрыторыі ВКЛ у 1495 г. Праз восем гадоў пасля гэтага рашэння, менавіта з-за праблем з напаўненнем скарбу, вялікі князь дазволіў ім вярнуцца. Яўрэі не толькі давалі грошы ў пазыку, але таксама займаліся арэндай маёмасці, розных збораў, у тым ліку мытных.



Сямейны партрэт Мікалая Крыштафа Халецкага, мечніка ВКЛ і яго жонкі Марыі Леаноры дэ Стыбіч, 1695 г.

Памеры гэтых грашовых абменаў былі сапраўды значныя. Так, у 1639 г. мечнік ВКЛ Мікалай Крыштаф Халецкі і яго жонка Марыя Леанора атрымалі 12 000 злотых ад каралеўскага фактара Лазара Майжэшовіча пад заклад маёмасці на 30 гадоў. Фактычна ўсё жыццё мужа і жонкі прайшло ў пазыку. Аб памерах капіталу, які прадастаўляецца ў пазыку, можна меркаваць па пакупніцкай здольнасці тагачасных грошай. Капа ўяўляла сабой лічыльна-грашовую адзінку Беларусі, каштавала 60 грошаў або 2 злотых. У канцы XVI ст. за 2 капы (120 грошаў ці 4 злотых) можна было купіць каня альбо вала, за 100 грошаў — карову, за 20 — барана. Кажух з аўчыны ацэньваўся ў 1 капу, сякера — у 6 грошаў.

Стаўленне да грошай жыхароў Вялікага Княства Літоўскага шмат у чым абумоўлівалася афіцыйным прызнаннем з боку царквы грахоўнасці ліхвярства. Але ўжо ў канцы XVI ст. нават езуіты прызнавалі фармальнасць такога пункту гледжання. Яскравым прыкладам адносін да грошай можа служыць праца прафесара Віленскай акадэміі Марціна Сміглецкага «Аб ліхвярстве», выдадзеная ў 1596 г. у Вільні.



O LICHWIE
Y
Trzech przednieyszych
KONTRAKCIECH:
Wyderkowym/
Czynszowym/ y
Towárzystwá Kupieckiego/
NAVKA KROTKA.

PISANA
Przez X. D. Marćiná Smigleckiego
Societatis IESV, Theologiey Pro-
fessorá/ w Akádemiey Wileńskiey.

y powtore wydána.

W WILNIE
W Drukárniey Akádemiey Wileńskiey Societ. IESV, CHRI-
STOPHORVS PATRO Roku Páńskiego, 1596.
Permissu Superiorum.

Тытульны ліст працы М. Сміглецкага «Аб ліхвярстве», Вільня, 1596 г.



THESES
ETHICO-POLITICÆ
DE
Societate Humana tam domestica quàm Civili.
Nec non
De Cretica atq; Chrysica ideſt quæſtuaria ac Vſu Rei familiaris
ad Domeſticæ quàm ad Civilis Societatis conſervationem neceſſari
Honori
Illustris ac M. D.
Dńi IOANNIS BIEGANSKI
Mareſchalcidæ & Dapiferi Braſtavienſis, Capitanei Czer
naticenſis, Præfecti Congregationis ſub Titulo Immaculat
Conceptæ VIRGINIS, Dignissimi, atq; Literarum in A
ma Academia Vilnenſi Studioſi, dicatæ ac defenſæ
Ab
Erudito ac Nobili Dńo MICHAELE MOYGIS A.A L.L.&
Philoſophiæ Magiſtro, Sacræ Theologiæ Ethiceſq; Auditore
Congregationis Maximæ Præſide
Aſſiſtente ſibi,
R. P. ZACHARIA MODZELEWSKI S. I. A. A. L.L. & Philoſophi
Magiſtro, Ordinario in dicta Vniverſitate Politices Profeſſore, ibidem
Scholarum Præfecto.
Anno DEI Naturæ Humanæ Sociati 1690.
Die
Menſe
Vilnæ Typis Academicis

Тытульны ліст працы М. Мойгіса «Тэзісы па этыцы і палітыцы», Вільня, 1690 г.



Zygmunth August z Bozy laski Krol
Litewskie, Ruski, Pruski, Mazowiecski

Oznamuiemy wszem wobec i kazdemu
Stanislaua Fogelwedra Secretarza nasz
Oszmdziesziath i ieden, groszy Oszmdziesziath i szesc, ktore pome
nionego Stanislaua Fogelwedra Secretarza naszego tym naszym li
Stem quittuiemy, i volnim czinimy A vn te summe wyszey opisana
ma nam vkazowie swoiey polecz, ktora my iemu na vkazowie pisa
miemy. Datum Varsouiæ die Sexta Octobris Anno dni M D LXX°
Regni vero nostri Anno XLV°

Sigismundus Augustus Rex

Распіска вэксальнага тыпу караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста свайму сакратару Станіславу Фогельведру аб атрыманні ад яго 934 венгерскіх залатых у пераразліку на польскія злотыя, Варшава, 1560 г.

Езуіцкі вучоны прыйшоў да высновы, што ліхвярства не з'яўляецца ва ўсіх выпадках несправядлівым. На яго думку, цалкам апраўдана, што працэнт ад накіраваных на эканамічныя мерапрыемствы грошай варта перадаць таму, хто з дапамогай грошай можа зарабіць яшчэ больш. Такім чынам, М. Сміглецкі цалкам у духу сучаснай эканамічнай тэорыі вылучаў у якасці найважнейшага вытворчага фактару такі рэсурс як прадпрымальніцкая ініцыятыва. Адсюль зусім недалёка было да прызнання неабходнасці развіцця банкаўскіх структур у Вялікім Княстве Літоўскім. Больш таго, ён выказваў цвярозую думку аб неабходнасці абавязковай узнагароды банку за аказаную паслугу. Працэнт ён называў справядлівай формай узнагароды банкіру. Гэтак жа ён не лічыў несправядлівым тое, што за абмен манет варта плаціць працэнт.

Фінансавая палітыка асэнсоўвалася ў грамадстве ў спалучэнні пазіцый наватарства і кансерватызму.

У трактаце «Аб гандлі» 1611 г. вядомы ў Рэчы Паспалітай навуковец Адам Разіюс неаднаразова падкрэсліваў недахопы грошай: «Няма сапраўднай каштоўнасці ў тым, што не з'яўляецца вызначаным. А грошы ёсць рэччу якая змяняецца і няісцінная... таму што залежаць ад рашэнняў чалавека. А паколькі каштоўнасць грошай можа змяніцца на падставе рашэнняў уладара, тыя грошы, якія сёння могуць шмат, заўтра — забароненыя — не будуць мець ніякай каштоўнасці».

Падобныя погляды былі ўласцівыя многім прадстаўнікам культурнай эліты, у прыватнасці выкладчыкам Віленскай акадэміі на працягу ўсяго XVII ст. Гэтыя развагі сталі асновай для новага разумення ролі грошай у эканоміцы. Так, віленскі вучоны-езуіт Міхаіл Мойгіс у трактаце «Тэзісы па этыцы і палітыцы» (Вільня, 1690 г.) адзначаў, што самі грошы не ствараюць сапраўднага багацця. Такі падыход межаваў наўпрост з іншай эканамічнай тэорыяй, вучэннем фізіякратаў, якія гаварылі, што багацце грамадства стварае не золата, а сельскагаспадарчая праца.

Жыхары ВКЛ XVI ст.





Насуперак адмоўнаму стаўленню царквы, пачынаючы з XVI ст., ліхвярства перажывала росквіт. Да гэтага часу яно было, з прычыны канфесійных табу хрысціянскай рэлігіі, справай выключна яўрэйскага насельніцтва ВКЛ, цяпер жа яно станавілася заняткам і для хрысціян. Першая зафіксаваная ў рэгіёне аперацыя паміж мясцовымі хрысціянамі належыць да 1578 г. У перыяд фарміравання феадалізму ліхвярства, як правіла, не ўяўляла сабой самастойнага віду прадпрымальніцкай дзейнасці. Часцей за ўсё ў якасці крэдыторaў выступалі буйныя феадалы, царква, купецтва, разбагацелыя гараджане. Крэдыт быў дэцэнтралізаваны: пазыкі выдаваліся фізічнымі асобамі, якія мелі свабодны капітал, суб'ектам, што зведалі часовую патрэбу ў грошах.

У XV–XVI стст. зацвярджаецца своеасаблівы дзяржаўны крэдыт, пры якім у якасці пазычальніка выступала вярхоўная ўлада. Становішча Скарбу (вялікакняскай казны) часта было напружаным. Дэфіцыт дзяржаўнага «бюджэту» асабліва павялічваўся ў перыяды войнаў. Паколькі прыбыткі ад гаспадарскіх валасцей не пакрывалі бягучых выдаткаў, вялікі князь вымушаны быў звяртацца да прыватных крэдыторaў — феадалаў, гарадскіх вярхоў.

Распаўсюджванне пазыкі афармлялася «застаўным» (закладным) лістом. У якасці закладу выступала зямля гаспадарскіх дворaў. У сярэдзіне XV — пачатку XVI стст. іх раздача ў «заставу» набыла масавы характар. У XVI ст. заклад нерухомай маёмасці таксама ажыццяўляўся ў выглядзе іпатэкі, г.зн. закладу ў форме запісу даўгоў па маёнтку ў судовых кнігах без яго перадачы крэдытору. Да разнавіднасці іпатэчнага крэдыту блізкі так званы відэркаўф (ад ням. wiederkauf — выкуп), пры якім пазычальнік перадаваў крэдытору маёмасць, што служыла забеспячэннем крэдыту, але захоўваў за сабой права яго выкупу ва ўстаноўлены тэрмін.

Шляхта ВКЛ XVI–XVII ст.



Напрыклад, Слуцкае брацтва ў 1682 г. тэрмінам на тры гады завалодала княжацкім маёнткам Браслаўцы з умовай, што ўладальнік будзе ім кіраваць, прадаставіўшы пазыку ў 10 тысяч злотых пад 8% гадавых. У выпадку невяртання крэдыту брацтва магло без звароту ў суд, у прысутнасці толькі судовага выканаўцы і прадстаўнікоў шляхты, заняць маёнтак і валодаць ім да поўнага вяртання пазыкі.

З умацненнем феадальных адносін ліхвярства паступова прыняло прафесійны характар. Для некаторых купцоў крэдытныя аперацыі сталі другой прафесіяй нароўні з асноўным заняткам — гандлем. Гэта выклікала з'яўленне своеасаблівых банкірска-гандлёвых дамоў. Адным з такіх дамоў у ВКЛ, якія маюць у тым ліку і крэдытныя функцыі, быў дом купцоў Мамонічаў. Ліхвярства было крыніцай павелічэння капіталу, пашырэння маштабаў гандлю, пасрэдніцкіх аперацый.



Герб роду Мамонічаў

Мамонічы Кузьма (? — 1607) і Лукаш (? — 1606) — прадстаўнікі вядомага ў ВКЛ беларускага купецкага роду. Паходжанне роду звязваюць з Магілёўшчынай, яго заснавальнікам лічыцца купец Іван Мамоніч, які ў сярэдзіне XVI ст. з'яўляўся членам гарадской рады ў Вільні і атрымаў за свае заслугі набілітацыю (дваранства) з правам карыстацца гербам «Ліс». Яго сыны Лукаш і Кузьма сталі заснавальнікамі знакамітай «друкарні Мамонічаў» у Вільні (з 1574 г.). Друкаваннем кніг і іх продажам займаўся галоўным чынам Кузьма Мамоніч, вельмі ініцыятыўны прадпрымальнік. Ягоныя кнігі карысталіся вялікім попытам не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы, Расіі і Украіне. Кузьма на працягу некалькіх гадоў быў віленскім бургамістрам. Брат Кузьмы Лукаш вёў больш шляхецкі лад жыцця, быў дзісненскім старастам, у канцы 1586 г. атрымаў пасаду скарбніка ВКЛ. У кампетэнцыю скарбніка ўваходзіў нагляд за скарбам ВКЛ, а ў рэальнасці ён з'яўляўся намеснікам падскарбія земскага ў Вільні. Гэта была досыць важная пасада, Лукаш Мамоніч займаў яе пры пяці падскарбіях земскіх запар, што падкрэслівае давер да яго асабіста і да роду Мамонічаў у цэлым.

Пра пашырэнне ліхвярскага крэдыту сведчаць магістрацкія кнігі беларускіх гарадоў. Не грэбавала ліхвярствам і шляхта.

Зварот шляхты да пазыкі сведчыць у першую чаргу пра недахоп наяўных грошай, што было тыповым для магнацкай гаспадаркі XVI–XVII стст. Нават прадстаўнікам роду Радзівілаў пад заклад грошай даводзілася аддаваць не толькі землі, але і радавыя каштоўнасці. Аб'ёмы запазычанасцей магнатаў часам маглі дасягаць памераў іх сярэдняга гадавога даходу.



Малюнак з Рэвізіі Брэсцкай і Кобрынскай каралеўскіх эканомій за 1742 г.

> Каралеўскія сталовыя маёнткі знаходзіліся ў розных кутках Вялікага Княства Літоўскага. Прыбытак ад іх ішоў на ўтрыманне каралеўскіх асоб і іншыя дзяржаўныя патрэбы. <

ПРОТАБАНКАЎСКІЯ ЭЛЕМЕНТЫ

НЕДАХОП РАЗВІЦЦЯ ФІНАНСАВЫХ УСТАНОЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XV–XVIII СТСТ.



Куцеінскі манастыр, Віцебская вобл.

кампенсаваўся мясцовымі арганізацыйнымі рашэннямі. У іх ліку рэлігійныя і прафесійныя аб'яднанні — брацтвы і цэхі, грошы якіх нярэдка скарыстоўваліся для выканання «банкаўскіх» функцый. Так, напрыклад, Слуцкае царкоўнае брацтва Св. Спаса пазычала грошы гараджанам пад 16% гадавых. Плата за карыстанне пазыкай, як правіла, вагалася ад 8 да 30%, у залежнасці ад тэрміну, на які прадастаўлялася пазыка, яе характару, ступені забяспечанасці, надзейнасці самога пазычальніка.

У 1655 г. слуцкі ўладальнік Багуслаў Радзівіл, у адпаведнасці са звычайнай практыкай таго часу, загадаў, каб гараджане бралі адзін у аднаго не больш за 10 злотых на 100 злотых, атрыманых у пазыку, гэта значыць 10%.

Існуе нямала прыкладаў і беспрацэнтных пазык, заснаваных на ўзаемным даверы суб'ектаў крэдытнай здзелкі.

У названых прэцэдэнтах можна назіраць вытокі фарміравання своеасаблівых нормаў фінансавай этыкі. Аднак, на льготных умовах крэдыты, як правіла, даваліся ў невялікіх сумах і на непрацяглы перыяд.

Дзейнасць праваслаўных, каталіцкіх і ўніяцкіх манастыроў таксама ўключала падобныя «банкаўскія» аперацыі. Манастырскія гаспадаркі адкрыта канкурыравалі з яўрэйскімі «капіталістамі» ў пытаннях крэдытавання. Маштабамі «банкаўскай» актыўнасці адрозніваўся Куцеінскі праваслаўны брацкі манастыр. Умовы крэдытавання павінны былі выконвацца ў любых абставінах, нават неардынарных.



Вэксаль Сергея Андрэевіча Сезяневіча для Сцяпана Цітавіча Сезяневіча на 1 капу літоўскіх грошаў. ВКЛ, 1617 г.

Важнае месца займаў гандлёвы крэдыт (правобраз сучаснага факторынгу). Ён даваўся ў выглядзе адтэрміноўкі плацяжу за перададзены для рэалізацыі тавар (часта — паміж купцамі і рамеснікамі). З канца XVI ст. ён рэгуляваўся пісьмовым даўгавым абавязацельствам, названым «аблікг» або «цэраграф». Фактычна, гэта папярэднік вэксаля — дакумент, складзены з захаваннем вызначаных патрабаванняў, які ўвасабляе грашовае абавязацельства. У XVII ст. іх выкарыстанне стала штодзённым, яны набылі рысы сучаснага вэксаля, у тым ліку ўласцівасць абарочваемасці. «Аблікгамі» або «цэраграфамі», узятымі ў адной асобы, можна было разлічвацца з кімсьці іншым.

У канцы XVI–XVII стст. аб'ектам крэдытных пагадненняў станавіліся не толькі грашовыя сродкі і матэрыяльныя каштоўнасці, але і сродкі вытворчасці, у першую чаргу — прылады працы. Суб'ектамі падобных адносін з'яўляліся асобы, якія здаюць у часовае карыстанне за плату нейкія прылады працы, і асобы, якія бяруць іх у арэнду. Так афармілася вядомая ў нашы дні форма крэдыту — лізінг.

Да сярэдзіны XVII ст. распаўсюдзіліся новыя абавязацельствы вэксальнага тыпу — «манета кантрактавая», супрацьпастаўленая рэальнай манеце. Гэты аспект адзначаўся ў крэдытных пагадненнях, фінансавых дакументах, калі крэдытор жадаў атрымаць рэальную, паўнавартасную манету, а не пазыковае абавязацельства або тавары ў пагашэнне пазыкі.

«Аблікг», «цэраграф», «манета кантрактавая», якія прадстаўлялі грашовыя даўгавыя абавязацельствы, станавіліся сродкам абарачэння і сродкам плацяжу разам з металічнай манетай і фактычна з'яўляюцца папярэднікамі крэдытных папяровых грошаў на беларускіх землях.

Пашырылася такая форма пагашэння атрыманай пазыкі, як выкананне работ на працягу вызначанага крэдытным пагадненнем часу. Пазычальнік мог адпрацаваць не саму пазыку, а толькі працэнты па ёй.

Да канца XVII ст. у ВКЛ быў шырока распаўсюджаны інстытут *закупніцтва* — заклад асобы да адпрацоўкі або пагашэння пазыкі. Калі памер адпрацовак у крэдытным пагадненні не агаворваўся, то ён вызначаўся законам.



ПРАВАВАЯ БАЗА КРЭДЫТНЫХ АДНОСІН

УЗАЕМААДНОСІНЫ СУБ'ЕКТАЎ КРЭДЫТУ Ў ВКЛ ДЭТАЛЁВА РЭГЛАМЕНТАВАЛІСЯ Статутамі — зводамі законаў дзяржавы, прынятымі ў 1529, 1566 і 1588 гг. Яны ўключалі прававыя нормы, рэгулявалі пазыку, арэнду, заклад, даручальніцтва, дзе вызначаліся працэдура заключэння пазыковай здзелкі, парадак пагашэння крэдыту, адказнасць пазычальніка.

Дагаворы пазыкі, як і іншыя пагадненні (куплі-продажу, спадчыны), складаліся паводле пэўнай формы і патрабавалі наяўнасці абавязковых рэквізітаў (подпісаў, пячаткі). Найбольш важныя з актаў заносіліся ў судовыя кнігі.

А падробку афіцыйнай фінансавай дакументацыі — «запісаў», «лічбаў на пазыкі», «пазыковых лістоў» — закон патрабаваў самай суровай меры:

«Коли бы хто листы або печати наши фальшовал… ничим иным, только на горле огнем каран быти маеть…»

Значнае месца адводзілася матэрыяльнаму забеспячэнню крэдытавання, дзе ў якасці закладу вызначалася як нерухомасць («имене лежачое»), так і рухомая маёмасць («имене рухомое»). Найважнейшым відам крэдытнага забеспячэння, паводле Статутаў ВКЛ, з'яўляўся заклад нерухомай маёмасці — «застава», да якога тады ў першую чаргу належалі маёнткі, а таксама землі.

У Статутах ВКЛ з 1566 г. меўся раздзел «Аб запісах і продажах», дзе падрабязна вызначаны парадак і формы складання пагадненняў аб нерухомай маёмасці, дамоў, пазыкі, закладу, называюцца тэрміны іскавай даўнасці па шэрагу крэдытных здзелак.

Нормы грамадзянскага права немалое месца адводзілі закладу (від закладу рухомай маёмасці за атрыманую пазыку): парадак афармлення закладу, яго выкупу, абарачэння, пагашэння (у тым ліку праз рэалізацыю закладу). Дзейсныя на той час прававыя нормы таксама вызначалі тэрміны грашовых плацяжоў пазычальнікаў прысуджаных судовымі органамі.

Аналіз нормаў грамадзянскага права, якія вызначалі розныя бакі крэдытных адносін у рэгіёне, сведчыць аб высокай ступені развіцця крэдыту, аб наяўнасці багатага, назапашанага стагоддзямі вопыту арганізацыі пазыковых аперацый, разнастайных формаў і відаў забеспячэння пазык (іх можна суаднесці з сучаснай банкаўскай прадуктовай лінейкай), якія адпавядалі патрэбам эканамічнага развіцця дзяржавы таго часу.



Тытульны ліст III Статута Вялікага Княства Літоўскага, 1588 г.

Закладны ліст Казіміра Прашынскага для мужа і жонкі Казіміра і Канстанцыі Эйсімонтаў на частку маёнтка Бурнева ў Гродзенскім павеце за 100 польскіх злотых. ВКЛ, XVIII ст.

1602 Декабря 5.

Сигизмундъ III утверждаетъ установленіе въ Могилевѣ братства при церкви Входа Господня во Іерусалимъ.

Жикгимонтъ третій Божіею.....
Ознаймуемъ симъ листомъ нашимъ всимъ вобецъ и кождому зособна, кому бы то вѣдати належало, теперешнимъ и напотомъ будучимъ людемъ. Дали намъ справу мѣщане мѣста нашого Могилевского, иж они, чинечи порадокъ въ томъ мѣстѣ, подаючи людемъ дорогу ку охотнѣйшему отправованью службы Божое, намовили сами межи собою братство при Церкви Руской заложенья Въѣхання Господня, въ мѣстѣ Могилевскомъ въ рынку збудованой; и того брацтва, черезъ нихъ намовленого, артыкулы списавши, били намъ чоломъ, абы есмо тое постановенье ихъ на вѣчные часы листомъ нашимъ потвердили..... прозьбу ихъ слушную, а хотечы порадокъ въ томъ мѣстѣ Могилевскомъ прикладомъ иншихъ мѣстъ нашихъ учинити, артыкулы певные, черезъ нихъ самыхъ намовленые и списаные, тому брацтву надаемъ, которые, въ сей листъ привилей нашихъ уписуючи, такъ се въ собѣ маютъ:

Ермолай Алексѣевичъ, Ѳедоръ Ѳедоровичъ, Гарасимъ а Кондратъ Максимовичи, Аѳанасъ Яковлевичъ, Аухимъ Романовичъ, Аѳанасъ и Ѳедоръ Свиридовичи, Иванъ Ивановичъ, Мартинъ а Иванъ Овхимовичи, Василій а Стефанъ Левоновичи, Богданъ Игнатовичъ, мѣщане мѣста господарского Могилевского, имены выше помененые и не помененые,



> У XVI ст. на землях ВКЛ сталі стварацца рэлігійна-прафесійныя арганізацыі – праваслаўныя, каталіцкія брацтвы, якія фарміравалі свайго роду пазыковы фонд з унёскаў членаў арганізацыі, якімі карысталіся для правядзення гандлёва-фінансавых аперацый. Брацтвы пазычалі грошы гарадскім уладам, мясцовым феадалам пад 8-15% у год. Менавіта такі інструмент як пазыковы скарб, на нашу думку, і ёсць першая спроба стварыць на землях сучаснай Беларусі своеасаблівую пазыкова-ашчадную касу, якая ўключала ў абарачэнне зберажэнні такой эканамічна актыўнай часткі гарадскога насельніцтва. <



семы тѣ

Раздѣлъ семы ѡзапискахъ ѝпродажахъ.

Артыкулъ а

ѡзапискахъ именеи ѡчизныхъ матерыстыхъ
ивсякимъ ѡбычаемъ набытыхъ.

Уставуемъ ижъ волно кождому именья свои ѡчизные матерыстые выслужоные, купленые и якимъ колвек обычаемъ набытые и названые, не смотречы третее и двухъ частей, але вси вздоймомъ, хто ихъ што маеть, будъ тежъ половицу або которую ихъ часть, або поособну одну, або люди, земли, што хотя от нихъ водле воли и мысли своее отдати, продати, даровати, записати, заставити, от детей и близъскихъ отдалити, подле бачепья своего тымъ шафовати. И хотя бы перво которую часть або половицу именья своего албо што колвекъ людей и земль кому продалъ або записалъ, тогды остаткомъ тыхъ именей всихъ по тому ж воленъ будеть шафовати вечност[ь]ю заставою, яко воля его будеть, также отдаляючи от детей и близскихъ своихъ. А вед же кождый таковый продажу або даръ свой тотъ, хто продаеть або даруеть, справившы перъвей на то запись под печатью своею и с подъписомъ руки, хто писати умеет, и под печатми людей добрыхъ трехъ албо чотырехъ особъ народу шляхетъского, веры годныхъ, въ великомъ князьстве литовском оселыхъ, очевисте от того, хто продаеть, на то упрошоныхъ. А где бы тотъ, хто продаеть албо записуеть, самъ писати не умелъ, тогды печатниковъ таковыхъ до запису своего упросити маеть, которые бы пры печатехъ своихъ и руками власътными тотъ листъ подъписали. А потом самъ очевисте перед нами, г[о]с[по]д[а]ремъ, або передъ врядомъ нашымъ земъскимъ, где в которомъ повете тое именье лежить або до которого суду прислухаеть, сознати маеть. А пакли бы до того повету было далеко, в которомъ тое именье лежить або до которого суду прислухаеть, тогды будеть волно ему на иньшомъ вряде судовомъ, где наближей будеть, таковый записъ свой оповедати и до книгъ записати. А тотъ, кому то продано або якимъ же кольвекъ обычаемъ записано, с тымъ листом, записомъ своимъ и тежъ з выписомъ врядовымъ маеть ехати або слати до того вряду земского повет[о]вого, где а в которомъ повете тое именье лежати будеть. А то оповедавъшы и оказавшы, маеть до книгъ земскихъ тотъ записъ свой увести, а врядъ ... верыти маеть. А што передъ ...

Розделъ семый. О записехъ и продажахъ.

Артикулъ 1.

О записехъ именей отчизныхъ, матерыстых и всякимъ обычаемъ набытыхъ.

Уставуемъ, ижъ волно кождому именья свои отчизные, матерыстые, выслужоные, купленые и якимъ колвек обычаемъ набытые и названые, не смотречы третее и двухъ частей, але вси вздоймомъ, хто ихъ што маеть, будъ тежъ половицу або которую ихъ часть, або поособну одну, або люди, земли, што хотя от нихъ водле воли и мысли своее отдати, продати, даровати, записати, заставити, от детей и близъскихъ отдалити, подле бачепья своего тымъ шафовати. И хотя бы перво которую часть або половицу именья своего албо што колвекъ людей и земль кому продалъ або записалъ, тогды остаткомъ тыхъ именей всихъ по тому ж воленъ будеть шафовати вечност[ь]ю заставою, яко воля его будеть, также отдаляючи от детей и близскихъ своихъ. А вед же кождый таковый продажу або даръ свой тотъ, хто продаеть або даруеть, справившы перъвей на то запись под печатью своею и с подъписомъ руки, хто писати умеет, и под печатми людей добрыхъ трехъ албо чотырехъ особъ народу шляхетъского, веры годныхъ, въ великомъ князьстве литовском оселыхъ, очевисте от того, хто продаеть, на то упрошоныхъ. А где бы тотъ, хто продаеть албо записуеть, самъ писати не умелъ, тогды печатниковъ таковыхъ до запису своего упросити маеть, которые бы пры печатехъ своихъ и руками власътными тотъ листъ подъписали. А потом самъ очевисте перед нами, г[о]с[по]д[а]ремъ, або передъ врядомъ нашымъ земъскимъ, где в которомъ повете тое именье лежить або до которого суду прислухаеть, сознати маеть. А пакли бы до того повету было далеко, в которомъ тое именье лежить або до которого суду прислухаеть, тогды будеть волно ему на иньшомъ вряде судовомъ, где наближей будеть, таковый записъ свой оповедати и до книгъ записати. А тотъ, кому то продано або якимъ же кольвекъ обычаемъ записано, с тымъ листом, записомъ своимъ и тежъ з выписомъ врядовымъ маеть ехати або слати до того вряду земского повет[о]вого, где а в которомъ повете тое именье лежати будеть. А то оповедавъшы и оказавшы, маеть до книгъ земскихъ тотъ записъ свой увести, а врядъ ... верыти маеть. А што передъ ...

ПРОТОБАНКОВСКИЙ ПЕРИОД

В ПРОТОБАНКОВСКИЙ ПЕРИОД XIV–XVI ВВ. В РАМКАХ КРУПНОГО государственного образования, Великого Княжества Литовского, оформилась многоукладная региональная экономика с преобладающим сельскохозяйственным и развитым ремесленным производством. В действиях местной княжеской администрации удачно сочетались усилия по выстраиванию партнерских отношений во внутренней и внешней политике с формированием детальной, разноплановой регламентации действий, в том числе и в финансовой сфере.

На территории Беларуси в этот период сложилась и эффективно действовала местная финансовая система, которая реализовывала в рамках различных сословных объединений обширный комплекс протобанковских функций (включая хранение денег и кредит), обеспечивая экономические потребности граждан и государства в целом. Таким образом, формировались региональные направления протобанковской деятельности, институциальное оформление которой происходило в последующие периоды.

Необходимо отметить дату 1592 г. (дата утверждения самого раннего из сохранившихся цеховых Статутов), как этапный пункт в организации сберегательного дела на территории Беларуси.

PROTO-BANK PERIOD

DURING THE PROTO-BANK PERIOD OF THE 14TH-16TH CENTURIES, IN THE framework of the large state formation, the Grand Duchy of Lithuania, a multi-regional economy with a predominantly agricultural production and developed handicraft industry was formed. The actions of the local princely administration successfully combined efforts to build partnership relations in domestic and foreign policy with the detailed and diverse regulatory actions in the financial sphere.

During this period, on the territory of Belarus developed and effectively operated the local financial system, which executed a wide range of proto-banking functions, including the storage of money and crediting of people from various estates, providing for the economic needs of citizens and the state as a whole. Thus, the regional directions of proto-banking activity were formed, the institutional design of which developed in subsequent periods.

It is necessary to note the year of 1592, the date of approval of the earliest surviving guild statutes, as a milestone in the organization of savings banks on the territory of Belarus.



РАННЕБАНКАЎСКІ ПЕРЫЯД



























Афармленне рэгіянальных банкаў, іх інстытуалізацыя ўяўляецца аднастайнай толькі па знешніх, фармальных параметрах. Па сутнасці, кожнае банкаўскае ўтварэнне заснавана на спецыфічных лакальных асаблівасцях і традыцыях пабудовы дзелавых і фінансавых адносін. У гэтым сэнсе інстытут банка, рэгіянальнага банка — як адказ на патрабаванні часу, якія абапіраліся на існуючыя эканамічныя перадумовы — увасабляў сінтэз практычнага вопыту пабудовы адносін з насельніцтвам канкрэтнага рэгіёна і рэагавання на прагназуемыя запатрабаванні стваральнікаў матэрыяльных выгод.

Пятро Скарга, заснавальнік «пабожнага банка» у г. Вільні, партрэт XVII ст.



РАННІЯ ЦАРКОЎНЫЯ БАНКІ («MONTES PIETATIS»)

З'яўленне першых банкаўскіх структур у Рэчы Паспалітай ініцыяваў вядомы польскі прапаведнік езуіт Пятро Скарга. Гэта былі т.зв. «пабожныя банкі» («montes pietatis») – спецыфічная царкоўная форма крэдытнай установы (упершыню з'явілася ў Італіі ў сярэдзіне XV ст.). Падобныя банкі дзейнічалі згодна з прынцыпам кас узаемадапамогі і займаліся вылучэннем беспрацэнтных крэдытаў (на «фанты»). Свае сродкі яны чэрпалі з добраахвотных ахвяраванняў («ялмужны») парафіянаў. Першы «пабожны банк» у ВКЛ Пятро Скарга заснаваў у 1579 г. у г. Вільні, сталіцы ВКЛ.

У канцы XVI ст. пасля сыходу з жыцця караля Стэфана Баторыя разгарнулася барацьба за трон Рэчы Паспалітай. У 1587 г. яго заняў шведскі прынц Жыгімонт III Ваза. Пры ім фінансы Рэчы Паспалітай дасягнулі росквіту, у немалой ступені дзякуючы дзейнасці падскарбія ВКЛ Яраша Валовіча.

Валовіч Яраш (? — 1643). Паходзіў з беларускага шляхецкага роду Валовічаў герба «Багорыя». Яраш быў старэйшым сынам Івана Іванавіча Валовіча, маршалка ВКЛ. У 1589 г. ён атрымаў пасаду пісара ВКЛ, у 1600 г., дадаткова, пасаду надворнага падскарбія, а ў 1605 г. быў прызначаны земскім падскарбіем, захаваўшы пасаду пісара. У 1618 г. адмовіўся ад усіх пасад у сувязі з прызначэннем падканцлерам ВКЛ. Перыяд знаходжання Я. Валовіча на пасадзе падскарбія земскага (13 гадоў) быў вельмі напружаным. З 1600 г. праходзіла вайна са Швецыяй за панаванне ў Прыбалтыцы, у 1609—1618 гг. — вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй. Войны патрабавалі акумулявання і правільнага выдаткавання грашовых сродкаў у дзяржаве, арганізацыі выразнага забеспячэння арміі і выплаты ёй заробку, што было адным з галоўных абавязкаў земскага падскарбія. Грашовае абарачэнне ВКЛ падчас яго службы падскарбіем перажывала складаны перыяд, калі назіраўся хісткі баланс паміж інфляцыйнымі працэсамі і мерапрыемствамі па іх стрымліванні. Менавіта дзякуючы разумнаму кіраўніцтву Я. Валовіча, гэты баланс удавалася захоўваць. Больш таго, Віленскі манетны двор выпускаў буйныя залатыя манетныя наміналы Вялікага Княства Літоўскага — дукаты і партугалы. Іх эмісіі насілі відавочны прапагандысцкі характар з мэтай прадэманстраваць стабільнасць эканомікі краіны.



Яраш Валовіч з сімвалам пасады падскарбія – ключом, партрэт XVII ст.

Першы банк на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў форме «пабожнага банка» заснаваў у 1598 г. князь Мікалай Радзівіл Сіротка ў Нясвіжы для мясцовых гараджан.

Радзівіл Мікалай Крыштоф Сіротка (1549—1616). Старэйшы сын князя Мікалая Радзівіла Чорнага і графіні Лізаветы Шыдлавецкай. Вучыўся ў гімназіі, у 1563—1564 наведваў універсітэты ў Страсбургу і Цюбінгене, пазней падарожнічаў па Еўропе, наведаў Аўстрыю, Францыю, Італію. У 1577 г. Сіротка падзяліў з роднымі братамі вялікія спадчынныя ўладанні, узяўшы Нясвіж, Лахву, Шацк, Свержань, таксама яму належалі Мір, Зэльва, іншыя населеныя пункты. Пазней валоданні Сіроткі сталі асобным Нясвіжскім княствам або ардынацыяй і перадаваліся па спадчыне без права выключэння з яго якіх-небудзь уладанняў. Важнае месца ў біяграфіі Сіроткі займае паломніцтва ў Святую Зямлю, якое ён пачаў увосень 1582 г. праз Італію, Кіпр, Сірыю ў 1583 г. прыбыў у Іерусалім, дзе наведаў асноўныя хрысціянскія святыні і атрымаў ад гвардзіян Іерусалімскага канвента бернардзінаў званне рыцара Труны Гасподняй. Пазней пабываў у Егіпце, праз Крыт і Італію вярнуўся летам 1584 г. у Нясвіж. Сваё падарожжа Сіротка ярка апісаў у кнізе, выдадзенай у 1601 г.

Князь ВКЛ Мікалай Радзівіл Сіротка – заснавальнік «пабожнага банка» у г. Нясвіжы ў 1598 г., партрэт XVIII ст.







Пасля вяртання ў Вялікае Княства Літоўскае Сіротка заняўся актыўным пераўтварэннем гаспадаркі ў сваіх маёнтках, для чаго выкарыстаў атрыманыя ў замежных падарожжах веды і вопыт. Асаблівую ўвагу надаваў радаваму гнязду Нясвіжу, куды запрашаў рамеснікаў з-за мяжы. У 1580–1590-х гг. пабудаваў з дапамогай італьянскага архітэктара Дж. Бернардоні касцёл пад тытулам Божага Цела, новы каменны замак і ратушу, заснаваў манастыры бенедыкцінак і бернардынаў. У 1585 г. заснаваў бальніцу, атрымаў у 1586 г. ад караля польскага і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя прывілей на магдэбургскае права для горада і розныя ільготы.

Сіротка – удзельнік Інфлянцкай вайны 1558—1582 гг. У час заключэння Люблінскай уніі 1569 г. паміж Польшчай і ВКЛ прысягнуў каралю Жыгімонту Аўгусту толькі пад пагрозай канфіскацыі маёнткаў на Падляшшы. З 1569 маршалак надворны ВКЛ. З 1574 пачаў контррэфармацыйную дзейнасць: выдаў сродкі на скупку пратэстанцкай літаратуры (у т.л. Брэсцкай Бібліі), клапаціўся аб будаўніцтве касцёлаў. Пасля ўцёкаў караля Генрыка Валезы ў Парыж (1574) падтрымаў кандыдатуру Эрнеста Габсбурга на трон, але пасля пагадзіўся з абраннем Стафана Баторыя. За ўдзел у кампаніі 1579 г. прызначаны вялікім маршалкам ВКЛ.



Будынак гарадской ратушы г. Нясвіжа (Мінская вобл.), дзе дзейнічаў першы банк, заснаваны на тэрыторыі Беларусі

Нясвіж, 1604 г.



Прывілей аб заснаванні банка ў г. Нясвіжы 15 студзеня 1598 г. (заключная частка)



Польскі кароль і вялікі князь літоўскі Стэфан Баторый на троне і шляхта падчас пасяджэння Сената Рэчы Паспалітай, 1581 г.

У 1586 г. адмовіўся ад пасады вялікага маршалка ВКЛ на карысць свайго брата Альбрыхта і быў прызначаны каштalянам троцкім, а ў 1590 г. ваяводам троцкім. Падтрымаў заключэнне Брэсцкай уніі 1596 г., быў адным з 3 каралеўскіх паслоў на сабор у Брэсце. У 1604 г. ваявода віленскі. Быў супраць інтэрвенцыі ў Маскоўскую дзяржаву ў пачатку XVII ст. і супраць вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—1618 гг. Разам з братамі Станіславам і Альбрыхтам стварыў у 1586 г. Нясіжскую, Клецкую і Альцкую ардынацыі, стаў 1-м нясвіжскім ардынатам. У 1579 г. выдаў прывілей на самакіраванне г. Мір. Фундаваў касцёлы і шпіталі ў Нясвіжы, Міры, Свержані, Белай (цяпер Польшча) і інш. Збудаваў замкі ў Белай і Нясвіжы, шэраг кляштараў у Нясвіжы.

Месца заснавання банка заканамернае: Радзівілы былі надзвычай багатым родам у Вялікім Княстве Літоўскім, а Нясвіж з сярэдзіны XVI ст. з'яўляўся іх княжацкай рэзідэнцыяй, дзе актыўна ўвасабляліся прагрэсіўныя еўрапейскія навацыі. Значным быў і ўплыў роду Радзівілаў на развіццё фінансавай сістэмы ВКЛ, і беларускіх зямель у прыватнасці.

Ствараючы банк, князь М. Радзівіл у сваіх дзеяннях кіраваўся «хрысціянскімі ідэаламі міласэрнасці», бо менавіта з мэтай «выратавання душ сваіх падданых і процідзеяння іх грахоўнасці» была выдзелена Нясвіжскаму магістрату сума ў 1000 польскіх злотых. У прывілеі аб заснаванні банка, унесеным у Магдэбургскія кнігі Нясвіжа, сказана: *«дал нам Раде города своего Несвижа на Ратушу в городскую скринку... на вечные времена»*.



Відавочны сацыяльныя акцэнты створанага банка — яго мэтавыя ўстаноўкі былі накіраваны не на імгненнае атрыманне прыбытку, а на пабудову доўгатэрміновых партнёрскіх адносін у грамадстве, працэнтная стаўка прапаноўвалася менш за сярэдні ўзровень па краіне, выказваўся давер мясцовым грамадскім інстытутам і персонам у справе кантролю і кіравання грашовымі рэсурсамі.

Заснаванне Нясвіжскага «пабожнага банка» ў пэўным сэнсе азначала пачатак эпохі ўніверсальных і аднастайных падыходаў да працы з грашовымі сродкамі. У той час, як брацка-цэхавыя грашовыя касы дзейнічалі згодна з прынцыпам спецыялізацыі, пры арыентацыі на саслоўныя групы, на жорстка выбудаваны пералік дзеянняў, «пабожны банк» прымаў апрабаваную ў Еўропе мадэль, арыентуючыся на тэрытарыяльны прынцып абслугоўвання насельніцтва (на пачатковым этапе — гараджан).

Ўшматвяковай гісторыі станаўлення айчыннай банкаўскай справы 1598 г. па праву можа лічыцца важным этапам. Ён азначаны стварэннем уласна банка — спецыялізаванага фінансавага інстытута. Характэрна выкарыстанне ў яго пабудове новых, універсальных прынцыпаў. Традыцыі беларускіх зямель у арганізацыі і вядзенні банкаўскай справы займаюць важкае месца ў палітыцы ААТ «ААБ Беларусбанк». І сёння ў Нясвіжы ён прадстаўлены сваімі філіяламі.

XVI ст. — росквіт Рэнесансу і пярэдадзень эпохі Асветы, у той час у ВКЛ ідэя банка «лунала ў паветры». Перадумовы для гэтага сфарміраваліся ў пераемнасці мясцовых традыцый вядзення фінансавай справы, захавання і трансляцыі прафесійнага вопыту, спосабаў сацыяльнай будовы і камунікацыі з прыўнесенымі звонку арганізацыйнымі мадэлямі і ўніверсальнымі рашэннямі. Галоўнымі ініцыятарамі заснавання банка былі не толькі магнаты Радзівілы, але і палітычна актыўная беларуская шляхта.



Умовы «вечнага» дэпазіту былі наступныя:

1. Сума магла перадавацца на вэксаль альбо прадстаўніку гарадскога патрыцыяту, альбо найбольш паважаным нясвіжскім мяшчанам «на гандаль» тэрмінам на 1 год.

2. Працэнтная стаўка павінна была быць такая, каб забяспечваўся прыбытак у 80 польскіх злотых (г.зн. 8%).

3. Час вяртання грошай і працэнтаў усталёўваўся «на Грамніцы» (2 лютага, пасля калядных святаў).

4. Прыбытак павінен быў выдаткоўвацца толькі на пазначаную мэту — дапамога бедным і асірацелым дзяўчатам горада Нясвіжа з мэтай выдачы іх замуж.

5. Памеры дапамогі вызначаў спачатку сам князь Мікалай Радзівіл Сіротка, а пасля яго смерці гэта павінны былі рабіць спадчыннікі і камісія ў складзе: ксёндз-рэктар, ксёндз-плябан, нясвіжскі княжацкі намеснік, войт і адзін прадстаўнік ад гарадской Рады Нясвіжа.

6. Гарантам вяртання грошай выступала гарадская Рада Нясвіжа.

7. Гарадская Рада Нясвіжа павінна была даваць князям Радзівілам штогадовыя фінансавыя справаздачы («лічбы») пад кантролем ксяндзоў рэктара і плябана.

8. Калі прыбытак або яго частка заставаліся без размеркавання, яны дадаваліся да асноўнай сумы 1000 польскіх злотых «каб больш сума расла».

Вытрымка з Прывілея аб заснаванні «пабожнага банка» у г. Нясвіжы



Стэфан Баторый, кароль польскі, вялікі князь літоўскі

КРОКІ ДА ЦЭНТРАЛЬНАГА БАНКА

У КАНЦЫ XVI СТ. У ВКЛ БЫЎ ПРАПАНАВАНЫ ПЕРШЫ ПРАЕКТ ДЗЯРЖАЎНАГА банка. У сувязі з тым, што працэнты па крэдытах «ліхвяроў» часам дасягалі 87% гадавых, у 1584 г. шляхта ВКЛ звярнулася да караля і вялікага князя Стэфана Баторыя з просьбай, каб пасля заснавання банка забараніць прыватным асобам займацца «ліхвярствам», зрабіўшы тым самым крэдытаванне манаполіяй дзяржавы.



Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, кароль польскі і вялікі князь літоўскі.

Новы крэдытны банк павінен быў быць дзяржаўным і функцыянаваць за кошт прыбытку ад дзейнасці Віленскага манетнага двара. Для стварэння першапачатковага грашовага фонду меркавалася на тры гады ўвесці ў Вялікім Княстве Літоўскім спецыяльны крэдытны падатак. Грошы фонду прадугледжвалася даваць у доўг з 10,4% гадавой пазыкай. Банк планавалі размясціць у Вільні. Аднак праект не быў рэалізаваны. Толькі ў 1768 г. каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім быў зноў прапанаваны праект такога банка пад назвай «Bank Polski i Litewski», але безвынікова. У 1790 г. выйшла з друку кніга варшаўскага купца і банкіра Анджэя Капостаса «Planta utozenia projektu Banku Narodowego» з праектам стварэння Нацыянальнага Банка Рэчы Паспалітай. Праект паспрабавалі ажыццявіць у 1792 г., але гэтаму перашкодзілі вядомыя палітычныя падзеі.

У цэлым, у XIV—XVIII стст. грашова-крэдытныя адносіны на тэрыторыі Рэчы Паспалітай сфарміраваліся на высокім узроўні развіцця. Дзяржава стварыла адзіную грашовую сістэму, з буйным манетным фондам, дзе з'явіліся і білонныя манеты (адзін са шляхоў вырашэння сыравіннай праблемы). Традыцыя пабудовы і развіцця прадуктыўных грашова-крэдытных адносін, якая склалася ў Беларусі, працягнулася і ў далейшым.


PLANTA
UŁOZENIA PROJEKTU
BANKU NARODOWEGO
DO
PRZESWIETNEY DEPUTACYI
PROJEKTU EKONOMIKI KRAJOWEY
PODANA
PRZEZ
JĘDRZEIA KAPOSZTAS
KUPCA BANKIERA WARSZAWSKIEGO.

„Dans les Etats, qui font le Commerce d'Economie, on a heureuse-
„ment établi des Banques, qui, par leur Credit, ont formé de nouveaux
„signes des Valeurs."
Montesquieu l'Esprit des Loix.

w WARSZAWIE.

M.DCC.LXXXX.
w Drukarni Nowey J. K. Mci Rzpltey u Piotra Zawadzkiego.





Семіградскі талер Стэфана Баторыя, 1586 г.

Тытульны ліст працы Анджэя Капостаса з праектам арганізацыі «Нацыянальнага Банка» ў Рэчы Паспалітай. Варшава, 1790 г.



Падзелы Рэчы Паспалітай у трэцяй чвэрці XVIII ст.

У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай (у 1772, 1793 і 1795 гг.) паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй землі Вялікага Княства Літоўскага (разам з усёй тэрыторыяй Беларусі) увайшлі ў склад Расійскай імперыі.

Пасля Венскага кангрэса 1815 г. было створана Царства Польскае (існавала да 1917 г.) у складзе Расійскай імперыі (Царства ўключала паўночна-заходнюю частку сучаснай тэрыторыі Беларусі — ускраіну Аўгустоўскага павета Сувалкскай губерні). У развіцці эканомікі Царства Польскага вызначыўся выхадзец са старажытнага беларускага роду — князь Ф.К. Друцкі-Любецкі.

Друцкі-Любецкі Францішак Ксаверы (1778—1846) — адзін з найбольш вядомых міністраў Царства Польскага. Нарадзіўся ў мястэчку Пагост Пінскага павета. Асноўнымі маёнткамі яго былі Чарлена і Шчучын ў Гродзенскім і Слонімскім паветах. Падчас вайны з Напалеонам ён падтрымаў расійскага імператара, пазней па яго даручэнні правёў удалыя перамовы з Аўстра-Венгрыяй і Прусіяй адносна разлікаў па пазыках былой Рэчы Паспалітай. У 1821 г. расійскі імператар Аляксандр I прызначыў князя Друцкага-Любецкага міністрам скарбу Царства Польскага. У яго распараджэнні аказаліся такія важныя пытанні, як спагнанне дзяржаўных падаткаў, дзяржаўныя манаполіі, мытныя пытанні і інш.



Князь ВКЛ Ф.К. Друцкі-Любецкі, партрэт XIX ст.

Скарб Царства Польскага быў ў страшным запусценні (велізарныя недаборы падаткаў, дэфіцыт бюджэту, нявыплата заробкаў). Князь Друцкі-Любецкі не мог змяніць памер падаткаў, таму ён максімальна ўпарадкаваў спагнанне падаткаў з дзяржаўных манаполій (асабліва саляной, тытунёвай і на алкаголь), што стала асновай для фарміравання бюджэту Царства Польскага. Вялікую ўвагу міністр надаваў мытнай палітыцы і замежнаму гандлю. У выніку ўжо ў 1822 г. дэфіцыт бюджэту быў ліквідаваны, а прыбыткі з таго часу толькі раслі. Іншым кірункам яго дзейнасці стала выратаванне буйнога дваранскага землеўладання, бо шмат якія маёнткі былі абцяжараныя вялікімі даўгамі. Князь Друцкі-Любецкі распрацаваў некалькі праектаў таварыства, заснаванага на прынцыпе ўзаемнага крэдыту. Першае «Земскае крэдытнае таварыства» было створана ў 1825 г. Развіццё мясцовай прамысловасці патрабавала прыцягнення вялікіх інвестыцый і выгаднага размеркавання грашовых сродкаў, г. зн. заснавання банкаўскай структуры.

Адкрыццё «Банка Польскага», дазволенае ўказам імператара Мікалая I, стала вяршыняй дзейнасці князя Друцкага-Любецкага. Банк аб'яднаў у сабе самыя разнастайныя функцыі: эмісія грашовых сродкаў абарачэння, абслугоўванне публічнага доўгу, прыняцце дэпазітаў і працэнтных укладаў, выдачу кароткіх і доўгатэрміновых прамысловых крэдытаў, міжнародныя разлікі, дысконты, вэксалі і інш. Дзейнасць «Банка Польскага» (з 1828 г.) спрыяла развіццю гандлю, прамысловасці і сельскай гаспадаркі не толькі ў Польшчы, але і ў прылеглых беларускіх губернях шляхам прадастаўлення крэдытаў і пазык мясцовым памешчыкам і прадпрымальнікам (Радзівілам, Завішам, Чапскім і інш.). Вопыт князя Друцкага-Любецкага пазней быў пераняты многімі мясцовымі прыватнымі банкамі. Яго заслугі ў развіцці банкаўскай справы былі высока ацэнены нашчадкамі.



ГРАШОВАЕ АБАРАЧЭННЕ: ПАПЯРОВЫЯ ГРОШЫ

ФІНАНСАВАЯ СІСТЭМА ВКЛ НЕАДНОЙЧЫ ВЫПРАБОЎВАЛАСЯ НА ТРЫВАЛАСЦЬ. Войны XVII ст. нанеслі значны ўрон эканоміцы Вялікага Княства Літоўскага, што запатрабавала прыняцця надзвычайных мер у фінансавай сферы, у тым ліку для аднаўлення грашовага абарачэння.

У 1658 г. арандатар Кракаўскага манетнага двара Ц.Л. Бараціні зрабіў прапанову аб пачатку эмісіі ў Рэчы Паспалітай папяровых грашовых знакаў. Яны павінны былі мець адкрыта крэдытны характар. Згодна з праектам, Рэч Паспалітая павінна была стаць першай еўрапейскай дзяржавай, якая выпусціла ўласныя папяровыя грошы. Аднак яго праект быў адхілены кансерватыўным соймам. Першыя еўрапейскія папяровыя грошы з'явіліся ў Швецыі ў 1660 г.



Лічыльная машына Ціта Лівія Бараціні, XVII ст.

Бараціні (Burattini) Ціт Лівій (1617—1681). Розна-бакова адукаваны і ініцыятыўны італьянец. Пабываўшы ў многіх краінах, ён асеў у Рэчы Паспалітай пасля 1646 г. Са сваіх уласных сродкаў пазычыў скарбу 60 000 злотых на ўтрыманне войска, а сам з малодшым братам Піліпам прыняў удзел у вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй. За праяўленыя дыпламатычныя і ваенныя заслугі браты, як замежнікі, атрымалі ў 1658 г. пацверджанне свайго дваранства. Тады ж Бараціні ўзначаліў працу Кракаўскага манетнага двара. У 1659 г. вялікі каронны падскарбі падпісаў з ім кантракт на чаканку новай манеты — медных шэлегаў (свайго роду крэдытныя грошы, паколькі іх рэальны кошт складаў каля 15% ад налінальнага). Увядзенне медных грошай у абарот мела інфляцыйны характар і выклікала пэўнае непрыманне ў грамадстве. Чаканка вялася да канца 1668 г., калі была забаронена дзейнасць усіх манетных двароў у Рэчы Паспалітай.


MISVRA
VNIVERSALE
OVERO TRATTATO
NEL QVAL' SI MOSTRA
come in tutti li Luoghi del' Mondo si può trouare una MISVRA, & un PESO VNIVERSALE senza che habbiano relazione con niun'altra MISVRA, e niun altro PESO, & adogni modo in tutti li luoghi saranno li medesimi, e saranno inalterabili, e perpetui sin tanto che durera' il MONDO.
DI TITO LIVIO BVRATTINI
La Misura si puo' trouare in un hora di tempo e questa ci mostra quanto graue deu'essere il PESO
Della MISVRA si causano ancora le MISVRE CORPOREE per misurare le cose aride, e le liquide.
IN VILNA
Nella stamperia de Padri Francescani
L' Anno M.DCLXXV.

Тытульны ліст трактата Ціта Лівія Бараціні «Misura universale», г. Вільня, 1675 г.



Манеты «бараціянкі». ВКЛ, XVII ст.

Акцыя «Таварыства па вытворчасці зерня» на 100 польскіх злотых. Царства Польскае, 1825 г.

Будынак «Банка Польскага» ў г. Варшаве

Скарбовыя білеты паўстанцаў у 25 і 5 злотых. Рэч Паспалітая, 1794 г.

Y памяці сучаснікаў Бараціні застаўся адным з махінатараў, які абясцэніў грошы. Але дзяржава на яго медных «барацінках» істотна паправіла стан свайго скарбу: прыбытак Рэчы Паспалітай склаў каля 6 000 000 злотых. З прычыны недахопу разменнай манеты «барацінкі» заставаліся ў абароце аж да грашовай рэформы Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Выпуск першых папяровых грошай Рэчы Паспалітай быў звязаны з паўстаннем 1794 г. на чале з Тадэвушам Касцюшкам (паўстанне пашырылася і на заходнюю частку тэрыторыі Беларусі).

Паўстанцкі ўрад сутыкнуўся з вострым недахопам фінансаў. Вышэйшая Нацыянальная Рада прыняла рашэнне аб стварэнні «Дырэкцыі Скарбовых білетаў», даручыўшы ёй у максімальна сціснутыя тэрміны арганізаваць выпуск папяровых грошай. Пасля задушэння паўстання гэтыя грошы быліануляваныя і аб'яўленыя па-за законам.

Дзяржаўныя эмісіі папяровых грошай былі ажыццёўлены ў 1807–1814 гг. у Вялікім Княстве Варшаўскім, створаным па Тыльзіцкім міры на аснове тэрыторый, якія адышлі да Аўстрыі і Прусіі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай (разам з паўночна-заходняй часткай сучаснай тэрыторыі Беларусі).

Вялікае Княства Варшаўскае з'яўлялася пратэктаратам Францыі, але пасля Напалеонаўскіх войнаў па рашэнні Венскага кангрэса яго большая частка была рэарганізаваная ў 1815 г. у Царства Польскае, якое было ўключана ў склад Расійскай імперыі.

Згодна з Устаноўчай (канстытуцыйнай) хартыяй 1815 г., Царства Польскае надзялялася бюджэтнай аўтаноміяй і ўласнай грашовай сістэмай. Умацаванню польскай аўтаноміі ў складзе Расійскай імперыі спрыяла заснаванне ў 1828 г. рэгіянальнага Польскага банка.

Развіццё беларускіх зямель у пачатку XIX ст. здабыло напрамкі адрозныя ад польскіх. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, у выніку пераарыентацыі да Расійскай імперыі, у рэгіёне Беларусі адбываліся пераўтварэнні палітычныя, эканамічныя, культурныя, а таксама фінансавыя.

РЭАРГАНІЗАЦЫЯ ГРАШОВАГА АБАРАЧЭННЯ

УЖО ПАСЛЯ ПЕРШАГА ПАДЗЕЛУ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У 1772 Г. НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ было ўведзена абарачэнне расійскіх грошай, у тым ліку і папяровыя асігнацыі, курс якіх пастаянна падаў. Прад'яўленне папяровых асігнацый да размену прыводзіла да таго, што манета збіралася ў Пецярбургу і Маскве. Для ліквідацыі манетнага дэфіцыту ў правінцыі адкрывалі праменныя канторы. Сярод бліжэйшых да беларускіх губерняў былі канторы ў Смаленску, Пскове і Рызе. Яны садзейнічалі ўмацаванню даверу ў грамадстве да папяровых грошай. Але паехаць за некалькі соцен кіламетраў для абмену грашовых знакаў мог дазволіць сабе далёка не кожны.

Падчас вайны 1812 г. перад часовым урадам часткова акупаванай французамі тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў паўстала праблема хаджэння розных грашовых знакаў і адсутнасці пэўнага курсу іх кошту. Французы спрабавалі ўвесці ва ўжытак манеты, прынятыя ў роспісе французскай арміі. Ужо пасля вайны расійскаму ўраду давялося абараняцца ад шматлікіх падробак, у тым ліку высокай якасці, якія напоўнілі краіну і былі вядомыя пад назвай «напалеонаўскіх».

У 1839–1843 гг. міністр фінансаў Расійскай імперыі Я. Канкрын правёў грашовую рэформу, падчас якой сярэбраны рубель быў абвешчаны галоўнай грашовай адзінкай (сярэбраны монаметалізм), а папяровы крэдытны рубель дапускаўся ў якасці дапаможнага грашовага знака. На падставе маніфеста ад 1 чэрвеня 1843 г. была праведзена поўная замена ўсіх, што знаходзіліся ў абарачэнні, папяровых грашовых знакаў на дзяржаўныя крэдытныя білеты, якія падлягалі свабоднаму размену на сярэбраныя рублі.



Міністр фінансаў Расійскай імперыі Я.Ф. Канкрын, партрэт XIX ст.

Канкрын Ягор Францавіч [Георг Людвіг Данііл] (1774—1845) дзяржаўны дзеяч, вучоны, пісьменнік, генерал ад інфантэрыі, сенатар, ганаровы член Пецярбургскай і Парыжскай акадэмій навук. З нямецкага дваранскага роду. Скончыў Магдэбургскі ўніверсітэт, атрымаўшы ступень доктара права (1794). У 1797 г. прыехаў у Расію. У 1812 г. генерал-інтэндант 1-й рускай арміі, размешчанай у беларускіх губернях, у 1813 г. — усёй арміі. Затым зноў у 1-й арміі (жыў пры яе галоўнай кватэры папераменна ў Магілёве, Оршы і Шклове). Даследаваў гістарычныя камяні на беларускіх землях (апублікаваў запіску «Аб Рагвалодавым камені», упершыню даў падрабязнае навуковае апісанне так званых Барысавых камянёў XII ст.)



Паўстанне 1794 г. у Рэчы Паспалітай

Аўтар вядомых у Еўропе навуковых прац, у тым ліку «Аб ваеннай эканоміі падчас міру і вайны і яе дачыненні ў ваенных аперацыях» (1820—1823), «Сусветнае багацце, нацыянальнае багацце і дзяржаўная гаспадарка» (1821), «Эканомія чалавечага грамадства і стан фінансаў» (1945). У 1818 г. па загадзе Аляксандра I прадставіў «Запіску аб вызваленні сялян» з праектам паэтапнай адмены прыгоннага права на працягу 30 гадоў. У перыяд 1823–1844 гг. — міністр фінансаў Расійскай імперыі. У 1839–1843 гг. правёў рэформу грашовага абарачэння, якая ўпершыню ўсталявала сярэбраны монаметалізм. Спрыяў развіццю фінансава-крэдытнай сістэмы: у 1832 г. прыняты новы (другі) статут аб вэксалях.

У 1842 г. пачалася арганізацыя ашчадных кас, пры падтрымцы Я. Канкрына ўзніклі першыя страхавыя таварыствы: агнявога страхавання (1827) і асабістага страхавання (1835). Правёў Гільдыйскую рэформу 1824 г.; у 1827 годзе дваранам і фабрыкантам дазволена запісвацца ў купецкія гільдыі. Аднавіў сістэму вінных водкупаў (1827), знізіў падатак на соль, адмяніў унутраныя суднаходныя пошліны (1823). Адной са сваіх галоўных задач як міністр фінансаў Я. Канкрын бачыў падтрымку навукі, тэхнічнага прагрэсу і адукацыі.



Асігнацыя ў 25 руб. узору 1769 г. (выпуску 1778 г., вонкавы бок)



Асігнацыі ў 25 руб. узору 1786 г. (выпуску 1811 г.).

Казначэйскі білет у 2 талеры. Вялікае Герцагства Варшаўскае, 1810 г.





Асігнацыя ў 5 руб. узору 1819 г. (выпуску 1822 г.), Расійская імперыя



Казначэйскі білет у 5 злотых узору 1824 г. (вонкавы бок), Царства Польскае



Білет Польскага банка ў 5 злотых узору 1830 г. (вонкавы бок), Царства Польскае



Дэпазітны білет у 25 руб. срэбрам. Расійская імперыя, 1840 г.

РЭАРГАНІЗАЦЫЯ КРЭДЫТНА-АШЧАДНЫХ АДНОСІН

ДАДЗЕНАЯ РЭАРГАНІЗАЦЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ, У АДРОЗНЕННЕ АД ГРАШОВАЙ, мела не толькі знешні, але і ўнутраны, рэгіянальны характар.

Першапачаткова роля крэдытных устаноў на беларускіх землях была ўскладзена на прыказы грамадскага догляду (былі заснаваны Кацярынай II у 1775 г.), розныя касы, утвораныя тут паводле расійскага ўзору. Прыказам, перш за ўсё, даручаўся апякунскі нагляд за заснаваннем народных школ і богаўгодных грамадскіх устаноў. Але таксама яны павінны былі выконваць некаторыя крэдытныя аперацыі. Валодаючы сродкамі, вылучанымі ўрадам на дабрачыннасць, і сабранымі з насельніцтва для тых жа мэт, прыказы пускалі гэтыя грошы ў абарачэнне, пазычаючы пад заклад маёмасці. Таксама ж выдавалі крэдыт і пад заклад жылля ў гарадах.



Будынак Гродзенскага прыказа грамадскага догляду (сучасны выгляд)

Прыказы грамадскага догляду на тэрыторыі Беларусі пачалі работу ў 1781 г. (Магілёўскі і Полацкі, у 1796 г. былі аб'яднаны ў Беларускі прыказ; усяго было створана 5 прыказаў, таксама Мінскі, Віцебскі, Гродзенскі і Віленскі). Прыказы знаходзіліся ў падпарадкаванні гаспадарчага дэпартамента Міністэрства ўнутраных спраў, а непасрэдна функцыянавалі пад кантролем і кіраваннем мясцовай адміністрацыі. Дзейнасць прыказаў была прыпыненая ў вайну 1812 г. і адноўленая пасля яе заканчэння.

Прыказы выдавалі ў пазыку грошы ў любы час, сюды сцякаліся вялікія сумы ад укладчыкаў. З выдадзеных пазык прыказ атрымліваў выгаду, як ад аднаго працэнта прэміі ад усёй выдадзенай сумы, так роўна і ад працэнтаў, атрыманых ад пазычальнікаў, больш, чым сам выплачваў сваім укладчыкам. Звыш таго паступалі пастаянныя даходы ад продажу карт, штрафныя, апеляцыйныя і інш.

Пазыкі бралі пераважна дробнапамесныя дваране, якія мелі да 100 прыгонных душ. Пасля вайны колькасць закладзеных душ у Мінскім прыказе за 15 гадоў павялічылася ў 10 разоў. Паняцце «закладу» ў будучыні зведае трансфармацыю, але не страціць сутнасці. У прыказы ўкладвалі сродкі «для прырашчэння працэнтамі» розныя пласты насельніцтва і прадстаўнікі розных канфесій.

Так, у Віцебскі прыказ грамадскага догляду на працягу 1822—1840 гг. укладвалі грошы салдаты Віцебскага гарнізоннага батальёна, жандарскай этапнай і інваліднай камандаў. У 1840 г. Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя прасіла Беларускі прыказ грамадскага догляду выслаць ёй працэнты 300 руб. срэбрам з укладу Астраханскага каталіцкага касцёла.

Парадак выдачы крэдыту пад заклад жылля ў гарадзе можна ацаніць па наступным прыкладзе: у снежні 1809 г. калежскі сакратар Ф. Багдановіч прасіў Беларускі прыказ грамадскага догляду выдаць яму на 8 гадоў пазыку ў памеры 1500 руб. пад заклад каменнага дома ў Магілёве. Прыказ разглядаў гэтую заяву 20 студзеня 1810 г. і папярэдне загадаў магілёўскай паліцыі і гарадскому магістрату агледзець дом, ацаніць яго, высветліць, колькі пры ім зямлі і паведаміць гэтыя звесткі прыказу.

Пазыкі казённым сялянам на «харчаванне і забеспячэнне палёў» выдаткоўвалі павятовыя казначэйствы.

У 1841 г. у Расійскай імперыі былі заснаваны ашчадныя касы. З 1846 г. іх арганізацыяй было загадана заняцца прыказам грамадскага догляду, для прыцягнення сродкаў «людзей усякага звання малых рэшткаў ад выдаткаў, у запас на будучыя неабходнасці», прымаючы невялікія сумы.

Вядома, што ў беларускіх губернях ашчадкассы фактычна ўжо існавалі, а пасля Указа яны атрымалі юрыдычнае афармленне. Так, захаваліся сведчанні аб дзейнасці ашчаднай касы ў Магілёве ўжо ў 1813 г. (гэта першы вядомы прэцэдэнт на тэрыторыі Беларусі). У 1841 г. была створана ашчадкаса ў Магілёўскім прыказе, а ў 1846 г. — у Мінскім прыказе, затым ва ўсіх іншых прыказах грамадскага догляду беларуска-літоўскіх губерняў (усяго 5 кас). У ашчадных касах укладчыкамі былі прадстаўнікі розных саслоўных груп — купцы, ваенныя, мяшчане, сяляне, калектыўныя ўкладчыкі.

У 1852 г. у Віленскай губерні, пры сельскіх управленнях для дзяржаўных сялян, былі заснаваны дапаможныя касы, дзе можна было ўзяць грошы на розныя патрэбы і на распаўсюджванне сельскагаспадарчай прадукцыі. Таксама пры сельскіх управленнях былі заснаваны сялянскія ашчадныя касы, каб дзяржаўныя сяляне маглі захоўваць і прырошчваць працэнтамі грашовыя сродкі, якія засталіся без ужывання. Пазыка давалася грашыма або асобным гаспадарам, або сялянскай грамадзе ў цэлым.



Будынак павятовага казначэйства ў г. Ліда (Віленскай губерні)



Службоўцы ашчаднай касы

Министерство Внутреннихъ Дѣлъ.

Департаментъ Хозяйственный.

Отдѣленіе 2.

Столъ 1.

Въ С. Петербургѣ.

23 Августа 1826.

No 1221.

О сберегательныхъ кассахъ.

Копія.

Циркулярно.

1.

Господину Гражданскому Губернатору.

При способахъ, какіе преподаны и преподаются отъ Правительства и посредствомъ частной благотворительности для распространенія дѣйствій по Общественному призрѣнію, не можно желать распространенія и такихъ учрежденій, посредствомъ коихъ можно бы оказывать денежныя пособія единовременныя, или постоянныя.

Учрежденія таковыя подъ именемъ разныхъ кассъ, составляются изъ весьма не значительныхъ ежегодныхъ взносовъ, но дѣлаются значительными въ послѣдствіи, совокупнымъ оныхъ количествомъ и бывъ приращаемы процентами.

Всѣмъ извѣстна польза одной изъ подобныхъ кассъ, подъ названіемъ Вдовья Казна при Императорскомъ Воспитательномъ Домѣ.

Изъ частныхъ кассъ въ Санктпетербургѣ также отъ части извѣстны:

Для вдовъ музыкантовъ.

Для вдовъ Маклеровъ.

На смертные случаи.

Весьма съ пользою и безъ затрудненія могутъ со… мі… св… чі… до… ях… об… до… сп… дл… бы… пр… кл… ло… Гг… но… каз… пр… ск… ди… І… сп… дар… ще… нія…

Цыркуляр Міністэрства ўнутраных спраў аб заснаванні пры прыказах грамадскага догляду ашчадных кас ад 23 жніўня 1826 г. і перапіска па гэтаму пытанню.

2-ой

1) Можетъ ли быть безъ неудобства учреждена при Приказѣ сберегательная касса.

2) Для какого состоянія оная болѣе нужна.

3) Какія основанія можно принять къ учрежденію и дѣйствію оной, по предмѣтамъ:

a) Ежегодныхъ взносовъ.

b) Обращенія капитала.

c) Времяни и количества пособій.

Къ совѣщанію при семъ случаѣ въ Приказѣ можно пригласить Гг. Губернскаго и Уѣзднаго Предводителей Дворянства, такъ же Градскаго Главу и еще кого, по благоусмотрѣнію Вашему, изъ Дворянства или и купечества, живущихъ въ Губернскомъ городѣ.

Сберегательныя кассы могутъ быть учреждаемы для всѣхъ состояній. Я разумѣю тутъ, между прочими, чиновниковъ и канцелярскихъ служителей. Можно даже приватно нѣкоторымъ состояніямъ сдѣлать о семъ и предложеніе и узнать ихъ отзывы.

По внимательномъ всего обсужденіи, составя проэктъ, на какомъ основаніи и для какого состоянія можно учредить сберегательныя кассы, представить оный по Начальству, для дальнѣйшаго разсмотрѣнія.

Примѣры для составленія правилъ подобнымъ кассамъ и объясненія о пользѣ оныхъ изложены въ учрежденіи Воспитательныхъ домовъ и въ разныхъ мѣстахъ журнала Императорскаго Человѣколюбиваго Общества.

Подписалъ: Управляющій Министерствомъ Внутреннихъ Дѣлъ
В. Ланской.

Скрѣпилъ: Директоръ Алексѣй Стогъ.

Вѣрно: Начальникъ Отдѣленія

4

Списокъ съ повелѣнія его Императорскаго Высочества Цесаревича Гродненскому Г. Гражданскому Губернатору отъ 15-го Октября 1826-го года за № 2189-мъ. —

Управляющій Министерствомъ Внутреннихъ Дѣлъ сообщилъ мнѣ Копію предписанія даннаго Вашему Превосходительству отъ 23. Августа сего года для васъ кругомъ къ Приказомъ Общественнаго призрѣнія вопли въ разсмотрѣніе не можетъ ли быть учреждена при оныхъ сберегательная Касса?

Удостоивая изъ отношенія Управляющаго Министерствомъ Внутреннихъ Дѣлъ что предложенія о сбер… отно… Превосходите… трѣніи об… ношеніи … основаніи …

Загад Цэсарэвіча «Аб заснаванні пры прыказах грамадскага догляду ашчадных кас у г. Гродна" ад 15 кастрычніка 1826 г.

4 об

сберегательныя кассы и таковый представить по Начальству, предписываю вамъ вышеупомянутое предписаніе Управляющаго Министерствомъ Внутреннихъ Дѣлъ исполнивъ, о послѣдующемъ мнѣ донести къ представленію нужнаго если признается возможнымъ учредить помянутую сберегательную Кассу. —

Списокъ съ повеленія Его Императорскаго Высочества Цесаревича Гродненскому Гражданскому Губернатору отъ 8. Марта 1827. Года за № 506. –

По исполненію до нвнѣ Вашимъ Превосходительствомъ предписанія мною отъ 15. Октября истекшаго 1826-го Года, о приведеніи въ дѣйствіе дѣланнаго вамъ управляющимъ Министерствомъ внутреннихъ дѣлъ пору-

чения … та, въ предметѣ ус- … наго Учрежденія сбе- … ніи мнѣ сего пуб … ить учредить пред … – подтверждаю … медленно пуб … несеніе. –

24 Марта 1827. Года. № 17

Его Высочеству

Рапортъ!

Въ слѣдствіе повелѣнія ко мнѣ Вашего Импера торскаго Высочества отъ 15-го Октября прошлаго 1826. года подъ № 506 полученнаго мною 8-го числа сего мѣсяца, имѣю честь всепокор нѣйше донести в. с. Списокъ постановленія Гродненскаго приказа об щественнаго призрѣнія состоявшагося 22-го сего мѣсяца въ общемъ при ствіи приказа, Город ненскаго повытоваго маг Городенскаго Города

Цирк … венному Губернатору. 2429. –

учредить въ настоящее время при означенномъ приказѣ Сберегательную Кассу. Списокъ таковаго постановленія, представляю Е. в. ч. Литов скому Военному Губер натору. –

Гнеўны ліст яго Імператарскай Вялікасці Цэсарэвіча Гродзенскаму гарадскому губернатару аб заснаванні пры прыказах грамадскага догляду ашчадных кас, ад 8 сакавіка 1827 г.

Запыт праекта па ашчадной касе Валынскага губернатара, май 1827 г.

№ 2,293. Получ. 30. Мая 1827

13

Отъ Волынскаго Гражданскаго Губернатора.

Господину Гродненскому Гражданскому Губернатору

17. Мая 1827,

№ 12340

Житомиръ.

Къ исполненію циркулярнаго предложенія Господина Управляющаго министерствомъ внутреннихъ дѣлъ отъ 23-го августа 1826 года за № 1221-мъ, объ учрежденіи при Здѣшнемъ приказѣ общественнаго призрѣнія сберегательной Кассы, для Составленія отомъ въ приказъ проекта, нужно для Соображенія моего Свѣдѣнія, какой воспріемной вашему превосходительству Губерніи въ приказъ общественнаго призрѣнія по означенному предмету учрежденіи сберегательной Кассы составленъ проектъ, почему покорнѣйше васъ прошу милостивый Государь съ таковаго проекта нет Оставить Сообщить мнѣ списокъ.

Рапарт Літоўскаму ваеннаму губернатару: 22 сакавіка адбылася нарада ў прысутнасці Гродзенскага павятовага маршала Баржанцкага, кіраўніка горада Дзідрыха адносна немагчымасці заснаваць у цяперашні час пры абазначаным прыказе ашчаднай касы, 1827 г.

АРГАНІЗАЦЫЯ БАНКАЎ У РАСІІ

ПАСЛЯ ЎВАХОДЖАННЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У РАСІЙСКУЮ ІМПЕРЫЮ і правядзення фінансавых рэарганізацый надышоў чарговы этап фарміравання банкаўскай справы, які накіроўваўся з усходу.

Раней, у другой палове XVIII ст., у Расійскай імперыі, як і ў Рэчы Паспалітай, складвалася дзяржаўная грашова-крэдытная сістэма. Фінансавымі цэнтрамі Расіі з'яўляліся абедзве сталіцы — Масква і Пецярбург. Першыя банкі тут з'явіліся ў 1754 г. Яны з'яўляліся саслоўнымі — адзін для дваранства, другі для купецтва.

У 1762 г. быў заснаваны дзяржаўны эмісійны банк, якому надавалася права выпуску банкаўскіх білетаў. Праект быў рэалізаваны пазней, у 1769 г., шляхам стварэння асігнацыйных банкаў. Такі крок быў надзённым для Расійскай імперыі, бо з-за вядзення шматлікіх войнаў патрабавалася вялікая колькасць наяўных грошай.

Заснаванне Асігнацыйнага банка дазволіла стварыць шэраг казённых крэдытных устаноў, якія забяспечваліся сродкамі з гэтага банка: Пазыковы банк, захоўная казна і прыказы грамадскага догляду. Гэтыя ўстановы прымалі ў неабмежаванай колькасці ўклады да запатрабавання, выдаючы укладчыкам 5-працэнтныя ўкладныя білеты, што абарочваліся сярод насельніцтва, як грошы, пры тым, што яны былі «на прад'яўніка».

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай урад Расіі клапаціўся, у першую чаргу, аб матэрыяльным становішчы вышэйшага саслоўя далучанай тэрыторыі Беларусі.

У 1776 г. генерал-пракурор князь А. Вяземскі прадставіў Сенату даклад «касательно до принятия в дворянские банки под заклад белорусских губерний недвижимых имений на равном основании, как и все великороссийские имения принимаются».

Урад Расійскай імперыі надаваў вялікую ўвагу развіццю прамысловасці і гандлю ў краіне. У канцы XVIII — пачатку XIX стст. з дзяржаўнага казначэйства Расіі былі выдаткаваны значныя сумы крэдытаў беларускім гарадам і заводам, на тэрмін да 10 гадоў, беспрацэнтна і з мінімальным працэнтам. У гэтым можна бачыць правобраз банкаўскай работы з карпаратыўнымі кліентамі. З 1808 г. для пашырэння суконных мануфактур даваліся спецыяльныя пазыкі «в губерниях от Польши отошедших». Аднак, у цэлым камерцыйны крэдыт быў слаба арганізаваны. Гэта тлумачыць шматлікія скаргі таго часу з нагоды ліхвярства.



Будынак Асігнацыйнага банка ў Санкт-Пецярбургу



Будынак Дваранскага банка ў Маскве

Як пісаў сучаснік у сярэдзіне XIX ст., «прыватныя асобы плацяць у цяперашні час за пазыку пад заклад каштоўнасцей, што часова забяспечваюць доўг, якая выдаецца з дзяржаўных крэдытных устанаўленняў, 5%, за тую, што выдаецца з прыказаў грамадскага догляду 6%… за пазыку ад прыватных асоб 8% і за пазыку ад ліхвяроў 12, 24, 48, а часам і 72% у год».

У 1817 г. быў заснаваны Дзяржаўны Камерцыйны банк, менавіта для аказання садзейнічання гандлю і прамысловасці. Міністр фінансаў у сваім праекце пісаў, што «галоўная мэта банка ёсць не ў памнажэнні прыбыткаў ад абаротаў яго капіталу, але ў аказанні дапамогі купецтву і ў спыненні празмернай ліхвы».

У Расіі нарастала ўсведамленне неабходнасці развіцця прыватнага камерцыйнага крэдыту. У Маскве ініцыятыва па адкрыцці камерцыйных банкаў сыходзіла ад купцоў, у Пецярбургу – ад прадстаўнікоў вышэйшых колаў, якія выступалі ў якасці заснавальнікаў. У рэгіёнах гэтую ініцыятыву часта праяўлялі афіцыйныя прадстаўнікі ўлады, у асобе губернатараў.



Генерал-губернатар князь М. Хаванскі

У 1826 г. Віцебскі, Магілёўскі і Смаленскі генерал-губернатар князь М. Хаванскі паведамляў у рапарце імператару Мікалаю I пра стан гандлю ў Віцебскай і Магілёўскай губернях і прапаноўваў: «Паводле прыкладу некаторых гандлёвых гарадоў заснаваць для грамадзян Віцебскай губерні ў губернскім горадзе аддзяленне камерцыйнага банка на агульных правілах… Гэта ўстанова… памножыць абарот капіталаў, ажывіць гандаль і дасць карысць на ўвесь стан». У 1851 г. шэраг віцебскіх дваран на чале з княгіняй С. Галіцынай (жонка князя А. Галіцына, Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага генерал-губернатара) распачалі спробу адкрыць у Віцебску камерцыйны банк для фінансавання мясцовых прытулкаў. У 1860 г. міністру фінансаў паступіла прапанова губернатара Віцебскай губерні князя А. Галіцына адкрыць у губерні фінансавую ўстанову, накшталт крэдытных земскіх таварыстваў, «якія існуюць у Царстве Польскім і ў Остзейскіх (Прыбалтыйскіх) губернях». Прапановы не атрымалі рэалізацыі.

Да сярэдзіны XIX ст. вырасла колькасць непагашаных банкаўскіх пазык памешчыкаў. Для ўздзеяння на неплацельшчыкаў практыкавалася апісанне маёнткаў і іх перадача ў дваранскае апякунскае кіраванне, з мэтай прымусовага спагнання грошай. Павышаліся патрабаванні да пазычальнікаў. Цяпер для атрымання крэдыту з банкаўскіх устаноў трэба было прадставіць інвентар (апісанне) маёнтка з падрабязным указаннем эканамічнага стану гаспадаркі з абавязковым зацвярджэннем губернатара. У дачыненні да безнадзейных пазычальнікаў выкарыстоўвалася крайняя мера – прадстаўленне маёнтка на продаж на аўкцыёне. Гэта прыводзіла да таго, што не толькі памешчыкі, якія па нейкіх акалічнасцях не змаглі выплаціць у тэрмін працэнты, але і іх нашчадкі гублялі сваю маёмасць і ўпадалі ў беднасць, таму што на таргах, па большай частцы, прадаваліся маёнткі за бясцэнак. У самым цяжкім становішчы знаходзіліся Віцебская і Магілёўская губерні.

Да 1860 г. урад Расійскай імперыі не ішоў на адкрыццё банкаў на беларускіх землях. Розныя пласты насельніцтва, і ў першую чаргу дваранства і купецтва, маглі атрымаць крэдыты ў банках і крэдытных установах Масквы і Пецярбурга (перш за ўсё – дваранскія, купецкія, Пазыковы банкі). У 1859 г. больш за палову даўгоў памешчыкаў беларуска-літоўскіх губерняў прыходзілася на Пецярбургскую захоўную казну. Аднак, адсутнасць банкаўскіх устаноў непасрэдна на тэрыторыі Беларусі, безумоўна, стрымлівала развіццё рэгіёна.



Княгіня С. Галіцына



Генерал-губернатар князь А. Галіцын



НА ПАРОЗЕ РАСІЙСКАЙ БАНКАЎСКАЙ СІСТЭМЫ

АДКРЫЦЦЁ РАСІЙСКІХ БАНКАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ СУАДНОСІЦЦА з радыкальнымі пераўтварэннямі ў фінансавай сферы Расіі.

На працягу амаль усяго XIX ст. Расійская імперыя адчувала велізарныя цяжкасці ў грашовым абароце. Войны, якія прыводзілі да пашырэння эмісіі папяровых грошай, пазбаўлялі расійскі рубель неабходнай устойлівасці і рабілі сур'ёзную шкоду камерцыйнаму крэдыту. Неаднаразовыя спробы грашовых рэформаў мелі толькі часовы эфект. Толькі з увядзеннем у 1897 г. залатога стандарту (рэформа С.Ю. Вітэ) пастаянным ваганням кошту рубля прыйшоў канец. Прыняўшы сістэму абарачэння, якая грунтуецца на залатой манеце, Расійская імперыя ўступіла ў цесны кантакт з міжнародным рынкам валют. Са з'яўленнем залатога рубля краіна забылася пра існаванне яшчэ зусім нядаўна «праклятага» пытання аб няўстойлівасці расійскіх грошай, інфляцыйных працэсах, што перыядычна шкодзілі фінансавай сістэме.

Вітэ Сяргей Юльевіч (1849—1915), дзяржаўны дзеяч, рэфарматар, аўтар эканамічных прац, мемуарыст. З сям'і галандскага паходжання, якая атрымала расійскае дваранства ў 1856 г. У 1870 г. скончыў фізіка-матэматычны факультэт Наварасійскага ўніверсітэта (Адэса), затым займаў адміністрацыйныя пасады на казённых чыгунках, у лютым-жніўні 1892 г. — міністр шляхоў зносін. Са жніўня 1892 г. — міністр фінансаў. Увёў вінную дзяржаўную манаполію (1894), правёў грашовую рэформу (завершана да 1897 г.), якая ўсталявала залаты монаметалізм, правёў рэформу гандлёва-прамысловага падаткаабкладання (1898). У 1903 г. прызначаны старшынёй Камітэта міністраў. Пад кіраўніцтвам С. Вітэ складзены Маніфест 17 кастрычніка 1905 г., які абвяшчаў аб дараванні палітычных свабод і стварэнні заканадаўчай Дзяржаўнай думы. У 1905—1906 — старшыня рэарганізаванага Савета міністраў. Пры Вітэ значна пашырыўся ўплыў дзяржавы на эканоміку. Ён быў прыхільнікам паскоранай індустрыялізацыі з актыўным прыцягненнем замежных пазык і інвестыцый. С. Вітэ — ганаровы член Пецярбургскай Акадэміі навук, Расійскага геаграфічнага таварыства, Вольнага эканамічнага таварыства.



С.Ю. Вітэ, партрэт XIX ст.

Пасля ўвядзення залатога монаметалізму адной з найважнейшых асаблівасцей валютнай сістэмы Расійскай імперыі з'яўлялася наяўнасць велізарнага залатога запасу, які дасягнуў да пачатку Першай сусветнай вайны 1,5 млрд. руб., што нашмат перавышала залаты запас Англійскага банка (390 млн. руб.) і германскага Рэйхсбанка (550 млн. руб.), разам узятых. У адрозненне ад іншых краін, эмісія крэдытных білетаў у Расійскай імперыі грунтавалася выключна на залатым забеспячэнні. Менавіта гэтым тлумачыцца ўстойлівасць расійскага рубля.

Акрамя таго, умацаванне расійскай грашовай адзінкі супала з паляпшэннем сусветнай гаспадарчай кан'юнктуры, што, разам узятае, прывяло да значнага ўздыму вытворчых сіл краіны, індустрыяльная мадэрнізацыя якой прыкметна паскорылася.

Поспеху грашовай рэформы садзейнічала і трэцяя прычына — наяўнасць да гэтага часу ў краіне даволі стройнай, развітай і шматузроўневай банкаўска-крэдытнай сістэмы, якая ўключала як дзяржаўныя, так і прыватныя фінансавыя ўстановы. Гэта сістэма таксама ў немалой ступені забяспечвала ўстойлівасць курса рубля, звязваючы значныя грашовыя масы.

Стварэнне гэтай сістэмы ў Расіі пачалося з заснавання ў 1860 г. Дзяржаўнага банка. Гэтаму папярэднічала арганізацыя у 1859 г. камісіі для вывучэння пытанняў, якія датычаць дзяржаўных банкаў і крэдытнай сістэмы. У частцы, што датычыць крэдытнай сістэмы, камісія прыняла наступныя рашэнні: 1. ліквідаваць існуючыя дзяржаўныя крэдытныя ўстановы і даручыць іх ліквідацыю новаму цэнтральнаму банку; 2. прадаставіць прыватным камерцыйным банкам права забяспечыць патрэбнасці краіны ў кароткатэрміновым і доўгатэрміновым крэдытаванні.

У адрозненне ад класічных цэнтральных дзяржаўных эмісійных банкаў, Дзяржбанк Расійскай імперыі праводзіў не толькі эмісійную справу, г.зн. непасрэдны выпуск грошай у абарачэнне, але і ўзначаліў усю крэдытную сістэму, утрымліваючы за сабой функцыі найбуйнейшага камерцыйнага банка. Дзяржаўны банк знаходзіўся ў непасрэдным падначаленні міністра фінансаў.

Аддзяленні Расійскага Дзяржаўнага банка былі адчынены ва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі: Вільня — 1865 г., Мінск — 1881 г., Магілёў — 1883 г., Віцебск — 1883 г., Гродна — 1884 г.



Будынак Дзяржаўнага камерцыйнага банка ў Санкт-Пецярбургу





Будынкі губернскіх аддзяленняў Расійскага Дзяржаўнага банка ў Мінску і Віцебску

Губернскія аддзяленні прызначаліся для вядзення наступных фінансавых аперацый (гэты спектр банкаўскіх паслуг да цяперашняга часу ляжыць у аснове лінейкі прадуктаў фінансава-крэдытных інстытутаў):

1) абмен старых крэдытных білетаў на новыя і буйных на дробныя і наадварот,

2) аплата купонаў і выплата капіталаў па працэнтных паперах, згаданых у асобых пераліках Дзяржаўнага банка,

3) прыём сум з казначэйства,

4) прыём сум са службовых і грамадскіх устаноў і ад прыватных асоб для пераводу ў Дзяржаўны банк і яго канторы і аддзяленні,

5) прыём укладаў на захоўванне, на бягучы рахунак і на абарот з працэнтаў,

6) пазыкі пад заклад працэнтных папер, акцый і аблігацый,

7) атрыманне плацяжоў па тэрміновых дакументах за кошт Дзяржаўнага казначэйства, банка або прыватных асоб і ўстаноў, якія маюць бягучыя рахункі,

8) купля і продаж дзяржаўных каштоўных папер.



Дзяржаўны крэдытны білет у 50 руб. узору 1899 г., Расійская імперыя



POSTAWY. Ogólny widok.



Я.І. Любанскі, дваранін, землеўладальнік, прадпрымальнік

Губернскія аддзяленні Дзяржбанка таксама мелі права крэдытаваць прамысловасць і гандлёвую дзейнасць.

У адміністрацыйным кіраванні аддзяленняў Дзяржаўнага банка важная роля належала Уліковаму камітэту. Менавіта на яго рэгулярных пасяджэннях вырашаліся пытанні ўліку вэксаляў, адкрыцця крэдытаў і рахункаў.

Па прадстаўленні кіраўніка Мінскага аддзялення Дзяржаўнага банка міністр фінансаў зацвердзіў у складзе членаў Уліковага камітэта мінскіх купцоў, як «людзей, што карыстаюцца добрай рэпутацыяй і блізка ведаюць гандаль горада Мінска і Мінскай губерні, а таксама і асоб, якія вядуць яго».

Члены Уліковага камітэта прыносілі пісьмовае абяцанне захоўваць камерцыйную тайну і высока ацэньвалі сваё прызначэнне.

Так, мінскі 2-й гільдыі купец Абрам Якаўлевіч Шабадт у лісце да кіраўніка Мінскага аддзялення Дзяржбанка адзначаў: «Аказаны мне давер я паспрабую апраўдаць у вышэйшай ступені, бо лічу наогул прыемным абавязкам садзейнічаць развіццю і ўзняццю правільнага гандлю і правільнага крэдыту ў тутэйшым краі».

Акрамя купцоў, у склад камітэта ўключаліся дваране-землеўладальнікі, напрыклад, І.І. Кукевіч, Я.І. Любанскі, Э.Л. Абрампальскі, І.Ю. Райкевіч.



Герб роду Ельскіх

Такім быў і Адам Міхайлавіч Ельскі. У рэкамендацыях адзначалася, што сумесна з братам ён валодае маёнткам Гольні ў Гродзенскай губерні, акрамя таго, яму належыць чвэрць механічнага і ліцейнага завода ў Варшаве, што ацэньваецца ў 250 тыс. руб., зямельны ўчастак і дом у Мінску на Падгорнай вуліцы (заўважым, што менавіта на гэтай вуліцы быў узведзены капітальны будынак Мінскага аддзялення Дзяржаўнага банка).

Амаль два дзесяцігоддзі, пачынаючы з 1887 г., А.М. Ельскі знаходзіўся ў складзе Уліковага камітэта і за сваю бездакорную службу быў узнагароджаны ордэнамі Св. Станіслава 1-й, 2-й і 3-й ступеняў. Кіраўніцтва Мінскага аддзялення так характарызавала яго якасці: «Чалавек багаты, выдатна адукаваны і карыстаецца ў горадзе добрай рэпутацыяй».

Прысутнасць дваран у складзе камітэта ў немалой ступені была звязана з тым, што адпаведна патрабаванню расійскага дваранства Дзяржаўны банк атрымаў з 1884 г. права адкрываць крэдыты землеўладальнікам для атрымання пазык пад сола-вэксалі. Такім чынам, ён набыў рысы іпатэчнага банка.







#1025

Января 29. 1825

Изъ Минскаго Губернскаго Правленія

въ Минскую Казенную Палату

По Указу ЕГО ИМПЕРАТОРСКАГО ВЕЛИЧЕСТВА Губернское Правленіе слушавъ указъ Правительствующаго Сената по 1 Департаменту отъ 8 Декабря минувшаго 1824 года за No: 42810, съ изъясненіемъ рапорта Г. Министра Финансовъ, въ которомъ изъясняетъ, что въ положеніи о ссудахъ изъ Государственнаго Заемнаго Банка, Высочайше утвержденномъ въ 4 день Іюня тогожъ года въ § 24 постановлено: „Въ Губерніяхъ Витебской и Могилевской ссуды по 150 руб. на ревижскую душу не прежде могутъ быть изъ Банка производимы, какъ по особенному разрѣшенію по приведеніи въ извѣстность всѣхъ расчетовъ о суммахъ, отпущенныхъ на продовольствіе помѣщичьихъ крестьянъ въ сихъ Губерніяхъ„ О семъ приняты были Министерствомъ финансовъ въ свое время надлѣжащія мѣры и почти всѣ таковые расчеты приведены уже въ окончанію. Между тѣмъ Г. Управляющій Министерствомъ Внутреннихъ дѣлъ, по ходатайству Могилевскаго дворянства, относился къ нему Министру финансовъ, чтобы для полученія ссудъ помѣщикамъ Могилевской Губерніи изъ Заемнаго Банка, дозволено было въ выдаваемыхъ изъ Главнаго Суда 2 Департамента свидѣтельствахъ на заемъ въ Заемномъ Банкѣ суммы, означать денежныя ссуды для Могилевской Губерніи изъ казны употребленныя, каковымъ образомъ можно имѣть ближайшее свѣденіе къ вычету оныхъ изъ банковаго займа, и тѣмъ сократить время, на приведеніе къ окончанію расчетовъ предполагаемое. По соображеніи сего съ вышеприведеннымъ положеніемъ о ссудахъ, онъ Министръ финансовъ, находя съ своей стороны; что разрѣшеніе теперь въ выдачу денегъ изъ заемнаго Банка подъ залогъ имѣній въ Витебской и Могилевской Губерніяхъ послужитъ къ вящшему облегченію денежныхъ оборотовъ въ сихъ Губерніяхъ, полагалъ возможнымъ: помѣщиковъ оныхъ допустить въ займу изъ банка денегъ на общемъ основаніи съ тѣмъ, чтобы въ свидѣтельствахъ Главныхъ Судовъ означаемы были всѣ недоимки на нихъ числящіяся, и чтобы сіи недоимки удерживаемы были изъ суммы къ выдачѣ назначаемой, о чемъ и входилъ съ представленіемъ въ Коммитетъ Гг. Министровъ. Комитетъ положилъ оное утвердить; о чемъ и сообщено ему Мини-

Указ аб дазволе памешчыкам беларускіх губерняў браць банкаўскія пазыкі. 25 студзеня 1825 г.

> Для памешчыкаў Віцебскай і Магілёўскай губерній пазыкі з Дзяржаўнага Пазыковага банка выдаваліся толькі па спецыяльным дазволе. Кабінет міністраў Расійскай Імперыі вырашыў дапусціць выдачу пазык у Віцебскай і Магілёўскай губерніях на агульных умовах. <

Развіццё прамысловасці і рост аўтарытэту фабрыкантаў прывялі да з'яўлення ў складзе Уліковага камітэта ўладальнікаў мінскіх прадпрыемстваў: чыгуналіцейнага завода — Н.Я. Якабсон, гарбарнага — А.В. Імрот, машынабудаўнічага і кацельнага — Я.І. Выгодскі.

Дзяржаўны банк стаяў у цэнтры фінансава-крэдытнай сістэмы Расійскай імперыі, таксама яго губернскія аддзяленні выконвалі гэтую функцыю на месцах. Іх уплыў не абмяжоўваўся прамым фінансаваннем мясцовых камерцыйных банкаў, крэдытных устаноў і наглядам за іх дзейнасцю. Дзейнічалі і больш тонкія механізмы, персаніфікаваныя, бачныя толькі пасля аналізу асабовага складу банкаўскай адміністрацыі.

Адметнай старонкай у гісторыі Дзяржаўнага банка з'яўлялася выдача так званых нестатутных пазык. Так называліся крэдытныя аперацыі, якія рабіліся па спецыяльным дакладзе міністра фінансаў і дазволу цара. Яны па сваім прызначэнні, памерах, тэрмінах і іншых умовах не былі прадугледжаны статутам Дзяржбанка, і нават прама яму супярэчылі.

Сярод такіх адзначаецца пазыка на два гады, выдадзеная генерал-ад'ютанту князю Л.Л. Радзівілу для выплаты тэрміновай банкаўскай пазыкі, шматразовыя працяглыя адтэрміноўкі пазыковых плацяжоў для княгіні Радзівіл. У сувязі з гэтым можна нагадаць, што першы банк на тэрыторыі Беларусі быў заснаваны менавіта прадстаўніком роду Радзівілаў. Экстраардынарныя эпізоды такога роду сведчаць пра разуменне расійскім урадам ролі нацыянальнай эліты на беларускіх землях.



ЗНЕШНІ ВЫГЛЯД БАНКАЎСКІХ СЛУЖАЧЫХ

ПАСЛЯ ПАДЗЕЛАЎ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ АГУЛЬНАІМПЕРСКІЯ ПАРАДКІ ЎВОДЗІЛІСЯ ва ўсіх сферах жыцця далучаных беларускіх губерняў, уключаючы рэгламенты службовых дзеянняў. Адным з новаўвядзенняў стала форменнае адзенне. Яно ўвасабляла прыналежнасць чалавека да дзяржаўных служачых, у тым ліку банкаўскіх. Узнікненне формы звязана з імкненнем еўрапейскіх кіраўнікоў да візуальнага вылучэння праз мундзір дзяржаўных служачых з агульнай масы насельніцтва.

Мундзіры грамадзянскіх губернскіх чыноўнікаў у Расійскай імперыі з'явіліся ў пачатку 1780-х гг. Колеры гэтых мундзіраў паўтаралі каларыстычнае рашэнне мясцовых гербаў. Такую форму мелі права насіць як чыноўнікі, так і дваране, якія не знаходзіліся на дзяржаўнай службе. Напамінам аб прыналежнасці ўладальніка мундзіра да высакароднага саслоўя (дваранства) з'яўлялася прыкладаемая да яго шпага як сімвал службы, г.зн. аддаленае сімвалічнае абазначэнне рыцарскага мяча, запазычанае з заходнееўрапейскай геральдычнай традыцыі.

Мундзір дзяржаўных банкаў узору 1786 г. Расійская імперыя



Першыя звесткі аб банкаўскіх мундзірах належаць да канца XVIII ст. У 1750—1780-х гг. служачыя казённых банкаў насілі мундзіры або ваенныя (кіраўніцтва казённых банкаў тады складалі ў асноўным былыя афіцэры), альбо губернскія.

Мяркуецца, што першы ўласна «банкаўскі мундзір» быў зацверджаны ў 1786 г., калі быў створаны «Пазыковы банк» і рэфармаваны «Асігнацыйны банк». Гэтыя пераўтварэнні суправаджаліся зменамі ў іх штатным раскладзе, да якіх прымяркоўвалася і ўвядзенне новага форменнага адзення. У другой палове XVIII ст. у банкаўскай сферы пачалі складвацца пэўныя традыцыі, адной з якіх стала традыцыя нашэння банкаўскімі служачымі адмысловай уніформы (мундзіра) і ўганаравання выдатнікаў банкаўскай службы ўзнагароднымі знакамі. Пасля заснавання ў 1860 г. Дзяржаўнага банка гэтая традыцыя атрымала асабліва шырокае развіццё.

Агульны колер мундзіраў, зялёны, быў замацаваны за банкаўскай формай з 1804 г. У якасці асноўнага колеру мундзіра зялёны быў абраны не выпадкова — у еўрапейскай традыцыі ён звязаны з банкірскай справай. Зялёным сукном мянялы накрывалі свае лавы — банкі, пра што сведчаць, у прыватнасці, жывапісныя выявы. Упершыню на элементах мундзіра з'явілася спецыяльная банкаўская сімволіка. На гузіках былі адбітыя выявы двух рагоў багацця з пчалой, якія абазначаюць дастатак і росквіт — мэта дзейнасці банкаў, а таксама працавітасць — сродак дасягнення гэтай мэты. Аналагічныя выявы былі змешчаныя на абшлагах. Гэта сімволіка надоўга замацавалася ў якасці банкаўскай. Пасля таго, як ў 1855 г. Аляксандр II заняў прастол, ведамасныя мундзіры зноў падпалі пад рэфармаванне з мэтай надання большай практычнасці. Чыноўнікам дазвалялася з'яўляцца на службу без шпагі.

Традыцыя ўжывання ў паўсядзённай практыцы форменнай вопраткі і рэгламент яе ўжывання захоўваліся і пазней. У канцы XX ст. зялёны колер стаў карпаратыўным таксама і для супрацоўнікаў Беларусбанка.

Мундзіры Полацкага і Магілёўскага намесніцтваў узору 1784 г.





РАННЕБАНКОВСКИЙ ПЕРИОД

РАННЕБАНКОВСКИЙ ПЕРИОД В БЕЛАРУСИ, С КОНЦА XVI ПО ВТОРУЮ ПОЛОВИНУ XIX в., включает два сущностно отличных этапа. На начальном этапе, более протяженном, с конца XVI по конец XVIII в., белорусские земли пребывали в составе Речи Посполитой. Их экономика развивалась в русле общеевропейских процессов. С середины XVI в. наблюдался устойчивый спрос на зерно, вызванный комплексом причин, включая развитие городов, ремесленного производства, торговых связей и товарно-денежных отношений.

На данном этапе выделяется факт создания «побожного банка» — первого в Беларуси специализированного банковского института (1598 г., г. Несвиж). Его основание положило начало появлению новой организации денежно-кредитных отношений в обществе. Несвижский прецедент сориентировал местную денежно-кредитную политику на решение социальных проблем на основе повышения эффективности местных производителей, пользующихся кредитами.

Для создания банковской системы на государственном уровне был разработан ряд проектов. Согласно проектам 1584, 1768, 1792 гг., узловым элементом этой системы должен был стать центральный государственный банк. Однако, исторические обстоятельства сложились таким образом, что задуманные мероприятия не были реализованы, а решение назревших вопросов было исполнено в рамках банковско-кредитной организации иного государства — Российской империи.

Обсуждаемый период отмечен существенными организационными переменами, переносом центра тяжести взаимоотношений по вектору «запад-восток». Если начальный этап периода, до конца XVIII в., отмечен интеграцией ВКЛ с западным партнером, Польшей, то в заключительный этап вектор отношений белорусских земель был обращен на восток, к России. На территории белорусско-литовских губерний были полностью реорганизованы все социально-политические институты и механизмы, включая банковский. Ряд финансовых реформ привел к перестройке денежного обращения, кредитных отношений и включению региона Беларуси в крупномасштабную российскую кредитно-финансовую систему. Позитивные перемены начались после учреждения в России центрального Государственного банка.

EARLY BANKING PERIOD

THE EARLY BANKING PERIOD IN BELARUS, FROM THE END OF THE 16TH TO THE SECOND half of the 19th century, includes two essentially different stages. At the initial stage, which was more extensive, from the end of the 16th to the end of the 18th century, Belarusian lands were part of the Polish-Lithuanian Commonwealth. Their economy was developing in accordance with pan-European processes. Since the 16th, there was a steady demand for grain, caused by a complex of causes, including urban development, development of handicraft production, trade relations and commodity-money relations.

At this stage, the fact of creating a pobozhny bank (montes pietatis), the first specialized banking institution in Belarus (1598, Nesvizh), had a special importance. Its foundation marked the birth of a new system of monetary relations in society. The Nesvizh precedent focused local monetary policy on solving social problems by improving the efficiency of local producers, who used loans.

To create a banking system at the state level, a number of projects was developed. According to the drafts of 1584, 1768, 1792, the central state bank was to be the key element of this system. However, historical circumstances developed in such a way, that the planned activities were not realized, and the solution of the urgent issues was carried out within the framework of the banking and credit organization of another state — the Russian Empire.

The period under review was marked by significant organizational changes, when the center of gravity of the relationship shifted along the «west-east» vector. If the initial stage of the period, before the end of the 18th century, was marked by the integration of the GDL with the Western partner, Poland, then in the final stage the vector of relations of the Belarusian lands was turned eastward, towards Russia. All the socio-political institutions and mechanisms, including the banking system, were completely reorganized on the territory of the Belarusian-Lithuanian provinces. A number of financial reforms led to the restructuring of monetary circulation, credit relations and the inclusion of the region of Belarus in a large-scale Russian credit and financial system. Positive changes began after the establishment of the central State Bank in Russia.

БАНКАЎСКІ ПЕРЫЯД























Стварэнне банкаўскай сістэмы — натуральны і неабходны этап банкаўскай эвалюцыі. Гэта працяглае ў часе дзеянне, вынік комплексу пераўтварэнняў, колькасных і якасных, арганізацыйных і прававых, у прафесійным узаемадзеянні фінансавых устаноў з дзяржаўнымі ўладнымі структурамі, сферамі вытворчасці, сацыяльнымі коламі.

У папярэдні перыяд XVI—XVIII стст. Рэч Паспалітая сфарміравала неабходныя перадумовы і прыступіла да абмеркавання праектаў такога роду. Іх найважнейшым кампанентам намячалася стварэнне цэнтральнага дзяржаўнага банка. З шэрагу прычын праекты не былі рэалізаваныя. У гэтым назіраецца і ўскоснае сведчанне надзейнасці існуючай на той перыяд раннебанкаўскай сістэмы, што дазваляла не спяшацца з правядзеннем рэформаў.

Іншай была сітуацыя ў Расійскай імперыі, дзе ўцягнутасць у актыўную знешнепалітычную дзейнасць выяўляла недахопы архаічнай грашова-крэдытнай арганізацыі і надзённа патрабавала мадэрнізацыі эканамічных і фінансавых інстытутаў.

УВАХОДЖАННЕ Ў РАСІЙСКУЮ ДЗЯРЖАЎНУЮ БАНКАЎСКУЮ СІСТЭМУ

СТВАРЭННЕ БАНКАЎСКАЙ СІСТЭМЫ Ў РАСІІ ВЯДЗЕ АДЛІК АД ЗАСНАВАННЯ Ў 1860 Г. Дзяржаўнага банка. У адрозненне ад цэнтральных класічных дзяржаўных эмісійных банкаў, Дзяржбанк Расійскай імперыі засяродзіў у сваіх руках не толькі эмісійную справу, г.зн. непасрэдны выпуск грошай у абарачэнне, але і ўзначаліў усю крэдытную сістэму, утрымліваючы за сабой функцыі найбуйнейшага камерцыйнага банка. Дзяржаўны банк знаходзіўся ў непасрэдным падначаленні міністра фінансаў.

Цэнтральнымі звёнамі банкаўскай сістэмы Расіі з'яўляліся аддзяленні Дзяржбанка, якія былі адкрыты ў губернях краіны, у тым ліку 4 — на беларускіх землях, у перыяд 1881–1884 гг.

Права, прадастаўленае губернскім аддзяленням Дзяржбанка крэдытаваць прамысловасць і гандлёвую дзейнасць, было вельмі прывабным для мясцовых прадпрымальнікаў.



МИНИСТЕРСТВО ФИНАНСОВЪ
ОСОБЕННАЯ КАНЦЕЛЯРІЯ
ПО
КРЕДИТНОЙ ЧАСТИ.

Отдѣленіе 1.
Столъ 1.
28 Марта 1873 г.
№ 3658.

Господину Витебскому Губернатору.

Вслѣдствіе отношенія Вашего Превосходительства, отъ 23 Февраля 1873 г. за № 475, по ходатайству Витебскаго Городскаго Общества объ открытіи въ городѣ Витебскѣ Отдѣленія Государственнаго банка, имѣю честь Васъ, Милостивый Государь, увѣдомить, что (не отвергая пользы открытія въ городѣ Витебскѣ банковаго Отдѣленія, я не признаю однако возможнымъ нынѣ же приступить къ открытію сего Отдѣленія, въ виду значительнаго числа уже открытыхъ и имѣющихся на очереди къ открытію Отдѣленій Государственнаго банка. За симъ я буду имѣть означенное ходатайство въ виду.

Министръ Финансовъ,
Статсъ-Секретарь

Директоръ

№ 1.

Ліст міністра фінансаў Расійскай імперыі на прашэнне Віцебскага губернатара аб адкрыцці адзялення Дзяржаўнага банка ў Віцебску. 28 сакавіка 1873 г.

> Міністр фінансаў адзначыў, што нягледзячы на карысць адкрыцця адзялення, у той час гэта было немагчыма, бо існавала вялікая колькасць ужо адкрытых аддзяленняў і тых, што чакаюць свайго адкрыцця. <

Коммерческое училище.
Общ. Купеческихъ прикащиковъ.

Витебскъ.



Ужо на наступны год пасля адкрыцця аддзялення Дзяржбанка ў Мінску група найбуйнейшых мінскіх купцоў хадайнічала аб дазволе «на адкрыццё ўліковых аперацый». Першапачаткова, з 1883 г. Праўленне Дзяржбанка дало на гэта дазвол з умовай, «каб выдаткаваная на аперацыю сума… не перавышала 200 000 рублёў». У далейшым дазволены аб'ём сродкаў штогод павялічваўся (на 20—50%).

Дзейнасць аддзялення ў сферы камерцыйнага крэдыту была даволі стабільнай, вагаўся толькі памер крэдытаў, іх агульная сума, а таксама колькасць крэдытаў. У канцы XIX ст. асноўнымі напрамкамі былі – крэдытаванне гандлёвых аперацый (амаль палова крэдытаў) і лясных нарыхтовак (чвэрць). Становішча крыху змянілася праз дваццаць гадоў: лясная справа – амаль палова крэдытаў; грашовыя аперацыі – 1/5; мясцовы гандаль – 1/6; фабрычна-завадскія прадпрыемствы – 1/7; сельская гаспадарка – 1/30.



Дзяржаўны крэдытны білет у 10 руб., 1865 г. Расійская імперыя

Ліст Мінскага губернатара аб удасканаленні грашовага абарачэння, 10 студзеня 1878 г.

> Мінскі губернатар патрабаваў, каб грашовыя сродкі, якія павінны па закону паступаць у дзяржаўныя крэдытныя ўстановы, а таксама сродкі, якія з Дзяржаўнага банка былі пераведзены ў прыватныя крэдытныя ўстановы, былі ў хуткім часе вернуты ў Дзяржаўны банк або яго аддзяленні. <



ГАРАДСКІЯ БАНКІ

АДНОЙ З РАННІХ ФОРМАЎ БАНКАЎСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У РАСІІ (З КАНЦА XVIII СТ.) былі гарадскія банкі. Яны з'яўляліся, пераважна, вынікам мясцовых грамадскіх ініцыятыў і арыентаваліся на рашэнне лакальных задач. Капітал гэтых банкаў утвараўся са сродкаў гарадскога бюджэту. Такія банкі часткова займаліся іпатэкай, выдавалі доўгатэрміновыя пазыкі пад заклад гарадскіх будынкаў і будаўнічых участкаў. У гарадскіх банках можна было атрымаць камерцыйны крэдыт, крэдытаваліся ў асноўным сярэднія і дробныя прадпрымальнікі. Крэдыты, акрамя прыватных асоб, выдаваліся таксама гарадской управе і мясцоваму земству, прыбытак ад аперацый адлічваўся на патрэбы гарадскога парадку і дабрачынныя мэты.

Першым банкам расійскай банкаўскай сістэмы на беларускіх землях стаў менавіта гарадскі грамадскі банк — у Гомелі, адкрыты ў 1870 г. (да гэтага часу агульная колькасць такіх банкаў у Расіі набліжалася да 200). За 35 гадоў з моманту заснавання банк прымножыў асноўны капітал з 20 тыс. руб. у 5,5 разоў (прыблізна на 1/4 атрыманага прыбытку).

Пазней гарадскія банкі былі адкрыты ў Полацку (1874), Віцебску (1882), Барысаве (1900), Ігумене (1904), Магілёве (1908). Усяго ў Расійскай імперыі ў 1914 г. існавала 319 такіх банкаў, з іх 48 — у губернскіх гарадах, астатнія ў павятовых.



Паперня ў г. Добрушы (Магілёўская губ.), буйнейшы вытворца паперы ў Расійскай імперыі, канец XIX ст.



Галоўная кніга Віцебскага Дзяржаўнага банка за 1912 г.

> Дзяржаўныя банкаўскія ўстановы знаходзіліся пад пастаянным фінансавым кантролем як з боку мясцовых улад, так і з боку галаўных банкаўскіх структур. <

ПО РЕЕСТРУ ДУМСКИХЪ ДѢЛЪ № 123

1

Въ Минскую Городскую Думу

42674

МИНСКАЯ ГОРОДСКАЯ
24. ОКТ. 1912
УПРАВА.

Заключеніе Финансовой Комиссіи по вопросу объ открытіи въ г. Минскѣ городского Общественнаго Банка

По положенію о городскихъ Общественныхъ Банкахъ таковымъ предоставлено право производить междупрочим слѣдующія операціи :

1/ По учету векселей

2/ По ссудамъ подъ залогъ процентныхъ бумагъ

3/ По вкладамъ

4/ По ипотечному кредиту въ городѣ и уѣздѣ .

Уже въ силу обширности сферы дѣятельности городского Банка можно надѣяться , что при умѣломъ веденіи дѣла онъ займетъ подобающее ему мѣсто въ хозяйственной жизни города

Такъ какъ Банкъ будетъ оперировать на средства города и не будетъ заинтересованъ въ полученіи возможно большаго дивидента и ему нѣтъ надобности стремиться къ накопленію возможно большаго запаснаго капитала, то условія кредита для города и его жителей могутъ оказаться въ немъ болѣе доступными и льготными чѣмъ въ частныхъ банкахъ.

Въ виду этого Финансовая Комиссія признаетъ – желательнымъ открытіе въ г. Минскѣ городского общественнаго банка для чего должна быть избрана особая миссія съ участіемъ спеціалистовъ.

ПРЕДСѢДАТЕЛЬ Р. Яновскій

ЧЛЕНЫ :

Минская Городская Дума, въ засѣданіи своемъ 29- Октября сего 1912 г. состоявшемся, въ составѣ 35 г.г гласныхъ постановила Для подробнаго разслѣдованія поднятаго Финансовой Комиссіей вопро избрать подъ предсѣдательствомъ г.Яновскаго Р.К. Комиссію изъ г.г гласныхъ Боричевскаго, Стражевскаго, Свѣнцицкаго,Янчевскаго,Обром ского Прошинскаго,Брауде, Плавскаго и Амброшкевича.-Подлинный з надлежащими подписями.

Съ подлиннымъ вѣрно:

Секретарь

> Фінансавая камісія адзначала, што згодна з палажэннем гарадскім грамадскім банкам прадастаўлена шырокая сфера дзейнасці. Такім банкам няма неабходнасці шукаць большых дывідэнтаў і, магчыма, у гэтым банку будуць лепшыя ўмовы для крэдытавання жыхароў Мінска. <

Заключэнне фінансавай камісіі аб неабходнасці адкрыцця ў Мінску Гарадскога Грамадскага банка, 1912 г.

2

Его Высокородію

Господину Минскому Городскому Головѣ.

Потомственнаго Дворянина
Игнатія Михайловича
Талько, жительствующаго
въ г. Минскѣ по Сѣнной
улицѣ въ собственномъ домѣ
№ 12.

Прошеніе.

Симъ имѣю честь нижайше просить, Ваше Высокородіе, зачислить меня кандидатомъ на какую либо должность по открывающимся въ Минскомъ Городскому Банку или Трамваю и проч.

При этомъ присовокупляю, что я окончилъ Горецкое Земледѣльческое Училище. Въ послѣднее время служилъ сборщикомъ по Монополіи до введенія акцизъ. Могу представить свои аттестаты, гдѣ коихъ будетъ видна моя предыдущая дѣятельность.

1913го года Марта 2го дня.

Потомственный дворянинъ И. Талько.

Прашэнне радавога дваранiна I.М. Талько аб залiчэнні кандыдатам на пасаду ў Гарадскім грамадскім банку або ў Упраўленні гарадскіх трамваяў, якія адкрываюцца ў Мінску, 1913 г.

> У прашэнні Талько ўказвае, што закончыў Горацкае земляробскае вучылішча і працаваў зборшчыкам «па Манаполіі да вядзення арцелі». <

Палажэнне аб страхаванні прыбыткаў і капіталаў праз пасрэдніцтва дзяржаўных ашчадных кас. 30 мая 1905 г.

Списокъ

556

На подлинномъ собственною Его Императорскаго Величества рукою написано:

"Быть по сему"

Въ Царскомъ Селѣ,
30 Мая 1905 г.

ПОЛОЖЕНІЕ

о страхованіи доходовъ и капиталовъ черезъ посредство государственныхъ сберегательныхъ кассъ.

I. Общія положенія.

1. На государственныя сберегательныя кассы возлагается страхованіе доходовъ (пенсій) и капиталовъ, на основаніи правилъ, изложенныхъ въ нижеслѣдующихъ (2—57) статьяхъ.

2. Государство принимаетъ на себя отвѣтственность по обязательствамъ, возникающимъ изъ операцій государственныхъ сберегательныхъ кассъ по страхованію доходовъ и капиталовъ.

3. Вознагражденіе лицъ, привлеченныхъ къ занятіямъ по страховой операціи государственныхъ сберегательныхъ кассъ, равно какъ прочіе расходы по ея веденію, производятся изъ страховыхъ премій и прибылей страховой операціи. Точный размѣръ отчисленій изъ этихъ источниковъ опредѣляется совѣтомъ по дѣламъ страхованія доходовъ и капиталовъ, причемъ изъ страховыхъ премій не можетъ быть отчисляемо свыше пяти процентовъ, а изъ прибылей страховой операціи болѣе четвертой части ихъ. Вознагражденіе лицъ, занимающихся страховою операціею, производится по правиламъ, утверждаемымъ совѣтомъ по дѣламъ страхованія доходовъ и капиталовъ.

4. Свободныя, за покрытіемъ текущихъ обязательствъ, суммы страховой операціи вносятся въ Государствен-



Будынак чыгуначнага вакзала ў г. Гомелі (станцыя Лібава-Роменскай і Палескай чыгунак), канец XIX ст.



Будынак гарадскога грамадскага банка (у цэнтры) у г. Полацку, канец XIX ст.

Рапарт аб пажары ў Гарадскім грамадскім банку ў г. Барысаве, 1915 г.

> Паведамляецца, што 24 лютага 1915 г. ў 00 г. 30 хв. ночы адбыўся пажар у памяшканнях гарадскога грамадскага банку, які размяшчаецца ў будынку мешчаніна С.М. Айзенштата. Нягледзячы на тое, што пажарам знішчаны два невялікіх калідоры і пашкоджана столя, усе кнігі, справы і каса банка цэлыя. Пабудовы былі застрахаваны на 25 100 руб. <

Его Превосходительству,

26. ФЕВР. 1915

Господину Минскому Губернатору.

Борисовскаго Уѣзднаго Исправника

РАПОРТЪ.

24 сего февраля въ 12½ часовъ ночи въ горо
Борисовѣ произошолъ пожаръ въ помѣщеніи, зани-
маемомъ городскимъ общественнымъ Банкомъ, въ
мѣ Борисовскаго мѣщанина Симона Мовшева Айзе
тата; означеннымъ пожаромъ уничтожено: два небо
шихъ деревянныхъ корридора и попорчены потол
и крыша занимаемаго Банкомъ двухъ-этажнаго ка
меннаго дома. Всѣ книги, дѣла и касса банка цѣ
Пожаръ произошолъ отъ неосторожнаго обращени
съ огнемъ. Постройки застрахованы въ Борисовс
взаимномъ обществѣ въ 25100 руб., убытка прич
нено по заявленію потерпѣвшаго на сумму окол

-%-



КАМЕРЦЫЙНЫЯ БАНКІ

НЕЎЗАБАВЕ ПАСЛЯ СТВАРЭННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА БАНКА РАСІІ ЎРАД СТАЎ ВЫДАВАЦЬ дазволы на адкрыццё прыватных камерцыйных акцыянерных банкаў. Банкаўскі бум ахапіў усю краіну. Першым, у 1864 г., быў адкрыты Пецярбургскі прыватны банк, праз год з'явіўся Маскоўскі Купецкі банк. За пяць гадоў было арганізавана шэсць акцыянерных банкаў, у наступнае пяцігоддзе яшчэ 33. Прыватнай банкаўскай справе спатрэбілася ўсяго дзесяць гадоў для таго, каб заваяваць устойлівы аўтарытэт.



Банкір, камерсант Еўзель Гінцбург

У 1873 г., выступаючы на першым з'ездзе прадстаўнікоў акцыянерных банкаў камерцыйнага крэдыту, кіраўнік Дзяржаўнага банка Я. І. Ламанскі адзначаў: «Незалежна ад разнастайнасці інтарэсаў, што прадстаўляюцца банкамі, яны яўляюць сабой яшчэ іншае значэнне: велічэзную фінансавую сілу… у руках банкаў сканцэнтраваны інтарэсы акцыянераў да такой ступені буйныя, што банкі маюць ужо самі па сабе не толькі прыватнае, але і дзяржаўнае значэнне».

Шэраг банкаў Расійскай імперыі ствараўся і кіраваўся выхадцамі з беларускіх губерняў. У іх ліку — два з трох найбуйнейшых Расійскіх банкірскіх дамоў канца XIX — пачатку XX стст. — «І.Е. Гінцбург», «Л. Палякоў» і «Браты Рабушынскія».







Будынкі першых прыватных камерцыйных банкаў Расійскай імперыі ў Маскве і Санкт-Пецярбургу







Н. Зубаў, А. Бруэль-Плятэр – ініцыятары заснавання Віленскага прыватнага Камерцыйнага банка ў 1873 г.

Князь І.Э. Друцкі-Любецкі, член праўлення Мінскага камерцыйнага банка ў 1901-1908 гг.

Гінцбургі і Паляковы разбагацелі на вінных водкупах у заходніх губернях. Аснову банкірскага дома «І.Е. Гінцбург» у Пецярбургу заклаў віцебскі купец 1-й гільдыі Габрыэль Гінцбург, які ў 1849 г. быў узведзены ў спадчыннае ганаровае грамадзянства г. Віцебска, у тым жа годзе ганаровым грамадзянінам стаў яго сын Еўзель. У 1859 г. Еўзель Гінцбург адкрыў банкірскі дом у Пецярбургу і яго аддзяленне ў Парыжы. Сярод іншага банкіры фінансавалі золатаздабычу і будаўніцтва чыгунак, дапамагалі грашыма расійскаму ўраду.

Да 1890-х гг. банкірскі дом «І.Е. Гінцбург» займаў лідарскае становішча ў фінансавым свеце Расіі.

Дуйны банкірскі дом у Маскве ўзначальваў Лазар Палякоў, які з 1860 па 1864 гг. знаходзіўся ў Аршанскім купецтве. Старэйшы яго сын, Самуіл, уваходзіў у вузкае кола магутных уладальнікаў чыгунак — чыгуначных «каралёў». Пры яго непасрэдным удзеле (як канцэсіянера і падрадчыка) у 1860—70-я гг. было пабудавана звыш за 3,7 тыс. вёрст, або 1/6 частка ўсіх чыгунак Расійскай імперыі (да 1880 г). Малодшыя браты С. Палякова ўзначальвалі ўласныя гандлёвыя і банкірскія дамы.



Банкір, камерсант Лазар Палякоў

У рэгіёне Беларусі востра адчувалася неабходнасць адкрыцця мясцовых камерцыйных банкаў. У 1871 г. губернатару быў прадстаўлены праект Магілёўскага камерцыйнага банка.

Аднак першы на беларускіх землях акцыянерны камерцыйны банк быў адкрыты ў Мінску ў 1873 г. Мяркуецца, што ён пэўным чынам быў звязаны з будаўніцтвам чыгунак – Лібава-Роменскай і Маскоўска-Брэсцкай. Мінскі банк стаў 28-м па ліку прыватным камерцыйным банкам Расіі. Сетка камерцыйных банкаў развівалася імкліва – у Бабруйску, Вільні, Віцебску і іншых гарадах.



Будынак Маскоўскага Міжнароднага гандлёвага банка ў г. Брэсце



Аперацыйная зала Віленскага прыватнага камерцыйнага банка, пачатак XX ст.

Банкі і аддзяленні банкаў у рэгіёне Беларусі ў 1870–1914 гг.

Горад	Дзяржаўныя банкаўскія ўстановы	Мясцовыя і рэгіянальныя банкі	Аддзяленні камерцыйных банкаў
Бабруйск		Банк узаемнага крэдыту	Аддзяленне Арлоўскага Камерцыйнага банка Аддзяленне Віленскага прыватнага камерцыйнага банка Аддзяленне Аб'яднанага камерцыйнага банка Аддзяленне Варшаўскага прыватнага камерцыйнага банка
Барысаў		Гарадскі грамадскі банк	
Нова-Барысаў		Банк узаемнага крэдыту	
Брэст			Аддзяленне Маскоўскага Міжнароднага гандлёвага банка Аддзяленне Арлоўскага Камерцыйнага банка Аддзяленне Аб'яднанага камерцыйнага банка
Віцебск	Аддзяленне Дзяржаўнага банка Аддзяленне Сялянскага Пазямельнага банка	Гарадскі грамадскі банк Купецкі банк	Аддзяленне Рыжскага камерцыйнага банка Аддзяленне Маскоўскага Міжнароднага гандлёвага банка Аддзяленне Аб'яднанага камерцыйнага банка
Гомель		Гарадскі грамадскі банк Мікалаеўскі сялянскі банк	Аддзяленне Мінскага камерцыйнага банка Аддзяленне Пецярбургска-Азоўскага камерцыйнага банка Аддзяленне Арлоўскага Камерцыйнага банка Аддзяленне Віленскага прыватнага камерцыйнага банка Аддзяленне Варшаўскага прыватнага камерцыйнага банка Аддзяленне Паўночнага банка Аддзяленне Аб'яднанага камерцыйнага банка Аддзяленне Руска-Азіяцкага банка
Гродна	Аддзяленне Дзяржаўнага банка Аддзяленне Сялянскага Пазямельнага банка		Аддзяленне Беластоцкага камерцыйнага банка Аддзяленне Рускага гандлёва-прамысловага камерцыйнага банка Аддзяленне Руска-Французскага камерцыйнага банка
Ігумен		Гарадскі грамадскі банк	
Кобрын		Гарадскі грамадскі банк	
Мінск	Аддзяленне Дзяржаўнага банка Аддзяленне Сялянскага Пазямельнага банка	Мінскі камерцыйны банк	Аддзяленне Віленскага прыватнага камерцыйнага банка Аддзяленне Пецярбургска-Азоўскага камерцыйнага банка Аддзяленне Азова-Данскога камерцыйнага банка Аддзяленне Паўночнага банка Аддзяленне Руска-Азіяцкага банка
Магілёў	Аддзяленне Дзяржаўнага банка Аддзяленне Сялянскага Пазямельнага банка Аддзяленне Дзяржаўнага Дваранскага Зямельнага банка	Гарадскі грамадскі банк	Аддзяленне Мінскага камерцыйнага банка Аддзяленне Адэскага гандлёва-прамысловага камерцыйнага банка Аддзяленне Рускага Гандлёва-Прамысловага камерцыйнага банка Аддзяленне Азова-Данскога камерцыйнага банка Аддзяленне Аб'яднанага камерцыйнага банка
Орша			Аддзяленне Віленскага прыватнага камерцыйнага банка Аддзяленне Арлоўскага Камерцыйнага банка Аддзяленне Аб'яднанага камерцыйнага банка
Пінск		Гарадскі грамадскі банк	Аддзяленне Мінскага камерцыйнага банка Аддзяленне Азова-Данскога камерцыйнага банка
Полацк		Гарадскі грамадскі банк	Аддзяленне Аб'яднанага камерцыйнага банка
Рагачоў		Гарадскі грамадскі банк	
Слонім			Аддзяленне Беластоцкага камерцыйнага банка Аддзяленне Руска-Французскага камерцыйнага банка

Будынак Руска-Азіяцкага банка ў г. Гомелі, канец XIX ст.




Привѣтъ изъ Слонима.
Мостовая ул.
Mostowa ul.


Am Bahnhof i. Baranowitschi.




Полоцкъ.
Видъ съ Краснаго Моста на Городъ


ОРША. ВОКЗАЛЪ.



Праект помніка ў г. Кобрыне ў гонар першай перамогі над войскамі Напалеона 15 ліпеня 1812 г.

По Климовичской Райсберкассе
от 23 июня 1941 г.

§1.

Считать освобожденными с работы в связи с уходом в армию по мобилизации с 24 июня 1941 года:
1) Инспектора РСК Васьковского М.И.
2) Контролера сберкассы №3 Рубанова Ф.
Бухгалтерии произвести с указанными лицами полный расчет с выплатой двухнедельного пособия.

§2.

Контролером Роднянской сберкассой №3 временно назначить кассира по совместительству – начальника отделения связи – Рубанова Петра Н. с оплатой ему 50% ставки в м-ц контролера, как работающему по совместительству

Зав райсберкассой [подпись]

Разам па старонцы . .

Загад па Клімавіцкай ашчадкасе ад 23 чэрвеня 1941 г.

> Па загаду былі звольнены работнікі ашчадкасы ў сувязі з мабілізацыяй ў армію, з імі быў праведзены поўны разлік. <

Вайна выклікала вялікае напружанне фінансавай і грашовай гаспадаркі краіны. Агульная сума непасрэдных ваенных расходаў больш чым у тры разы перавышала даходную частку бюджэту 1940 г. На патрэбы абароны былі накіраваны назапашаныя ў перадваенны перыяд рэзервы, свабодныя фінансавыя рэсурсы гаспадарак і банкаў, а таксама сродкі насельніцтва ў форме добраахвотных і абавязковых плацяжоў, якія склалі за 1941—1944 гг. 26% усіх прыбыткаў дзяржбюджэту.

Вялікія сумы грашовых сродкаў на патрэбы абароны паступалі за кошт распаўсюджвання дзяржаўных ваенных пазык. У цэлым па чатырох ваенных пазыках (з 1942 г. штогод) у бюджэт паступілі сродкі, якія больш чым удвая перавышалі суму 14 даваенных пазык.

Важнай крыніцай дзяржаўных даходаў сталі добраахвотныя ўзносы насельніцтва. Шырокае распаўсюджванне атрымаў збор сродкаў грамадзян на пабудову самалётаў і танкаў. Насельніцтва уносіла ў Фонд абароны грошы, каштоўнасці, аблігацыі дзяржаўных пазык. Актыўна праводзіліся ў гады вайны грашова-рэчавыя латарэі.

Многія работнікі ашчадных кас, тыя, што засталіся на часова акупаванай ворагам тэрыторыі, прымалі актыўны ўдзел у падпольнай і партызанскай барацьбе, былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Рэспубліканскае ўпраўленне дзяржпрацашчадкас і дзяржкрэдыту, знаходзячыся далёка за межамі рэспублікі, у г. Казані, займалася вышукам і рэвізіяй здадзеных у розныя ашчадкасы краіны каштоўнасцей і дакументаў эвакуіраваных ашчадных кас. Асабовыя рахункі ўкладчыкаў і пазыкатрымальнікаў, бухгалтарскія і іншыя дакументы гэтых кас збіраліся ў Казань, адкуль затым вярталіся адноўленым ашчадкасам.

У снежні 1943 г. Рэспубліканскае ўпраўленне пераехала ў вызвалены Гомель.

У першачарговым парадку вырашалася праблема падрыхтоўкі кадраў. З ліпеня 1944 г. Рэспубліканскае ўпраўленне зноў разгарнула сваю дзейнасць у сталіцы БССР Мінску. На вызваленай тэрыторыі адкрываліся ашчадкасы, аднаўляліся абласныя ўпраўленні. Спатрэбілася нямала высілкаў і не адзін год, каб праца фінансавай сістэмы зноў увайшла ў нармальнае рэчышча.



У 1941 у г. Казань было пераведзена Савецкае Міністэрства фінансаў, у тым ліку Дзяржаўны банк, шматлікія архівы, уключаючы архівы ашчадных кас. На здымку – будынак былога Казанскага аддзялення Дзяржаўнага банка Расійскай імперыі ў г. Казань, у якім падчас Айчыннай вайны месцілася цэнтральнае сховішча Дзяржаўнага банка СССР

Для служебного пользования

СПРАВКА

Об эвакуированных сберегательных кассах Белорусской ССР

Данные на 15 февраля 1942 года

Наименование Областей	Количество районсберкасс на 15.VI.1941 г.	Имеются данные об эвакуации районсберкасс	Привезены документы или частично.	Привезены полностью только ценности	Уничтожены документов.	Нет сведений, что привезено.	Нет данных об эвакуации.
Барановичская	27	6	5	1	-	-	21
Белостокская	23	5	4	-	1	-	18
Брестская	18	2	2	-	-	-	16
Вилейская	21	11	9	-	-	-	10
Витебская	20	12	9	3	-	1	8
Гомельская	15	15	11	1	2	1	-
Минская	22	11	6	5	-	1	11
Могилевская	21	14	13	1	-	-	7
Пинская	11	6	5	1	-	-	5
Полесская	17	14	11	2	-	1	3
ВСЕГО	195	96	75	14	3	4	99

И.о. Нач.Управления госгрудсберкасс и госкредита БССР - /ЧИШЕВИЧ/

ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 97

СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР

19 октября 1943 г. г.Москва

О восстановлении деятельности государственных трудовых сберегательных касс в районах Белорусской ССР, освобожденных от немецкой оккупации.

Совет Народных Комиссаров Белорусской ССР ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Обязать Наркомфин (тов.Котляров) и Управление госгрудсберкасс и госкредита БССР (тов.Чишевич) восстановить областные управления госгрудсберкасс и госкредита и подведомственные им центральные и районные государственные трудовые сберегательные кассы в районах, освобожденных от немецкой оккупации.

2. Предложить исполкомам областных, городских и районных советов депутатов трудящихся предоставить восстанавливаемым сберегательным кассам соответствующие помещения.

3. Обязать Наркомфин и Управление госгрудсберкасс и госкредита БССР обеспечить укомплектование аппарата и своевременный разворот работы сберкасс по обслуживанию населения в районах, освобожденных от немецкой оккупации.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР И.Бышинский

УПРАВЛЯЮЩИЙ ДЕЛАМИ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР С.Костик

Верно: /Чишевич/

Даведка аб эвакуіраваных ашчадных касах Беларускай ССР. 15 лютага 1942 г.

Пастанова Савета народных камісараў Беларускай ССР аб аднаўленні дзейнасці ашчадкас на вызваленых тэрыторыях рэспублікі, 1943 г.

> Савецкае кіраўніцтва не дапускала думкі, што вайна можа праходзіць на тэрыторыі СССР. Калі і былі распрацаваны планы дзеянняў на выпадак вайны ў адносінах да фінансава-крэдытных устаноў, то рэалізаваць іх амаль не ўдалося. Менш за ўсё атрымалася эвакуіраваць ашчадкас у прыгранічных абласцях БССР: у Беластоцкай з 23 кас эвакуіравалі 5, у Брэсцкай з 18 – 2. <


Лунинецкое Отд Госбанка
Квит. №14 3 Сентября 1944 г.
Принято от Кильчевской Вера
Антоновна Лунинец Широко-
песковая 20
марок германских
карбованцев 201
Двесте один
Кассир В.А.
Главбух

Лунинецкое Отделение Государственного Банка СССР
Лунінецкае Аддзяленне Дзяржаўнага Банка СССР

Даведка аб здачы нескарыстаных грошай-карбованцаў, якія былі ў абароце ў г. Лунінец, які ўваходзіў у выніку ваенна-адміністрацыйнага падзелу тэрыторыі Беларусі ў Рэйхскамісарыят «Украіна»



Аблігацыя 1-ай (1942 г.) і плакат 2-ой (1943 г.) дзяржаўных ваенных пазык


ПРИКАЗ
ПО ГЛАВНОМУ УПРАВЛЕНИЮ ГОСТРУДСБЕРКАСС И ГОСКРЕДИТА
от "5" октября 1943 г.
№ 396 о/к

Тов. БЕЛЯЦКОГО Антона Юрьевича назначить на должность исполняющего обязанности Начальника Гомельского Областного Управления Гострудсберкасс и госкредита БССР.

Зам. Начальника Главного Управления гострудсберкасс и госкредита (М. Фиалкин)

Верно: Нестеров

ВЫПИСКА ИЗ ПРИКАЗА
По Управлению Гострудсберкасс и Госкредита Белорусской ССР
№ 219 4 Июля 1944 г.
гор. Гомель

Начальника Гомельского Областного Управления Гострудсберкасс и Госкредита Тов. БЕЛЯЦКОГО Антона Юрьевича перевести на должность Начальника Брестского Обл. Управления Гострудсберкасс и Госкредита.

Начальник Управления Гострудсберкасс и Госкредита Белорусской ССР /Савков/

Верно: Секретарь

УПРАЎ... ПРАЦО... і ДЗЯРЖКРЭ... ...ЙНАЙ ССР | ...ГОСУДАРСТВЕННЫХ ...УДОВЫХ СБЕРЕГАТЕЛЬНЫХ КАСС И ГОСКРЕДИТА БЕЛОРУССКОЙ ССР

"4" июля 1944 г. На В/№
№ 10/к от "..." 194 г.

УДОСТОВЕРЕНИЕ.

Пред'явитель сего тов. БЕЛЯЦКИЙ Антон Юрьевич является Начальником Брестского Областного Управления Гострудсберкасс и Госкредита Белорусской ССР, что и удостоверяется.
Действительно по 1-е Января 1945 г.

Зам. Начальника Управления Гострудсберкасс и Госкредита БССР /Чишевич/

Нач. Отдела Кадров /Малев/

Выпіска з загада Упраўлення Дзяржпрацашчадкас і дзяржкрэдыту БССР аб пераводзе начальніка Гомельскага Аблупраўлення Дзяржпрацашчадкас Бяляцкага А.Ю. на пасаду начальніка Брэсцкага Аблупраўлення ад 4 ліпеня 1944 г. Да вызвалення г. Брэста заставалася яшчэ болей двух тыдняў, а ўжо былі прыняты захады аб аднаўленні работы фінансава-крэдытных устаноў.





Абаронцы і вызваліцелі Беларусі: партызаны (1942 г.), кадравыя ваенныя (1943 г.)





У вызваленым г. Мінску, 1944 г



ИСПЫТАНИЯ НА ПРОЧНОСТЬ

ДЛЯ КРЕДИТНЫХ, БАНКОВСКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ, СФОРМИРОВАВШИХСЯ НА белорусских землях, период социальных кризисов XX века стал периодом испытаний на прочность, на способность работать в экстремальных условиях, буквально — на выживаемость. В эти годы на территории Беларуси складывались обстоятельства исключительной сложности для банковской сферы. В частности, в условиях смены власти и в периоды военных действий происходило вынужденное включение региона в различные финансовые системы. В таких чрезвычайных условиях испытываются на прочность все элементы государственного устройства, проявляется истинное положение вещей в общественной организации. Необходимо засвидетельствовать — при обстоятельствах крайне переменчивых, трудно прогнозируемых, зачастую разрушительных, опасных для самой жизни — банковские работники проявили такие качества, как дисциплина, верность долгу, профессионализм и социальная ответственность. Сами местные банковские, кредитные организации доказали свою надежность, действенность, живучесть. Это ценный опыт, хотя и оплаченный слишком дорогой ценой.

В результате, из всех испытаний банковская система региона Беларуси вышла с честью, сумела сохранить работоспособность, и в кратчайшие сроки преодолеть кризисные явления.

STRESS TEST PERIOD

FOR CREDIT AND BANKING ORGANIZATIONS, FORMED ON THE BELARUSIAN LAND, a period of social crisis of the twentieth century was a period of strength test, test on the ability to work in extreme conditions, literally — survival test. In those years the circumstances on the territory of Belarus were the circumstances of exceptional difficulty for the banking sector. In particular, along with a change of government in times of hostilities, the region was incorporated in the different financial systems. Such extreme conditions tested the strength of all the elements of the state structure, manifested the true state of affairs in the social organization. It is necessary to admit, that in the circumstances which was extremely volatile and difficult to forecast, often destructive, threatening the life itself, bank employees showed such qualities as discipline, devotion to duty, professionalism and social responsibility. Local banks and credit organizations proved their reliability, effectiveness, survivability. This was a valuable experience, despite of too high price paid for it.

As a result of all the tests, the region's banking system survived to overcome the crisis as soon as possible.



КРЫШТАЛІЗАЦЫЯ РЭГІЯНАЛЬНАГА БАНКА

















Пераход на мірны стваральны шлях рэзка змяніў абставіны, умовы і характар працы Дзяржаўных працоўных ашчадных кас. Шэраг крыніц, за кошт якіх раней паступалі грашовыя сродкі насельніцтва ў сістэму, страціў сваё значэнне. Спачатку прыліў укладаў адбываўся дзякуючы росту сярэдняга памеру ўкладу, і ў меншай меры з прыцягненнем новых укладчыкаў. Паўстала неадкладная задача распрацоўкі новай стратэгіі дзейнасці.

АДНАЎЛЕННЕ ФІНАНСАВАЙ СІСТЭМЫ

У ПАСЛЯВАЕННЫ ЧАС НАЙБОЛЬШ АДЧУВАЛАСЯ КАДРАВАЯ ПРАБЛЕМА. Для яе вырашэння ў рэгіёне Беларусі ў 1945 г. быў адкрыты Навагрудскі фінансавы тэхнікум, які ўключаў два аддзяленні: па адшчаднай справе і дзяржкрэдыце.



Трактарыст Мінскай машынна-трактарнай станцыі Мінскага раёна падпісваецца на дзяржаўную пазыку развіцця народнай гаспадаркі СССР

Другой надзённай задачай было павелічэнне колькасці ўкладчыкаў. Важным ідэалагічным крокам у гэтым кірунку было выкананне абавязацельстваў дзяржавы перад трымальнікамі пазык, якія былі прыцягнутыя ў ваенны час. У 1946 г. жыхарам Беларусі было выплачана 3,7 млн. руб. выйгрышаў па дзяржаўных пазыках. Як следства, колькасць укладчыкаў у ашчадкасы ў 1946 г. павялічылася на 10%. Далей была ініцыяваная чарговая дзяржаўная пазыка – на аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі СССР, сярод насельніцтва БССР размешчаны аблігацыі пазыкі на суму 37,4 млн. руб.

Перабудова эканомікі краіны і дасягнутыя поспехі ў аднаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі далі магчымасць у 1947 г. правесці грашовую рэформу і адмяніць картачную сістэму забеспячэння насельніцтва прадуктамі і таварамі, якая існавала з пачатку вайны. Падчас грашовай рэформы была праведзена пераацэнка ўкладаў у ашчадных касах на вельмі льготных для асноўнай масы грамадзян умовах.

Грошы, якія былі на руках, абменьваліся ў суадносінах 1:10, а ўклады ў ашчадных касах — у суадносінах ад 1:1 да 2:1, у залежнасці ад памеру ўнёска. Грашовая рэформа ярка паказала, як выгадна захоўваць грошы ў ашчаднай касе. У выніку прыток укладаў насельніцтва і колькасць новых укладчыкаў сталі хутка расці.

З 1947 па 1951 гг. колькасць укладчыкаў у ашчадных касах БССР вырасла больш чым удвая, пры гэтым рэшта ўкладаў узрасла ў паўтара раза, да 37,2 млн. руб. Да гэтага часу значна павялічылася і сетка ашчадных кас, у асноўным за кошт адкрыцця агенцтваў у сельскай мясцовасці. Усяго сельскія касы складалі 2/3 ад агульнай колькасці ашчадных кас.

З 1947 г. пачала ажыццяўляцца канверсія ўнутраных пазык, уключаючы Дзяржаўную пазыку аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР (выпуск 1946 г.).

Абмен аблігацый рабіўся ў 1948 г. у суадносінах 3:1, г.зн. на больш ільготных умовах, чым абмен грошай. Аблігацыі ранейшых пазык, а таксама сведчанні ашчадных кас па спецыяльных укладах абменьваліся на аблігацыі канверсійнай 2-працэнтнай пазыкі 1948 г. Нароўні з канверсіяй масавых пазык была праведзена канверсія Дзяржаўнай выйгрышнай пазыкі 1938 г., якая свабодна абарочвалася. Ашчадкасы ажыццяўлялі вялікую працу па абслугоўванні пазыкатрымальнікаў і прыцягненні грашовых сродкаў насельніцтва ў новыя дзяржаўныя пазыкі. Сума размяшчэння аблігацый па 2-й, 3-й, 4-й і 5-й дзяржпазыцы аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР, выпушчаных у 1947—1950 гг., склала ў рэспубліцы 182,6 млн. руб. З 1944 па 1967 гг. ашчадкасамі БССР па выйгрышных і пагашаных аблігацыях дзяржпазык выплачана насельніцтву 187,5 млн. руб. У 1951—1957 гг. былі выпушчаны чарговыя 7 дзяржаўных пазык развіцця народнай гаспадаркі СССР, па якіх у рэспубліцы размешчана аблігацый на агульную суму 361,5 млн. руб.

У 1948 г. пастановай Савета Міністраў СССР быў зацверджаны новы Статут Дзяржаўных працоўных ашчадных кас, які адыграў вялікую ролю ў паляпшэнні арганізацыі працы сістэмы.

З 1955 г. ашчадкасам было загадана выплачваць працэнты па ўкладах насельніцтва (да запатрабавання, умоўных, на бягучыя рахункі – 2% гадавых, тэрміновых – 3%). Ашчадкасы пачалі выконваць пералічэнні ва ўклады грашовых сродкаў насельніцтва ў парадку безнаяўных разлікаў, што спрыяла росту ўкладаў і ўкладчыкаў.

З 1958 г. на ашчадкасы былі ўскладзены аперацыі па продажы білетаў грашова-рэчавых латарэй і выплаце выйгрышаў па іх, з мэтай павелічэння прыцягнутых у эканоміку сродкаў. У 1958–1969 гг. у рэспубліцы было прададзена білетаў грашова-рэчавай латарэі на суму 44,7 млн. руб. і выплачана насельніцтву выйгрышаў на суму 21 млн. руб.

БАЯВЫЯ ЗАДАЧЫ АШЧАДНЫХ КАС

Беларускі народ з першых дзён свайго вызвалення ўзяўся за аднаўленне народнай гаспадаркі, разбуранай нямецка-фашысцкімі акупантамі. Не пакладаючы рук, працуюць рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя, каб у найкарацейшы тэрмін залячыць раны, нанесеныя гітлераўскімі бандытамі.

Выдатным праяўленнем патрыятызма беларускага народа з'яўляецца яго актыўны ўдзел у аказанні дапамогі сваёй радзіме грашовымі сродкамі. Працоўныя аддаюць усе свае сілы і сродкі для хутчэйшага разгрому нямецкіх захопнікаў. Набываючы аблігацыі Дзяржаўнай ваеннай пазыкі, білеты чацвертай грашова-рэчавай латарэі, збіраючы сродкі ў фонд Чырвонай Арміі, насельніцтва БССР дало на патрэбы фронта дзесяткі мільёнаў рублёў.

За кароткі час працоўныя рэспублікі набылі аблігацый Другой і Трэцяй дзяржаўных ваенных пазык на суму звыш 140 мільёнаў рублёў. Па Магілеўскай вобласці за наяўны разлік набыта аблігацый на суму 30 мільёнаў рублёў. У Гомельскай вобласці паступленне наяўных грошай на набыццё аблігацый ваеннай пазыкі складае 28.571 тысячу рублёў.

З выключным поспехам прайшло распаўсюджанне білетаў чацвертай грашова-рэчавай латарэі. За два месяцы паступіла наяўных грошай за білеты звыш 50 мільёнаў рублёў. Працоўныя нашай сталіцы купілі білетаў на 4.265 тысяч рублёў, Працоўныя Гомельскай вобласці — на 5.549 тысяч рублёў, Баранавіцкай — на 4.587 тысяч рублёў, Брэсцкай—на 4.850 тысяч рублёў.

Пры актыўнай дапамозе партыйных і совецкіх арганізацый ва ўсіх гарадах і раённых цэнтрах рэспублікі адноўлены цэнтральныя і раённыя ашчадныя касы, якія прыступілі да работы. За 1944 год у ашчадных касах БССР астатак укладаў ад насельніцтва павялічыўся на 20.290 тысяч рублёў.

За кароткі час праведзена вялікая работа па абслугоўванню пазыкатрымальнікаў. За мінулы год ашчадныя касы выплацілі прыбыткаў пазыкатрымальнікам у выглядзе выйгрышаў 14.639 тысяч рублёў.

Зараз заканчваецца тэрмін аплаты падпіскі на Трэцюю дзяржаўную пазыку. У сувязі з гэтым перад фінансавымі органамі, ашчаднымі касамі, камісіямі садзейнасці дзяржкрэдыту і ашчаднай справе стаяць адказныя задачы. Трэба зараз-жа арганізаваць паўсямесную выверку разлікаў па пазыцы на прадпрыемствах, ва ўстановах, а таксама з кожным падпісчыкам асобна.

Камісіі садзейнасці дзяржкрэдыту і ашчаднай справе павінны ўстанавіць кантроль за тым, каб усім падпісчыкам былі ўручаны аплочаныя імі аблігацыі адначасова з выплатай заработнай платы за другую палавіну лютага 1945 года.

Наступная важная задача — арганізацыя даведачных сталоў на ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах, сельсоветах і калгасах для праверкі выйгрышаў па аблігацыях. Павінны быць створаны такія ўмовы, каб кожны пазыкатрымальнік з найменшай затратай часу змог праверыць свае аблігацыі.

Неабходна шырока разгарнуць растлумачальную работу сярод насельніцтва аб выгадзе хавання ў ашчадных касах сваіх зберажэнняў. Працоўныя павінны ведаць прызначэнне і задачы ашчадных кас, асабліва ва ўмовах вялікай Айчыннай вайны, правы і перавагі ўкладчыкаў. Трэба шырока папулярызаваць усе віды ўкладаў у ашчадныя касы.

Асабліва трэба звярнуць увагу на новы від укладаў, уведзены ў часе Айчыннай вайны,—на выйгрышныя ўклады, прыём якіх ніякімі тэрмінамі не абмяжоўваецца і выплата па ўкладу прыбыткаў робіцца ў выглядзе выйгрышаў. Тыражы выйгрышаў гэтых укладаў праводзяцца два разы ў год.

Трэба растлумачыць кожнаму працоўнаму, што хаванне грашовых сродкаў у ашчадных касах дапаможа хутчэй пабеданосна закончыць вайну, дабіць фашысцкага звера ў яго ўласнай бярлозе, хутчэй аднавіць разбураную народную гаспадарку. Работнікі фінансавых органаў, ашчадных кас і камісій садзейнасці дзяржкрэдыту і ашчаднай справе, пры дапамозе партыйных і совецкіх арганізацый, павінны справіцца з пастаўленымі перад імі задачамі і стварыць умовы для яшчэ большага прытоку свабодных сродкаў ад насельніцтва для поўнага разгрому ворага.

М. ЧЫШЭВІЧ,
начальнік Упраўлення дзяржашчадкас і дзяржкрэдыта Беларускай ССР.

Артыкул з газеты «Звязда», № 33 ад 18 лютага 1945 г.



Перадача прафесійнага вопыту: супрацоўнікі ашчадкасы ў г. Гродна, 1947 г.



Транспарант аб пачатку падпіскі на 2-ю дзяржаўную пазыку на аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі СССР на будынку Цэнтральнай ашчаднай касы ў г. Віцебску, 1947 г.



Дзяржаўныя казначэйскія білеты СССР у 3 руб. ўзору 1938 г.



Дзяржаўныя казначэйскія білеты СССР у 3 руб. ўзору 1947 г. (паслярэформенны)



Аблігацыя дзяржаўнай пазыкі 1953 г. на развіццё народнай гаспадаркі СССР



Будынак ашчадкасы ў г. Мінску з плакатам аб налічэнні працэнтаў па тэрміновых укладах, 1955 г.

АШЧАДНЫЯ КАСЫ: НОВАЯ ЯКАСЦЬ

У 1961 Г. У СССР БЫЛА ПРАВЕДЗЕНА ЧАРГОВАЯ ГРАШОВАЯ РЭФОРМА. У РАМКАХ рэформы ўсе ўклады насельніцтва ў ашчадных касах, уключаючы прылічаныя працэнты, а таксама намінальны кошт аблігацый дзяржаўных пазык, былі пералічаныя ў суадносінах 10:1. Прыцягнутыя ў якасці ўкладаў сродкі насельніцтва ўсё больш актыўна выкарыстоўваліся для крэдытавання народнай гаспадаркі. Былі зацверджаны Асновы грамадзянскага заканадаўства, якія стваралі прававую базу для развіцця ашчаднай справы ў краіне.

Пастановай Савета Міністраў СССР ад 4 кастрычніка 1962 г. № 1061 дзяржаўныя працоўныя ашчадныя касы былі перададзены ў распараджэнне Дзяржбанка. Ашчадныя касы, па сутнасці, здабылі якасць банкаўскіх устаноў, іх функцыі істотна пашырыліся. З 1963 г. пачалі здзяйсняцца аперацыі па прыёме ад насельніцтва плацяжоў за камунальныя і іншыя паслугі (шляхам аб'яднання прыходных кас Дзяржбанка з ашчадкасамі). У сувязі з гэтым аб'ём працы ашчадных кас узрос больш чым у 3 разы. Ашчадкасы таксама прыцягваліся да прыёму падатковых, страхавых і іншых плацяжоў насельніцтва. Сур'ёзная ўвага была звернута на развіццё безнаяўных пералічэнняў. Толькі за 1963 г. іх сума ўзрасла на 20%.

Вялікае значэнне развіццю ашчаднай справы надаваў урад рэспублікі. У 1960-я гады Савет Міністраў БССР двойчы разглядаў пытанні, якія тычацца ўдасканалення дзейнасці ашчадных кас. У рэспубліцы рэгулярна праводзіліся конкурсы, дзе заахвочваліся лепшыя па прафесіі спецыялісты, лепшыя працоўныя калектывы. Палепшылася тэхнічнае забеспячэнне працы ашчадных кас. За 1960-я гады парк падліковых машын у іх павялічыўся ў 3 разы, да 1970 г. была завершана механізацыя асноўных участкаў лічыльнай работы, пачаліся распрацоўкі па яе аўтаматызацыі.

Пасведчанне начальніка Аблупраўлення Дзяржпрацашчадкас Бяляцкага А.Ю. ад 9 студзеня 1959 г.



Пашырылася сетка ашчадных кас, да пачатку 1970 г. іх колькасць у Беларусі складала 3086, лік укладчыкаў да канца 1971 г. перавысіў 2,6 мільёна чалавек, што складала амаль трэць насельніцтва рэспублікі.

У 1970 годзе ў Беларусі пачала асвойвацца выдача заработнай платы ў ашчадных касах. Да 1976 г. ашчадкасы забяспечылі выдачу зараплаты больш за палову рабочым і служачым прамысловасці, 1/3 ў будаўніцтве і 2/3 на транспарце.

Да пачатку 1970-х гадоў ашчадныя ўстановы ў СССР прымалі ад насельніцтва, па сутнасці, два віды ўкладаў: да запатрабавання і тэрміновыя. Гэта было звязана з тым, што доўгі час зберажэнні ў краіне мабілізаваліся ў цэнтралізаваныя фонды на крэдытаванне народнай гаспадаркі. Пры гэтым уласныя інтарэсы ўкладчыкаў мала ўлічваліся. Галоўным стымулам да таго, каб разнастаіць формы ўнёскаў, з'явілася ў той час пагроза зніжэння зацікаўленасці насельніцтва рабіць зберажэнні ў арганізаваных формах наогул і на працяглыя тэрміны ў асаблівасці.

Паляпшэнні насілі толькі частковы характар. Напрыклад, уведзены ў шэрагу краёў і абласцей так званы ўклад на адзіную ашчадную кніжку з'яўляўся разнавіднасцю ўкладу да запатрабавання. Розніца складалася ў тым, што ўладальнік адзінай ашчаднай кніжкі мог уносіць і атрымліваць сродкі з укладу ў любой ашчаднай касе ў межах раёна яе дзеяння. Новыя віды ўкладаў — тэрміновыя з дадатковымі ўзносамі, маладзёжна-прэміяльныя і грашова-рэчавыя выйгрышныя — былі распрацаваныя і ўведзеныя толькі ў 1984 г.

Аперацыйная зала ашчадкасы ў г. Мінску з элементамі аўтаматызацыі рабочых месцаў, 1970 г.



У 1972 г. у адпаведнасці з пастановай урада сістэма ашчадных кас перайшла на гаспадарчы разлік (разам з самаакупнасцю). Даходы складваліся за кошт працэнтаў, што выплачваліся Дзяржбанкам па сродках, якія захоўваюцца на рахунках, камісійнага ўзнагароджання за аперацыі па абслугоўванні арганізацый і насельніцтва, а таксама сродкаў, якія кампенсуюцца з бюджэту па дзяржаўных пазыках і грашова-рэчавай латарэі. За кошт прыбытку ашчадных кас быў утвораны фонд развіцця ашчаднай справы (прызначаны для будаўніцтва і абсталявання памяшканняў і грашовых камор ашчадных кас, механізацыі іх працы, набыцця абсталявання, інвентару, сродкаў транспарту і інш.), а таксама фонд жыллёвага будаўніцтва і матэрыяльнага ўзнагароджання.

Была распрацавана перспектыўная праграма па пашырэнні функцый ашчадных кас. Прыняты меры да больш шырокага развіцця пералічэнняў сум грашовых даходаў працоўных на рахункі па ўкладах, укараненні безнаяўных разлікаў па плацяжах насельніцтва на карысць прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, пашырэнні пераводных і акрэдытыўных аперацый. Уведзены разліковыя чэкі ашчадных кас для аплаты грамадзянамі тавараў доўгатэрміновага карыстання. Ашчадкасы сталі прыцягвацца да шэрагу новых аперацый: да прыёму плацяжоў насельніцтва, у тым ліку за тавары, набытыя ў крэдыт, за пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку, да выплаты грамадзянам страхавых і іншых сум; да прыёму грашовай выручкі ад гандлёвых і іншых арганізацый і выдачы наяўных грошай на заработную плату і на іншыя расходы арганізацыям з невялікім фондам зарплаты, а таксама прадпрыемствам і калгасам па даручэннях Дзяржбанка.

У 1977 г. Савет Міністраў СССР зацвердзіў новы Статут ашчадных кас, у якім атрымалі адлюстраванне ўсе змены ў іх дзейнасці, якія адбыліся за мінулыя гады, у арганізацыйнай пабудове, аб'ёме і характары выкананых функцый. У адпаведнасці з гэтым дакументам ашчадныя касы вызначаліся як «адзіная агульнасаюзная крэдытная ўстанова, якая карыстаецца правамі юрыдычнай асобы і дзейнічае па прынцыпах гаспадарчага разліку». Узначальвала працу праўленне, склад якога зацвярджаўся ўрадам па прадстаўленні праўлення Дзяржбанка, на якое ўскладалася агульнае кіраўніцтва дзейнасцю ашчадных кас.

У саюзных і аўтаномных рэспубліках, уключаючы БССР, утвараліся рэспубліканскія ўпраўленні ашчадных кас, а таксама іерархічныя ўпраўленні, якія непасрэдна кіравалі і кантралявалі працу цэнтральных ашчадных кас. Апошнія, у сваю чаргу, кіравалі падсправаздачнай ім сеткай нізавых ашчадных кас і агенцтваў, якія ствараліся пры прадпрыемствах сувязі (звыш 3/4 усіх агенцтваў) і ўстановах. Аснову ўсёй сістэмы складалі цэнтральныя ашчадкасы, кожная з якіх надзялялася правам распараджацца адкрытым ва ўстанове Дзяржбанка рахункам, набываць маёмасць, здзяйсняць неабходныя здзелкі, весці справы ў судзе і арбітражы, вырашаць пытанні кадраў.

Новы Статут вызначаў задачы ашчадных кас у цэлым, іх правы, формы ўладкавання і кіравання, крыніцы адукацыі і парадак выкарыстання сродкаў, прадугледжваў пералік аперацый, якія выконваюцца ашчадкасамі, і ўсталёўваў асноўныя нормы, што рэгулююць іх узаемаадносіны з насельніцтвам і іншымі ўстановамі. Асноўная задача ашчадных кас вызначалася як прадастаўленне насельніцтву магчымасці надзейнага захоўвання свабодных грашовых сродкаў, здзяйсненне грашовых разлікаў, садзейнічанне назапашвання грашовых зберажэнняў з мэтамі іх выкарыстання ў інтарэсах развіцця народнай гаспадаркі СССР, а таксама ажыццяўленне разлікова-касавага абслугоўвання насельніцтва, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

У 1980-я гады ў савецкай эканоміцы выразна выяўляліся крызісныя з'явы. Сусветны вопыт падказваў, што ашчадныя ўстановы ўсіх узроўняў неабходна вывесці з непасрэднага падпарадкавання Дзяржаўнаму банку, а асацыяваным ашчадкасам варта даць магчымасць развівацца ў камерцыйныя банкі.

Сустрэча з маладымі спецыялістамі ветэранаў ашчаднай справы Гродзенскай вобласці, 1973 г.











На календары – 1972 год





РАСЧЕТНАЯ КНИЖКА ПО ТЕКУЩЕМУ СЧЕТУ

РОЗРАХУНКОВА КНИЖКА ПО ПОТОЧНОМУ РАХУНКУ • РАЗЛИКОВА КНИЖКА ПА БЯГУЧАМУ РАХУНКУ • МОРИЙ ҲИСОБ ДЎЙНИЧА РАСЧЁТ ДАФТАРЧАСИ • АГЫМДАГЫ ЕСЕП-ХИСАПТЫҢ ЕСЕП АЙЫРЫСУ КІТАПШАСЫ • ЖОРҒОБОБАЛ ЭБЭЭЛЭЭЛЭЭБ ЬЭЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬ ҮӨЬЭЭЬЭЭ • ЧАРИ ҲЕСАБ ҲЭРӨ ЬАГГ-ВЕСАБ КИТАБЧАСЫ EINAMOSIOS SĄSKAITOS ATSISKAITYMO KNYGELĖ • КЭРТИЧКА ДЕ ПЛАТЭ НЕ КОНТУЛ КУРЕНТ • ТЕКОШ ҲЕҚИМА КОНЁҚИНУ GRĀMATIŅA • АГЫМДАГЫ СЧЁТ БОЮНЧА РАСЧЁТ КНИЖКАСЫ • ДАФТАРЧАИ ҲИСОББАРОБАРКУНИИ СЧЁТИ ЧОРӢ ҒЭӨӨЬЭЭЬ ҰЬЭЭЬ ҰЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬ • ТЕКУЩИЙ СЧЕТ БОЮНЧА ҲАСАПЛАШЫҚ КИТАПЧАСЫ • JOOKSVA ARVE ARVELDUSRAAMAT

...тах в государственных кассах

...тся чековая книжка. При выдаче чековой ...а простывает номер ...берегательной кассы.

...ваются в расчетную ... при взносе денег в ...ку, внесшему вклад,

...изводится по чекам. ...илия, имя и отчество

...а предъявителя.

...нсью (за исключением ...казано место выдачи ...ло, месяц (прописью) ...ен чернилами и под- ...тексте чека не допу-

...тний", сберегательная ... наличные деньги, а ...чета на счет. Если к ...счета, то сберегатель- ... лишь на указанный

...в течение 10 дней со ...счет не принимается). ...чека падет на нера- ...бним днем срока счи-

...книжки ему выдается

5. При утрате чека или чековой книжки вкладчик должен немедленно заявить об этом сберегательной кассе.

МИНИСТЕРСТВО ФИНАНСОВ СССР

ГОСУДАРСТВЕННАЯ ТРУДОВАЯ СБЕРЕГАТЕЛЬНАЯ КАССА №

Текущий счет №

(фамилия, имя, отчество или наименование организации)

Заведующий Сберегательной кассой

ЗАВЕЩАТЕЛЬНОЕ РАСПОРЯЖЕНИЕ

„ . 19 г. (подпись вкладчика)

Контролер

ОБРАЗЕЦ

СБЕРЕГАТЕЛЬНАЯ КНИЖКА

ОЩАДНА КНИЖКА • АШЧАДНАЯ КНІЖКА ОМОНАТ ДАФТАРЧАСИ • САҚТЫҚ КІТАПШАСЫ ЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬ ҮӨЬЭЭЬЭЭ • ЭМАНЭТ КИТАБЧАСЫ TAUPOMOJI KNYGELĖ • КЭРТИЧКА КАСЕЙ ДЕ ПЭСТРАРЕ KRĀJKASES GRĀMATIŅA • САКТЫК КНИЖКАСЫ ДАФТАРЧАИ АМОНАТӢ • ЬЪЦЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬ ҒГГӨЬЭЭЬ АМАНАТ КИТАПЧАСЫ • HOIUIAAMAT

СБЕРЕГАТЕЛЬНЫЙ БАНК СССР

Филиал № 8006/0190 Первомайского отделения г. Минска

в (город, край, область, республика)

Счет № 07500 1188

Дятенова Анна Станиславовна

(фамилия, имя и отчество вкладчика)

Зав. филиалом

Контролер (оператор)

М. П.

Толя.

АШЧАДНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

СБЕРБАНК СССР Филиал № 8006/0190 Первомайского отделения г. Минска

Аддзяленне ў (горад, вобласць, вуліца, нумар дома)

Рахунак № 03000027

Барсенкова Янина Станіславаўна

(прозвішча, імя і імя па бацьку ўкладчыка)

(від укладу)

М. П. 610/9008

Загадчык (кантралёр)

190

АШЧАДНАЯ КНІЖКА

ПРАВА:

Рахунак № 03000027

ДАТА	ПРЫХОД	РАСХОД	АСТАТАК	ПОДПІСЫ
29.VI 93	30000 г		30000 г	

228

СБЕРЕГАТЕЛЬНАЯ КНИЖКА

ОЩАДНА КНИЖКА • АШЧАДНАЯ КНІЖКА ОМОНАТ ДАФТАРЧАСИ • САҚТЫҚ КІТАПШАСЫ ЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬ ҮӨЬЭЭЬЭЭ • ЭМАНЭТ КИТАБЧАСЫ TAUPOMOJI KNYGELĖ • КЭРТИЧКА КАСЕЙ ДЕ ПЭСТРАРЕ KRĀJKASES GRĀMATIŅA • САКТЫК КНИЖКАСЫ ДАФТАРЧАИ АМОНАТӢ • ЬЪЦЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬЭЭЬ ҒГГӨЬЭЭЬ АМАНАТ КИТАПЧАСЫ • HOIUIAAMAT

Трол 2 401. 5743 – 1646–53 СЧЕТ № 0117 3

19 61 1960	ОПЕРАЦИЯ	ПРИХОД Руб.	К.	РАСХОД Руб.	К.	ОСТАТОК (цифрами) Руб.	К.	Подписи
1	Перевод					10.640 44		Контролер Кассир
2/3	остаток прописью	646 44				11.286 88		Контролер Кассир
3	остаток прописью	334 93				11.604 81		Контролер Кассир
						11.160 44		Контролер Кассир
						10 539 52		Контролер Кассир
						10 539 52		Контролер Кассир
						10 539 52		Контролер Кассир
						10 521-85		Контролер Кассир

Взнос

МИНИСТЕРСТВО ФИНАНСОВ СССР

ГОСУДАРСТВЕННАЯ ТРУДОВАЯ СБЕРЕГАТЕЛЬНАЯ КАССА № г. Минска

В 03000259

Счет № 0117

Болсенкова Янина Станиславовна

(фамилия, имя, отчество)

Заведующий Сберегательной кассой

УСЛОВИЕ ИЛИ ЗАВЕЩАТЕЛЬНОЕ РАСПОРЯЖЕНИЕ

. 19 г. (подпись вкладчика)

Контролер

Сбер. банк 7459/0228

АШЧАДНАЯ КАСА №16

У АДПАВЕДНАСЦІ З ПАСТАНОВАЙ СНК СССР АД 26 СНЕЖНЯ 1922 Г. Ў Г. МІНСКУ 23 мая 1923 года была адкрыта першая ашчадная каса №16, якая фактычна ажыццяўляла кіраванне і кантроль за развіццём ашчаднай справы ў рэспубліцы.

У студзені 1930 г. на базе Галоўнай дзяржаўнай працоўнай ашчаднай касы №16 пры Наркамфіне БССР было створана Рэспубліканскае кіраванне дзяржаўнымі працоўнымі ашчаднымі касамі. У яго апарат былі пераведзеныя найбольш вопытныя работнікі Галоўнай ашчадкасы №16. Яе кіраўнік А.Я. Падольскі быў прызначаны начальнікам рэспубліканскага кіравання.

Аб першых кіраўніках Падольскім, Дабравольскім і Варшаўскім захавалася вельмі мала звестак. Так, былы загадчык Мінскай Гарадской ашчаднай касай №16 А.М. Коваль у сваіх успамінах пісаў: «Дабравольскі быў чалавекам сярэдніх гадоў, удзельнік грамадзянскай вайны, былы палітработнік або камісар, чалавек просты і душэўны... Мне ён запомніўся як прадстаўнік партыі ў фінансавым апараце. Варшаўскі быў з рабочых гарбарнага завода «Бальшавік». Завод «Бальшавік» наогул быў пастаўшчыком кадраў у сістэму ашчадных кас БССР. Варшаўскі быў маладым, але ён умеў падбіраць добрых работнікаў, якім даверяў, заахвочваў праяўляць ініцыятыву ў працы».



Будынак ашчадкасы №16, старэйшай ашчадкасы ў г. Мінску (з 1923 г.), 1966 г.

Падольскі працаваў начальнікам рэспубліканскага кіравання першую палову 1930 г., а затым другую палову года на гэтай пасадзе знаходзіўся Дабравольскі. З 1931 па 1932 гг. рэспубліканскае ўпраўленне ўзначальвала Дора Ісакаўна Захарава, з 1931 па 1933-ы – Барыс Міхайлавіч Саўка. З верасня 1933 па ліпень 1934 г. на гэтай пасадзе працаваў С.Ю. Варшаўскі. З кастрычніка 1934 па кастрычнік 1937 г. зноў начальнікам упраўлення быў Б.М. Саўка. З кастрычніка 1937 па верасень 1939-га кіраванне ўзначальваў Уладзімір Мацвеевіч Іваноў. У 1939 г. ён быў адкліканы на кіруючую партыйную працу, а ў 1941-м прызваны ў Чырвоную Армію, загінуў на фронце. З верасня 1939 і па 22 чэрвеня 1941 г. начальнікам упраўлення з'яўляўся Мікіта Аляксеевіч Касцюковіч.

КІРАЎНІЦТВА ЎСТАНОЎ, ПЕРАЕМНІКАМ ЯКІХ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ААТ «ААБ БЕЛАРУСБАНК»:

КІРАЎНІКІ ГАЛОЎНАЙ АШЧАДНАЙ КАСЫ №16

Высакінскі – 1924 г.
Казакевіч – 1925–1927 гг.
Барташэвіч – 1927–1929 гг.

КІРАЎНІКІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ДЗЯРЖПРАЦАШЧАДКАС БССР

Падольскі Аркадзь Яфімавіч – 1929–1930 гг.
Дабравольскі – 1930–1931 гг.
Захарава Дора Ісакаўна – 1931–1932 гг.
Варшаўскі Станіслаў Юльянавіч – 1933–1934 гг.
Іваноў Уладзімір Мацвеевіч – 1937–1939 гг.
Чышэвіч Мар'ян Валяр'янавіч – 1941–1943, 1945–1947 гг.
Саўка Барыс Міхайлавіч – 1932–1933, 1934–1937, 1943–1945 гг.
Касцюковіч Мікіта Аляксеевіч – 1939–1941, 1947–1970 гг.
Лузгін Уладзімір Фёдаравіч – 1970–1992 гг.
Хілько Уладзімір Дзмітрыевіч – 1993–1995 гг.

КІРАЎНІКІ ААТ «ААБ БЕЛАРУСБАНК»

Віннікава Тамара Дзмітрыеўна – 1995–1996 гг.
Ермакова Надзея Андрэеўна – 1996–2011 гг.
Пісарык Сяргей Паўлавіч – 2011–2016 гг.
Ананіч Віктар Міхайлавіч – з 23 сакавіка 2017 г. – па цяп. час

Музей ААТ «ААБ Беларусбанк» клапатліва захоўвае гісторыю стварэння банка. За кожным імем свая старонка памяці.



Арыфмометр ВК-1, СССР (выпускаўся з 1953 г., больш за 20 гадоў)



Лічыльная машынка «Фелікс», СССР (выпускалася з 1929 г., амаль 50 гадоў)

АШЧАДНЫ БАНК

У 1987 Г. У СССР БЫЛА ПРАВЕДЗЕНА БАНКАЎСКАЯ РЭФОРМА, У ВЫНІКУ ЯКОЙ Дзяржаўныя працоўныя ашчадныя касы былі ператвораныя ў Ашчадны банк СССР. Да пачатку 1988 года ў яго сістэму ўваходзілі 15 рэспубліканскіх банкаў СССР, у тым ліку і Ашчадны банк Беларускай ССР.

У 1990 г. пастановай Вярхоўнага савета РСФСР расійскі рэспубліканскі банк Ашчаднага банка СССР быў абвешчаны ўласнасцю Расіі. Гэта азначала, што ашчадныя банкі саюзных рэспублік павінны былі пачаць працаваць на ўмовах поўнага дзяржразліку (самаакупнасці), самастойна распараджацца прыцягнутымі сродкамі, але разам з тым дзейнічаць у рамках адзіных агульнасаюзных патрабаванняў і ўдзелу крэдытнымі рэсурсамі ў стварэнні абавязковых рэзерваў Дзяржбанка СССР. Тым не менш, некаторы час здзяйсняліся спробы захаваць адзіную сістэму Ашчадбанка з выразным размежаваннем функцый і кампетэнцыі цэнтра і банкаў саюзных рэспублік. Асабліва падкрэслівалася, што Ашчадны банк не павінен губляць статусу дзяржаўнага банка, паколькі дзяржава з'яўлялася гарантам захаванасці ўкладаў. Аднак, далейшае развіццё сітуацыі ў велізарнай краіне, ахопленай палітычным і эканамічным крызісам, галапіруючай інфляцыяй, зрабіла немагчымым захаванне адзінства не толькі Ашчадбанка СССР, але і самога СССР.

У канцы 1991 г. Рэспубліка Беларусь вылучылася з распалага Саюза, у той час як Ашчадныя банкі рэспублік ужо больш за год працавалі ў аўтаномных умовах. У краіне сталі ствараццца банкаўскія арганізацыі розных тыпаў і формаў уласнасці. Сярод іх — Акцыянерны камерцыйны банк «Беларусбанк», заснаваны ў 1991 г.

Ашчадбанк БССР быў ператвораны ў Ашчадны банк Рэспублікі Беларусь. Ён самастойна вызначаў парадак правядзення дэпазітных і пазыковых аперацый, працэнтныя стаўкі і ўмовы выдачы крэдытаў, ажыццяўляў тэхнічную мадэрнізацыю. У 1992 г. у Ашчадбанку была створана першая лакальная вылічальная сетка на 30 працоўных месцаў, распрацоўвалася спецыялізаванае праграмнае забеспячэнне. З 1994 г. установы Ашчадбанка прыступілі да комплекснага абслугоўвання суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці, у першую чаргу малога і сярэдняга бізнесу.

Загад №10 Ашчаднага банка СССР аб стварэнні рэспубліканскіх банкаў у саюзных рэспубліках, АССР, краявых, абласных, аўтаномных абласцей, акруговых і гарадскіх упраўленняў, гарадскіх і раённых аддзяленняў, філіялаў і агенцтваў Ашчаднага банка СССР ад 8 кастрычніка 1987 г.

БАНК ТРУДОВЫХ СБЕРЕЖЕ
И КРЕДИТОВАНИЯ НАСЕЛЕНИ
(Сберегательный банк СССР

ПРИКАЗ

8 октября 1987 г.

Москва

Об образовании республиканских банков в союзных республиках, республиканских (АССР), краевых, областных, областных (автономных областей), окружных и городских управлений, городских и районных отделений, филиалов и агентств Сберегательного банка СССР

Во исполнение постановления ЦК КПСС и Совета Министров СССР от 17 июля 1987 г. № 821 "О совершенствовании системы банков в стране и усилении их воздействия на повышение эффективности экономики", а также постановления Совета Министров СССР от 6 октября 1987 г. № 1118 "О перестройке деятельности и организационной структуре банков СССР",

ПРИКАЗЫВАЮ:

1. Образовать в столицах союзных республик республиканские банки Сберегательного банка СССР:

Российский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Украинский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Белорусский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Узбекский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Казахский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Грузинский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Азербайджанский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Литовский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Молдавский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Латвийский республиканский банк Сберегательного банка СССР

Киргизский республиканский банк Сберегательного банка СССР

ПРОТОКОЛ № 5

ЗАСЕДАНИЯ

Совета Сберегательного банка СССР

от 24 декабря 1991 г.

Председательствовал - т.Хоркин В.А.

Присутствовали:

Члены Совета: тт.Баймухаммедов Б., Булгак К.А., Жихарев П.И., Ибраев К., Колбаев В.П., Колесников А.А., Лузгин В.Ф., Никонов А Соловов В.И., Хоркин В.А., Штарев С.С.

Руководители сберегательных банков суверенных республик и государств - тт.Бабаев А.А., Марьясова Т.Н., Симонян Р.Г.

От управлений Сбербанка СССР - тт.Майборода Н.Ф., Новиков А.Н., Одинцов В.К., Коротков В.В., Самохин В.М.

О прекращении деятельности Сбербанка СССР

тт.Соловов,Лузгин,Жихарев, Хоркин,Новиков,Колбаев, Булгак,Колесников,Баймухаммедов

I. В связи с тем, что Устав Сбербанка СССР фактически утратил силу, признать целесообразным прекратить деятельность Сбербанка СССР с I января 1992 г.

Правлению Сбербанка СССР обеспечить проведение необходимых мероприятий по ликвидации центрального аппарата Сбербанка СССР в соответствии с действующим законодательством Российской Федерации. Просить Сбербанк РСФСР оказать помощь Правлению Сбербанка СССР в трудоустройстве сотрудников Сбербанка СССР.

2. В целях бесперебойного обслуживания населения и осуществления взаиморасчетов между бюджетами и сберегательными банками суверенных государств по государственным ценным бумагам согласиться с предложением т.Жихарева П.И. о передаче функций по управлению части государственного внутреннего долга, включающую облигации целевых беспроцентных займов 1990 года, облигации государственного внутреннего выигрышного займа 1982 года и казначейские обязательства СССР, Сберегательному банку РСФСР.

Пратакол №5 пасяджання Рады Ашчаднага банка СССР ад 24 снежня 1991 г. аб спыненні дзейнасці Ашчадбанка СССР


Приказ 175 (3)
По центрсберкассе № 6425 Поставского
от 16 января 1957 г. № 175 г. Поставы
Сего числа вступил в должность
заведующего центрсберкассой № 6425.
Основание: Приказ Областного Управле-
ния Гострудсберкасс и Госкредита
от 16 января 1957 года № 12
Зав. ЦСК № 6425 /Лузгин/

УЛАДЗІМІР ФЁДАРАВІЧ ЛУЗГІН,
у 1970–1992 гг. узначальваў Беларускае ўпраўленне Ашчаднага банка СССР, якое ў 1991 г. было рэарганізавана ў Ашчадны банк Рэспублікі Беларусь



— На працягу ўсяго гістарычнага існавання Ашчадны банк атаясамліваўся ў людзей з «народным» банкам – банкам, які заўсёды служыў рэалізацыі іх жыццёвых і эканамічных патрэб. Разам з тым Банк з'яўляўся адным з вядучых інстытутаў фінансава-крэдытнай сістэмы дзяржавы, прымаў актыўны ўдзел у рэгуляваніі наяўна-грашовага абароту, фарміраванні яго крэдытных рэсурсаў.

Мне давялося працаваць на розных кіруючых пасадах ў сістэме Ашчадбанка рэспублікі – у Паставах, Маладзечна, Гродна, а затым і ў сталіцы.

Заўсёды жыў з пачуццём вялікай адказнасці перад дзяржавай, якая даверыла табе вельмі значныя сумы грошай. Ставячы подпіс пад плацежнымі дакументамі, я дасканала іх вывучаў, правяраў, ці правільна яны складзены. Гэта асаблівая адказнасць за свае дзеянні.

Нашы крэдытныя ўстановы, а значыць, і мы, работнікі, выступалі пасрэднікамі, гарантамі ў адносінах паміж насельніцтвам і дзяржавай, з годнасцю прадстаўлялі інтарэсы абодвух бакоў. Людзі нам аказвалі давер, і мы гэтым ганарыліся.

Прыемна ўсведамляць, што лепшыя гады майго жыцця былі звязаны з гэтым Банкам, які і сёння захоўвае і прымнажае лепшыя традыцыі.


Приказ
по Центрсберкассе № 6425 Поставского района
от 26 апреля 1959 г. № 49 гор. Поставы
Сего числа считать убывшим заведующего ЦСК № 6425
Лузгина В.Ф. в распоряжение Областного Управления
Сберкасс.
Временное исполнение обязанностей заведующего
центральной сберегательной кассой № 6425 Поставского
района возлагается на инспектора ЦСК Асененко
Основание: приказ Облуправления № 66
от 20 апреля 1959 года.
и о Зав Центрсберкассой
Поставского района
/. Асененко


АССОЦИАЦИЯ БЕЛОРУССКИХ БАНКОВ
СВИДЕТЕЛЬСТВО
ОАО "Сберегательный банк "Беларусбанк"
является членом Ассоциации белорусских банков с 01.11.1990 г.
Регистрационный № 001
Председатель Чернявский Ф. И.
г. Минск

КРИСТАЛЛИЗАЦИЯ РЕГИОНАЛЬНОГО БАНКА

КРИСТАЛЛИЗАЦИЯ БАНКА В РЕГИОНЕ БЕЛАРУСИ ПРОИСХОДИЛА В ПРОЦЕССЕ работ по радикальному преобразованию системы сберегательных касс. Первоочередной задачей послевоенного времени было обновление и пополнение кадрового состава. Государство обеспечило выплаты населению по займам военного времени, что стимулировало проведение через сберкассы новых многократных масштабных займов – на восстановление и развитие народного хозяйства. Денежные реформы 1947 и 1961 гг. были выполнены таким образом, чтобы подчеркнуть привлекательность хранения сбережений населения именно в сберкассах. В результате количество вкладчиков (а также сберкасс) стремительно и неуклонно возрастало, становясь всеобъемлющим.

В 1948, 1977 гг. утверждались новые редакции Устава Государственных трудовых сберегательных касс. С 1955 г. начали начисляться проценты по вкладам, осваивались безналичные расчеты. Постоянно расширялся спектр услуг и платежей, производимых сберкассами: обслуживание денежно-вещевых лотерей (с 1958 г.), прием платежей коммунальных, налоговых, страховых и др. (с 1963 г.), выдача заработной платы (с 1970 г.).

В 1963 г. сберкассы были объеденены с приходными кассами Госбанка. К 1970 г. была обеспечена механизация основных участков счетной работы. В начале 1970-х гг. разрабатывалась перспективная программа развития Сберкасс. С 1972 г. система сберегательных касс перешла на хозрасчет. С 1984 г. начал расширяться перечень вкладов от населения, существенно возросли безналичные расчеты, осваивались новые формы платежей с предприятиями и населением по поручениям Госбанка.

В 1987 г. Государственные трудовые сберегательные кассы были реорганизованы в Сберегательный банк СССР, в структуре которого был представлен и Сберегательный банк Белорусской ССР. С 1990 г. республиканские Сбербанки стали работать в условиях полного хозрасчета, т.е. была осуществлена автономизация региональных банков. После распада СССР в 1991 г. Сбербанк БССР был реорганизован в «Акционерный Сберегательный банк Республики Беларусь» («АСБ РБ»), начали создаваться коммерческие банки, в том числе Акционерный коммерческий банк «Беларусбанк». В результате его слияния с «АСБ РБ» в 1995 г. был создан «Акционерный Сберегательный банк Беларусбанк». Под новым названием был представлен полноценный, опытный, квалифицированный региональный банк, максимально интегрированный в финансовые процессы региона.

CRYSTALLIZATION OF REGIONAL BANK

THE CRYSTALLIZATION OF THE BANK IN THE REGION OF BELARUS TOOK PLACE during the process of radical transformation of the system of savings banks. The high-priority task of the postwar period was the renewal and replenishment of the cadre. The state provided payments to the population on wartime loans, which stimulated new multi-scale loans through savings banks to restore and develop the national economy. The monetary reforms of 1947 and 1961 were implemented in such a way as to emphasize the attractiveness of saving the savings of the population in savings banks. As a result, the number of depositors (as well as savings banks) grew rapidly and steadily, becoming comprehensive.

In the years of 1948, 1977, new editions of the Charter of the State Labor Savings Bank were approved. Since 1955 interest on deposits has begun to accrue, non-cash settlements have been developed. The range of services and payments made by savings banks has constantly expanded: servicing monetary lotteries (since 1958), accepting payments from communal, tax, insurance, etc. (since 1963), salary payment (since 1970).

In 1963, savings banks were combined with the State bank's payment cash offices. By 1970 mechanization of the main sections of counting work was provided. In the early 1970's a promising development program for Savings banks was developed. Since 1972 the system of savings banks has passed to self-financing. Since 1984, the list of deposits from the population has started to expand, cashless payments have significantly increased, new forms of payments with enterprises and the population have been mastered on behalf of the State Bank.

In 1987, the State Labor Savings Banks were reorganized into the USSR Savings Bank, in the structure of which the Savings Bank of the Belorussian SSR was also represented. Since 1990, the republican Savings Banks began to work in conditions of full cost accounting, i.e. the regional banks were autonomized. After the collapse of the USSR in 1991, the Savings Bank of the BSSR was reorganized into the "Stock Savings Bank of the Republic of Belarus" ("ASB RB"), commercial banks began to be created, including the Stock Commercial Bank "Belarusbank". As a result of its merger with "ASB RB" in 1995, the "Stock Savings Bank Belarusbank" was created. Under the new name was presented a full-fledged, experienced, qualified regional bank, maximally integrated into the financial processes of the region.



ФЛАГМАН БАНКАЎСКАЙ СІСТЭМЫ



















У 1995 г. згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №340 было створана Адкрытае акцыянернае таварыства «Акцыянерны ашчадны банк Беларусбанк» шляхам зліцця Ашчаднага банка Рэспублікі Беларусь і Акцыянернага камерцыйнага банка «Беларусбанк». Па 2011 г. новым Банкам кіравала Надзея Андрэеўна Ермакова (пазней — Старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь), з 2011 г. па 2016 г. — Сяргей Паўлавіч Пісарык, з 2017 г. Банк узначальвае Віктар Міхайлавіч Ананіч.

ААТ «ААБ БЕЛАРУСБАНК»

У 1995 Г. ААТ «ААБ БЕЛАРУСБАНК» БЫЎ ПРЫЗНАЧАНЫ УРАДАМ РЭСПУБЛІКІ Беларусь банкам-агентам па абслугоўванні замежных крэдытных ліній. Укаранёны штогадовы аўдыт фінансавай справаздачнасці па міжнародных стандартах з запрашэннем міжнародных аўдытарскіх кампаній.

У 1996 г. у склад ААТ «ААБ Беларусбанк» былі ўключаны галіновыя банкі: «Белсувязьбанк», заснаваны ў 1991 г. Міністэрствам сувязі, і «Белжелдорбанк», заснаваны ў 1994 г. Міністэрствам транспарту.

УКАЗ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
30 августа 1995 г. N 340

ОБ УСИЛЕНИИ ГАРАНТИЙ ГОСУДАРСТВА ПО СОХРАННОСТИ И ЭФФЕКТИВНОМУ ИСПОЛЬЗОВАНИЮ ДЕНЕЖНЫХ ВКЛАДОВ НАСЕЛЕНИЯ И МЕРАХ ПО ДАЛЬНЕЙШЕМУ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЮ БАНКОВСКОЙ СИСТЕМЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

В целях усиления гарантий государства по защите денежных вкладов населения, повышения эффективности влияния банков на подъем экономики и развитие социальной сферы ПОСТАНОВЛЯЮ:

1. Реорганизовать в установленном порядке Сберегательный банк путем его слияния с акционерным коммерческим банком "Беларусбанк" в открытое акционерное общество - Сберегательный банк "Беларусбанк".

2. Кабинету Министров Республики Беларусь выступить в качестве учредителя Сберегательного банка "Беларусбанк". Считать собственностью Республики Беларусь контрольный пакет акций Сберегательного банка "Беларусбанк".

3. Установить, что основными задачами Сберегательного банка "Беларусбанк" являются:

реализация государственной политики, направленной на защиту вкладов населения;

улучшение банковского обслуживания физических и юридических лиц;

кредитование целевых государственных программ для развития приоритетных отраслей народного хозяйства республики;

привлечение дополнительных финансовых ресурсов для инвестиций в экономику и социальную сферу.

4. Кабинету Министров Республики Беларусь:

в двухнедельный срок заключить договор с акционерным коммерческим банком "Беларусбанк", предусмотрев в нем механизм слияния коммерческого банка "Беларусбанк" со Сберегательным банком;

совместно с Национальным банком в недельный срок создать комиссию по приему и передаче активов и пассивов Сберегательного банка и акционерного коммерческого банка "Беларусбанк";

в месячный срок провести работу по реорганизации Сберегательного банка и слияние его с акционерным коммерческим банком "Беларусбанк";

в трехмесячный срок с момента регистрации Сберегательного банка "Беларусбанк" обеспечить увеличение его уставного фонда путем дополнительной эмиссии акций этого банка;

разработать проект банковского кодекса Республики Беларусь и представить его до 1 ноября 1995 г. Президенту Республики Беларусь.

5. Установить, что при реорганизации акционерного коммерческого банка "Беларусбанк" непредставление акционерами своих возражений в отношении

Беларусь.

10. Установить, что Председатель правления Сберегательного банка "Беларусбанк" назначается Президентом Республики Беларусь.

11. Государственному секретарю Совета Безопасности Республики Беларусь внести Президенту Республики Беларусь предложения по составу комиссии для проверки деятельности Сберегательного банка и акционерного коммерческого банка "Беларусбанк", включив в нее работников Службы контроля Президента Республики Беларусь, Национального банка и Министерства финансов.

Указанной комиссии в месячный срок после утверждения ее состава Президентом Республики Беларусь провести проверку деятельности Сберегательного банка и акционерного коммерческого банка "Беларусбанк".

О результатах работы комиссии информировать Президента Республики Беларусь.

12. Управлению делами Президента Республики Беларусь в месячный срок решить вопрос о размещении центрального аппарата Сберегательного банка "Беларусбанк".

13. Кабинету Министров Республики Беларусь в двухмесячный срок привести нормативные акты в соответствие с настоящим Указом.

14. Контроль за исполнением данного Указа возложить на Государственного секретаря Совета Безопасности Республики Беларусь.

15. Настоящий Указ вступает в силу со дня его подписания.

Президент Республики Беларусь А.ЛУКАШЕНКО

ПРАФЕСІЯНАЛЫ БАНКАЎСКАЙ СПРАВЫ

НАДЗЕЯ АНДРЭЕЎНА ЕРМАКОВА,
Старшыня савета ветэранаў ААТ «ААБ Беларусбанк»



Нарадзілася 19 красавіка 1953 г. у в. Разальмоў Хоцімскага раёна Магілёўскай вобл. Атрымаўшы дыплом Пінскага ўлікова-крэдытнага тэхнікума, Надзея Андрэеўна завочна скончыла ў 1978 г. Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі (сёння – Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт) па спецыяльнасці «фінансы і крэдыт». Працоўную дзейнасць пачала ў 1971 г. у Хоцімскім аддзяленні Дзяржбанка СССР, дзе за пяць гадоў прайшла шлях ад крэдытнага інспектара да намесніка кіраўніка. Затым працавала намеснікам кіраўніка Кіраўскага аддзялення, кіраўніком Шклоўскага аддзялення Дзяржбанка СССР. З 1984 да 1994 гг. – намеснік старшыні, загадчыца фінансавым аддзелам Шклоўскага райвыканкама. У 1994 г. вярнулася ў банкаўскую сістэму, узначаліўшы філіял АКБ «Поўнач-Захад», а затым аддзяленне АКБ «Белаграпрамбанк» у г. Шклове.

У студзені 1996 г. Н.А. Ермакова прызначана намеснікам Старшыні, затым Старшынёй Праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк». З ліпеня 2011 г. па снежань 2014 г. з'яўлялася Старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь. Ганаровы работнік банкаўскай сістэмы Рэспублікі Беларусь. Член Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь з 2006 па 2010 гг.

Абіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога, трэцяга і чацвёртага скліканняў. З 1999 па 2015 гг. узначальвала грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын».

Член Нацыянальнага савета па гендэрнай палітыцы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджана ордэнам Пашаны, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Наглядальнага Савета ААТ «БелВЭБ»; член Савета Дырэктараў, Старшыня Камітэта па рызыках ЗАТ «БСБ Банк». У 2014 г. абрана Старшынёй ветэранскай арганізацыі Беларусбанка.

ААТ «ААБ Беларусбанк» быў створаны ў выніку аб'яднання ў 1996–1997 гг. чатырох банкаў, а ў 2005 г. далучаны яшчэ камерцыйны банк «МінскКомплексБанк».

Галоўнай мэтай іхняга аб'яднання была неабходнасць утварэння дзяржаўнай банкаўскай установы для рэалізацыя палітыкі, накіраванай на захаванне ўнёскаў насельніцтва, паляпшэнне банкаўскага абслугоўвання фізічных і юрыдычных асоб, крэдытаванне мэтавых дзяржаўных праграм для далейшага развіцця прыярытэтных галін народнай гаспадаркі рэспублікі, прыцягнення дадатковых фінансавых рэсурсаў для інвестыцый у эканоміку і сацыяльную сферу, якія таксама патрабавалі істотных сродкаў.

Пасля дакументальнага аб'яднання банкаў спатрэбілася не менш дзесяцігоддзя, каб пазбавіцца старых шаблонаў і захаваць у рабоце ўсё лепшае, што было ўласціва кожнай з гэтых сістэм: галоўнае было ўмацаваць сацыяльныя традыцыі Ашчаднага банка і навучыцца зарабляць грошы. Мэта вызначылася – на новы ўзровень падняць агульную карпаратыўную культуру, стаць пазнавальнымі і аўтарытэтнымі ў краіне, здабыць прызнанне міжнародных фінансавых інстытутаў як банка-агента па абслугоўванню замежных крэдытных ліній.

Сёння Банк вядомы ва ўсім свеце, на кожным кантыненце. Ён абслугоўвае разлікі прадпрыемстваў краіны з партнёрамі розных дзяржаў. Наша ўстанова знаходзіцца ў ліку банкаў міжнароднага крэдытнага рэйтынгу, у спісе буйнейшых банкаў свету. Высокім даверам карыстаецца Банк і ў сваёй краіне як у насельніцтва, так і ў юрыдычных асоб, прадпрымальнікаў.

Ні адной дзяржаўнай праграмы не абыходзіцца без удзелу Беларусбанка, і выконваюцца яны з годнасцю. Усё гэта дзякуючы традыцыям нацыянальнай банкаўскай сістэмы, канструктыўнай дзяржаўнай палітыцы і людзям, якія працуюць тут, у аб'яднаным Банку. Ужо цэлае пакаленне змянілася за гэты час. Банк маладзее з прыходам на працу таленавітай зацікаўленай моладзі. У полі зроку – і ветэраны банкаўскай справы. Праграма «Клопат» дзейнічае шмат гадоў: увага да кожнага ветэрана, да людзей, якія мацавалі поспех Банка сваёй адданасцю і любоўю да працы. Нізкі паклон вам, паважаныя ветэраны, здароўя, доўгіх гадоў жыцця! А моладзі – стварацца, імкнуцца, перамагаць!

Да стагадовага юбілею ААТ «ААБ Беларусбанк» застаецца ўсяго пяць гадоў. Цяпер самае галоўнае – не згубіць тое, што ёсць, не страціць створанае, упэўнена ісці наперад і разам з краінай зрабіць усё магчымае, каб квітнела наша родная Беларусь.



Сустрэча з ветэранамі Банка напярэдадні Дня Перамогі



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка ўручае Н.А. Ермаковай дзяржаўную ўзнагароду



Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі калектыву работнікаў «ААБ Беларусбанк» за дасягнутыя поспехі ў развіцці банкаўскай сістэмы і эканомікі краіны, надзейнае зберажэнне сродкаў насельніцтва, 2007 г.

Падчас сходу акцыянераў Беларусбанка, Старшыня назіральнага Савета Банка М.П. Корбут і Старшыня Праўлення Н.А. Ермакова, 1997 г.



ВАЛЯНЦІНА ЗАХАРАЎНА ЛУК'ЯНЕНКА,
Першы намеснік Старшыні Праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк»
у 1996-2012 гг.



— *У Беларусбанк я прыйшла на пасаду выканаўчага дырэктара, затым – першага намесніка Старшыні Праўлення Банка. 1996 год – найважнейшы этап фарміравання нарматыўных дакументаў, асноў ўсёй будучай сістэмы Банка.*

Прадуктовая банкаўская лінейка імкліва расла: новыя віды ўнёскаў, дэпазітаў, аблігацый, бюджэтных сродкаў, ашчадных сертыфікатаў. Фарміравалася працэнтная палітыка. Распрацоўвалася маркетынгавая стратэгія. З'явілася шмат новых камерцыйных банкаў, і мы думалі аб нашай канкурэнтаздольнасці.

Банк ажыццяўляў Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб ільготным крэдытаванні насельніцтва пры будаўніцтве жылля. Вялася актыўная праца з гарвыканкамамі, аблвыканкамамі, Урадам. Была ўведзена сістэма будзберажэнняў. На будаўніцтва накіроўваліся велізарныя сумы, што забяспечвала планавыя заданні па ўводу жылля ў эксплуатацыю, выдзяляліся і ўласныя крэдыты Банка, была адкрыта камерцыйная крэдытная лінія. У банкаўскай сістэме доля Беларусбанка па крэдытаванні насельніцтва складала больш за 80% сумы ўсяго крэдытавання будаўніцтва жылля ў Рэспубліцы Беларусь. Па даручэнні Кіраўніка дзяржавы на Банк было ўскладзена правядзенне кантрольных абмераў пры будаўніцтве жылля. І мы стварылі новы дэпартамент.

Я вельмі любіла сваю працу. Мы першымі ў краіне ўвялі ў залы банкаў кансультантаў, распрацавалі дзелавы стыль адзення, устанавілі турнікеты, арганізавалі электронную чаргу. Потым дзяліліся вопытам работы з калегамі з іншых банкаў краіны, праводзілі навучанне, семінары. Беларусбанк заўсёды быў лідарам.

Сёння Банк ўдасканальваецца, пераважае безнаяўная форма разлікаў. Прываблівае разнастайнасць прадуктовых лінеек.

Моладзі пажадаю любіць Банк. Захоўваць традыцыі, каб на першым месцы заўсёды стаялі інтарэсы кліента.

ВАЛЯНЦІНА АНУФРЫЕЎНА НАЗАРАНКА,
намеснік Старшыні Праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» у 1996-2015 гг.



— *З 1996. Першыя крокі Беларусбанка пасля аб'яднання. У Банк я прыйшла з 25-гадовым стажам працы ў Нацыянальным банку краіны, прыйшла ў калектыў вялікіх працаўнікоў. Адным з галоўных напрамкаў работы стала стварэнне метадалагічнай базы. Распрацоўвалася стратэгія Банка, стандарты міжнароднага аўдыту, унутраныя інструкцыі, вярстаўся бюджэт. Гэта быў час фарміравання прафесійнага, кампетэнтнага калектыву. Спецыялісты ашчадных кас адказна асвойвалі камерцыйны напрамак. Ужо ў першыя гады дзейнасці Банк прыступіў да абслугоўвання знешнегандлёвага абароту краіны.*

Стваралася ўнутрыбанкаўская рэвізійная сістэма. Вёўся маніторынг рызык, праца па фарміраванні эфектыўнай сістэмы ўнутранага кантролю Банка, выкананню валютнага заканадаўства, прадухілення легалізацыі даходаў, атрыманых незаконным шляхам. Ішла актыўная праца па павышэнні прэстыжу Банка ў міжнародных фінансавых інстытутах.

Настаў час інфармацыйных і інавацыйных тэхналогій. Перад калектывам Банка стаяць больш складаныя задачы, якія патрабуюць самай высокай кампетэнцыі.

УЛАДЗІМІР УЛАДЗІМІРАВІЧ НОВІК,
намеснік Старшыні Праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» у 1996-2014 гг.



— *Апошнія 20 гадоў для Беларусбанка – час інтэнсіўнага развіцця. Перыяд фарміравання прынцыпова новага ўніверсальнага камерцыйнага банка краіны, якому было наканавана стаць флагманам беларускай банкаўскай сістэмы. Развіццё карэспандэнцкіх адносін, арганізацыя сістэмы міжнародных разлікаў, адкрыццё прадстаўніцтваў за мяжой, прыцягненне звязаных і незвязаных рэсурсаў ад замежных банкаў, удзел у самых значных інвестыцыйных праектах Беларусі, падтрымка нацыянальнай эканомікі – усё гэта становіцца паўсядзённай працай Беларусбанка.*

Жадаю ўсяму працоўнаму калектыву і надалей заставацца флагманам беларускай банкаўскай сістэмы, узорам для пераймання, ініцыятарам новых інавацыйных рашэнняў. Мы жывём у век інфармацыйных тэхналогій, штучны інтэлект ўжо прыйшоў у банкі, і Беларусбанк павінен быць у трэндзе сучасных банкаўскіх тэхналогій. Смялей прыцягвайце ў капітал Банка новых акцыянераў для ўзбагачэння новых тэхналагічных рашэнняў і стварэння высокаэфектыўных арганізацыйных структур. У Беларусбанку дастаткова экспертаў і спецыялістаў, якія здольныя забяспечыць далейшае развіццё Банка. Спадзяюся, што да свайго 100-годдзя Беларусбанк прыйдзе з новымі вялікімі поспехамі і дасягненнямі.

СЯРГЕЙ ПАЎЛАВІЧ ПІСАРЫК,
Старшыня Праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» у 2011–2016 гг.



— Гісторыя Беларусбанка неад'емная ад гісторыі краіны. Без дзейнасці Банка цяжка ўявіць развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы Беларусі. Прычым, зыходзячы з навуковых даследаванняў, такая традыцыя закладзена ў саму сутнасць айчыннай банкаўскай справы.

Сумяшчаючы ў рабоце рынкавыя механізмы і прынцып «дзяржаўнасці», за апошнія дзесяцігоддзі Банк ператварыўся ў фінансавую ўстанову еўрапейскага ўзроўню. І зараз з'яўляецца салідным удзельнікам не толькі айчыннага, але і міжнароднага фінансавага рынку, прадстаўляючы практычна той жа спектр прадуктаў і паслуг, што і банкі ў краінах з развітой эканомікай. Найбуйнейшы акцыянер Беларусбанка – дзяржава, якая ў многім вызначае яго місію – дзяржаўнага падыходу да бізнесу.

Стратэгія Банка, якая прадугледжвае ключавыя фундаментальныя пераўтварэнні, у большасці сваёй мае сістэмны тэхналагічны характар, дазваляе з годнасцю адказваць на выклікі часу. Стаўка робіцца на мадэрнізацыю і высокія тэхналогіі. Сёння важна не проста ісці ў нагу з часам, а апярэджваць яго.

За апошнюю пяцігодку здзейснены пераход да лічбавага банкінгу, з'явіліся інавацыйныя прадукты.

У той жа час, маштабная тэрытарыяльная сетка дазваляе забяспечыць не проста фармальную прысутнасць Банка ва ўсіх рэгіёнах краіны і даступнасць банкаўскіх паслуг для ўсіх кліентаў, але і высокія стандарты абслугоўвання. А комплекснасць абслугоўвання забяспечвае банкаўскі холдынг, куды яшчэ ўвайшлі ААБ «Брокер» і ААБ «Лізінг».

Пазіцыяніруючы сябе ў якасці «народнага», упэўнены, што Банк і надалей будзе імкнуцца да высокага стылю ў карпаратыўнай культуры, заставацца максімальна прыязным і ўважлівым у адносінах да кліента, гатовым падказаць, параіць, аказаць дапамогу. Пагадзіцеся, гэта лагічна для банка, які «заўсёды побач!»



С.П. Пісарык прыняў удзел у пятым Усебеларускім народным сходзе



Урачыстая цырымонія ўстаноўкі памятнага знака, прысвечанага будаўніцтву буйнога транспартна-лагістычнага цэнтра ў раёне в. Шчытомірычы Мінскай вобл.



ААТ «ААБ Беларусбанк» стаў генеральным партнёрам Нацыянальнага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па футболе сярод каманд вышэйшай лігі, 2013 г.

ПРАЎЛЕННЕ ААТ «ААБ БЕЛАРУСБАНК»



Аляксандр Іосіфавіч Паліўка, намеснік Старшыні Праўлення



Ірына Пятроўна Лысакоўская, галоўны бухгалтар



Уладзімір Леанідавіч Стрыхар, намеснік Старшыні Праўлення



Сяргей Мікалаевіч Мельнік, намеснік Старшыні Праўлення, асоба, адказная за кіраванне рызыкамі



Святлана Генадзьеўна Кажэкіна, намеснік Старшыні Праўлення



Таццяна Леанідаўна Міхайлоўская, намеснік Старшыні Праўлення



Віктар Аляксандравіч Перапяліца, намеснік Старшыні Праўлення







Наглядальнаы Савет ААТ «ААБ Беларусбанк» падчас паседжання

СТРАТЭГІЯ ЛІДАРСТВА

З 2004 г. ААТ «ААБ Беларусбанк» першым у краіне пачаў рэалізоўваць сярод насельніцтва ўласныя аблігацыі ў беларускіх рублях, доларах ЗША і еўра. Банк стаў найбуйнейшым аператарам рынку каштоўных папер і займае лідзіруючыя пазіцыі ва ўсіх асноўных яго сегментах.

У 2005 г. да ААТ «ААБ Беларусбанк» быў далучаны камерцыйны банк «МінскКомплексБанк» (заснаваны ў 1994 г.). Атрымана ліцэнзія на ажыццяўленне аперацый з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі.

«Кожны банк стараецца знаходзіць новыя рашэнні дзеля таго, каб утрымаць і павялічыць колькасць сваіх кліентаў, сваю долю ў банкаўскім сектары, а гэта значыць, што і свой уплыў на сусветным банкаўскім рынку. Мы імкнёмся да найбольш зручных умоў для развіцця эканомікі, бізнесу; да рэалізацыі новых інвестыцыйных праектаў, якія спрыяюць развіццю эканомікі нашай краіны і павялічваюць узровень жыцця насельніцтва. Мы ганарымся тым, што Беларусбанк мае самае шырокае прызнанне на сусветным фінансавым рынку. Сярод нашых партнёраў – буйнейшыя замежныя фінансавыя ўстановы Еўропы і Азіі – банкі, небанкаўскія крэдытна-фінансавыя ўстановы, агенцтвы па страхаванню экспартных крэдытаў, рэйтынгавыя агенцтвы».

Віктар Аляксандравіч Перапяліца, намеснік Старшыні Праўлення

У 2006 г. ААТ «ААБ Беларусбанк» прыцягнуў першы сіндыкаваны крэдыт, быў прыняты ў члены Міжнароднай фарфейтынгавай асацыяцыі (The International Forfaiting Association) упершыню ў фінансава-крэдытнай сістэме Рэспублікі Беларусь.

У 2010 г. Беларусбанк выступіў у якасці суарганізатара дэбютнага выпуску суверэнных еўрааблігацый Рэспублікі Беларусь.

У 2012 г. ААТ «ААБ Беларусбанк» стаў афіцыйным членам Міжнароднага інстытута ашчадных банкаў (WSBI), атрымаў статус банка-партнёра Міжбанкаўскага аб'яднання Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

У 2013 г. Беларусбанк падпісаў крэдытнае пагадненне з кансорцыумам нямецкіх банкаў «AKA Ausfuhrkredit-Gesellschaft mbH».

У 2015 г. ААТ «ААБ Беларусбанк» устанавіў супрацоўніцтва з Міжнародным інвестыцыйным банкам.

У 2016 г. Беларусбанк прыцягнуў самы буйны сіндыкаваны крэдыт у суме 265 млн. долараў ЗША ў эквіваленце.



«Мы знаходзімся ў фарватары беларускай банкаўскай сістэмы і шануем рэпутацыю Банка. Зразумела, што сіла і багацці, якімі валодае Беларусь – гэта людзі і ўвесь той эканамічны базіс, што стварыўся дзесяцігоддзямі. Напрыканцы XX ст. ўзнікла пагроза знікнення індустрыяльных гігантаў, разбурэння аграрнага сектара... І на Банк выпала вялікая місія – падставіць плячо нацыянальнай эканоміцы, узяць на сябе ролю стратэгічнага інвестара. У тым, што сёння краіна не проста захавала знакавыя прамысловыя прадпрыемствы, але і стварыла новы сельскагаспадарчы ўклад, ёсць нямалая заслуга Беларусбанка».

Аляксандр Іосіфавіч Паліўка,
намеснік Старшыні Праўлення

ААТ «ААБ Беларусбанк» у сваёй дзейнасці валікую ўвагу надае інвестыцыйным праектам, што садзейнічае развіццю рэальнага сектара эканомікі рэспублікі. З удзелам Банка паспяхова рэалізуецца шэраг інвестыцыйных праектаў у галінах тэхнічнага пераабсталявання сельскай гаспадаркі, развіцця цукровай і мяса-малочнай прамысловасці, прамысловай мадэрнізацыі — Мінскага трактарнага і Беларускага металургічнага заводаў, цэментных заводаў, Беларускай чыгункі, прадпрыемства «Беларускалій» і шэрагу іншых. Беларусбанк удзельнічае ў развіцці беларускай сталіцы. Пры актыўнай крэдытнай падтрымцы Банка ў Мінску пабудаваны такія знакавыя аб'екты, як гандлёвы цэнтр «Сталіца» і пяцізоркавы гатэль «Еўропа».

Сёння актывы Беларусбанка перавысілі 27 млрд. руб. Сукупны крэдытны партфель Банка складае больш за 17 млрд. руб.

Кліентамі Банка з'яўляюцца болей за 79 тыс. юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якім прапануецца шырокі асартымент сучасных банкаўскіх прадуктаў і паслуг. У ліку нашых кліентаў – буйныя прадпрыемствы беларускай эканомікі.

Мінскі трактарны завод і электрацягнікі «Stadler» – аб'екты інвестыцыйных праектаў ААТ «ААБ Беларусбанк»







Кіраўніцтва «ААБ Беларусбанк» падчас дзелавой паездкі ў г. Жодзіна на ААТ «БелАЗ» – кіруючая кампанія холдынгу «БелАЗ-ХОЛДИНГ»







Рабочая сустрэча Старшыні Праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Віктара Ананіча з генеральным дырэктарам ААТ «МАЗ» – кіруючая кампанія холдынгу «БЕЛАВТОМАЗ» Дзмітрыем Кацярынічам



Падчас рабочай паездкі ў Брэсцкую вобл., кіраўніцтва Беларусбанка на ААТ «558 Авіяцыйны рамонтны завод»





Увага да кліентаў Банка – важная частка карпаратыўнай культуры

Прадпрыемства «Беларуськалій» – аб'ект інвестыцыйных праектаў ААТ «ААБ Беларусбанк»





«Уся гісторыя банкаўскай справы Беларусі, пачынаючы ад сярэднявечча, вучыць нас неабходнасці захоўваць асобую банкаўскую прастору са сваёй філасофіяй, традыцыямі і культурай, спецыяльнай зонай нацыянальных інтарэсаў. Гэтым і абумоўлены асаблівыя патрабаванні да палітыкі кіравання рызыкамі.

Прыняцце рызык – адна з асноў банкаўскай справы. Сёння настаў час высокапрафесійных рызыка-менеджараў, здольных апярэджваць развіццё падзей, хутка і дакладна рэагаваць на змены бізнес-асяроддзя, сваечасова прыстасоўвацца да знешніх неспрыяльных фактараў ва ўмовах сусветных крызісаў.

Наш Банк – буйнейшы на нацыянальным фінансавым рынку. Гэта адлюстроўваецца непасрэдным уплывам на развіццё эканомікі краіны. У сваю чаргу, стабільнае становішча ў эканоміцы выяўляе прыбытковасць і фінансавае пастаянства Банка».

Сяргей Мікалаевіч Мельнік,
намеснік Старшыні Праўлення,
асоба, адказная за кіраванне рызыкамі

Беларускі металургічны завод – аб'ект інвестыцыйных праектаў Беларусбанка

«Мы стаялі і будзем стаяць на дзяржаўных пазіцыях, працягваць актыўна ўдзельнічаць у развіцці краіны, бо адчуваем вялікую адказнасць за яе будучыню.

Варта адзначыць, што ў крэдытным партфелі шэрагу прамысловых прадпрыемстваў наша доля – 40-50%. Банк не толькі стымулюе дзелавую ініцыятыву праз праграму падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу, але і дае парады і рэкамендацыі па мэтанакіраваным выкарыстанні фінансаў, рэінжынірынгу, падыходах да інвестыцый».

Аляксандр Іосіфавіч Паліўка,
намеснік Старшыні Праўлення



ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» – аб'ект інвестыцыйных праектаў Беларусбанка





Гандлёвы цэнтр «Сталіца» і гатэль «Ёўропа» – аб'екты інвестыцыйных праектаў ААТ «ААБ Беларусбанк» у Мінску



Беларусбанк робіць вялікі ўнёсак у развіццё аграпрамысловага комплексу краіны

У 2011 г. аграгарадок Гарадзец заняў 1-е месца ў рэспубліканскім аглядзе санітарнага стану і добраўпарадкавання населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь









«За апошнюю чвэрць стагоддзя Беларусь непазнавальна змянілася – гарады набылі еўрапейскую прыгажосць, з'явіліся цэлыя аграгарадкі – яны стварылі новае аблічча беларускай вёскі; пракладзены сучасныя дарогі, пашыраюцца лініі метро, будуецца атамная электрастанцыя. За ўсім гэтым бачыцца і праца Беларусбанка, як складаючай часткі эканомікі.

Банк развіваецца, а гэта залог нашага будучага поспеху».

Уладзімір Леанідавіч Стрыхар,
намеснік Старшыні Праўлення







Дзелавы сняданак з Беларусбанкам для замежных экспартных крэдытных агенцтваў, 2016 г.

Ужо больш за 20 гадоў Беларусбанк актыўна развівае міжнароднае супрацоўніцтва з замежнымі фінансавымі інстытутамі, страхавымі кампаніямі і банкамі. Тут варта аддаць належнае нашым замежным прадстаўніцтвам у Расіі, Кітаі і Германіі. Дамінантай заходняга вектара сталі нямецкія фінансавыя інстытуты.

Першы карэспандэнцкі рахунак быў адкрыты ў Commerzbank AG. У цяперашні час супрацоўніцтва з Commerzbank AG развіваецца практычна па ўсіх напрамках: доўгатэрміновае і гандлёвае фінансаванне, форэксныя аперацыі і інш.

Імпульс развіццю дзелавой актыўнасці дало адкрыццё ў 2003 г. прадстаўніцтва ААТ «ААБ Беларусбанк» у Германіі.

Вынікам гэтай працы стала тое, што ў цяперашні час Беларусбанк абслугоўвае каля 25% знешнегандлёвага абароту краіны, а таксама з'яўляецца лідарам па прыцягненню рэсурсаў замежных банкаў для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у Беларусі.



Падпісанне Мемарандума аб узаемаразуменні са славенскім SID Banka, 2016 г.



«Заходні вектар для нас з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў бізнесу. Знакавыя інвестпраекты, якія шмат у чым вызначылі кірункі сучаснай беларускай эканомікі, былі рэалізаваны сумесна з нямецкімі банкамі. Мы бачым жаданне заходніх партнёраў весці з намі канструктыўны дыялог».

Старшыня Праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Віктар Ананіч

Віктар Ананіч з кіраўніком Цэнтра Нямецкай эканомікі Уладзімірам Аўгусцінскім





Падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Кітайскай карпарацыяй экспартна-крэдытнага страхавання SINOSURE і ААТ «ААБ Беларусбанк», 2017 г.



«Кітайскі вектар – адзін з асноўных кірункаў Беларусбанка. Кожны трэці долар ЗША, прыцягнуты Банкам для фінансавання праектаў у Рэспубліцы Беларусь, прыпадае менавіта на Паднябесную».

Старшыня Праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Віктар Ананіч

Падчас наведвання вагонабудаўнічага завода ў Пекіне. Дэлегацыя Беларусбанка на чале з намеснікам Старшыні Праўлення А.І. Паліўкам



Падпісанне Мемарандума аб узаемаразуменні Беларусбанка і UnionPay International



Перспектывы супрацоўніцтва абяцаюць быць маштабнымі. Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі ЗАТ «Кампанія па развіццю індустрыяльнага парка»

Віктар Ананіч прыняў удзел у пасяджэнні Савета міжбанкаўскага аб'яднання Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў Астане



«У Банка ёсць неабходны вопыт, фінансавыя інструменты і рэсурсы для пашырэння супрацоўніцтва з замежнымі контрагентамі для наступнай арганізацыі фінансавання экспартна-імпартных праектаў. Варта адзначыць, што Банк абслугоўвае амаль чвэрць знешнегандлёвага абароту краіны».

Віктар Аляксандравіч Перапяліца, намеснік Старшыні Праўлення

Сёння Беларусбанк – гэта салідны холдынг з шырокай лінейкай прадуктаў, сэрвісаў і паслуг, што дае магчымасць у большай меры задаволіць патрэбы кліентаў, быць надзейным бізнес-партнёрам.

Ацэнка ўзроўню крэдытнай рызыкі ААТ «ААБ Беларусбанк» праводзіцца міжнароднымі рэйтынгавымі агенцтвамі Fitch Ratings і S&P Global Ratings. У 2017 г. Fitch Ratings пацвердзіла доўгатэрміновы рэйтынг Банка на ўзроўні «B-», змяніўшы прагноз са «Стабільнага» на «Пазітыўны». У сваю чаргу S&P Global Ratings павысіла доўгатэрміновыя крэдытныя рэйтынгі банка з «B-» да «B» захаваўшы «Стабільны» прагноз.



Кампанія банка «ААБ Лізінг» у чацвёрты раз стала лідарам рэйтынгу, які штогод складае Асацыяцыя лізінгадаўцаў Беларусі, 2016 г.

Міжнародныя рэйтынгі ААТ «ААБ Беларусбанк» адпавядаюць суверэннаму рэйтынгу Рэспублікі Беларусь і сведчаць аб празрыстасці і адкрытасці Банка, дэманструюць плацежаздольнасць фінансавай установы як надзейнага дзелавога партнёра.

Згодна штогадоваму рэйтынгу ТОП-1000 Банкаў свету, які публікуе спецыялізаванае фінансавае выданне «The Banker», у 2015 г. Беларусбанк палепшыў сваю пазіцыю, падняўшыся з 12 на 10 месца сярод 25 найбуйнейшых банкаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы па Капіталу 1 ўзроўню, і пацвердзіў сваё лідарства ў Рэспубліцы Беларусь.

Прызнаны фінансавы часопіс «EMEA Finance» называючы імёны лепшых камерцыйных і інвестыцыйных банкаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, а таксама ў краінах СНД не аднойчы прызнаваў Беларусбанк лепшым у трох намінацыях – «Лепшы банк у Рэспубліцы Беларусь», «Лепшы інвестыцыйны банк у Рэспубліцы Беларусь» і «Лепшы брокер ў Рэспубліцы Беларусь».

«Лепшым банкам рынку Цэнтральнай і Усходняй Еўропы» прызнаў Беларусбанк таксама часопіс «Global Finance».



Беларусбанк – «Банк №1» па выніках міжнароднага фестывалю-конкурсу «Выбар года» ў Беларусі. Варта адзначыць, такіх узнагарод у Банка – 9



Уручэнне ўзнагарод ад Беларусбанка доўгачасовым заходне-германскім дзелавым партнёрам, 2016 г.

За высокую якасць афармлення міжнародных банкаўскіх пераводаў «Straight Through Processing Excellence Award» ААТ «ААБ Беларусбанк» адзначаны ўзнагародай Citibank (ЗША)





У 2013–2015 гг. ААТ «Гродзенскі мясакамбінат» з удзелам ААТ «ААБ Беларусбанк» і з прыцягненнем польскіх інвестыцый ажыццявіў рэалізацыю буйнага праекта

ААТ «ААБ Беларусбанк» прыцягнуў сіндыкаваны крэдыт з Расійскай Федэрацыі. Дагавор аб яго прадастаўленні падпісаны 1 верасня 2017 г. у г. Маскве.





«Беларусбанк» выступіў Генеральным партнёрам форуму «Мінскія дзелавыя сустрэчы»



Канферэнцыя «Беларусбанк. Забяспечваючы стабільнасць для далейшага росту», г. Франкфурт-на-Майне, 2016 г.

«Традыцыі пазыковых, ашчадных адносін склаліся на беларускіх землях яшчэ з часоў Вялікага Княства Літоўскага.

Сёння мы ідзём шляхам праграмных рэформаў і інавацый, знаходзімся ў няспынным пошуку новых магчымасцяў, новых фінансавых інструментаў. Паслугі Банка даступныя ўсім грамадзянам, незалежна ад таго, дзе яны пражываюць – у буйным прамысловым горадзе, невялікім пасёлку або вёсцы. Галоўнае для нас – гэта давер кліентаў, які Банк захаваў, прайшоўшы доўгі шлях ад ашчадных кас да найбуйнейшай крэдытна-фінансавай установы краіны. У Беларусбанку працуе кваліфікаваны персанал, асвоены сучасныя мадэлі работы з кліентамі; укараняюцца новыя банкаўскія тэхналогіі, удасканальваюцца паслугі і банкаўскія прадукты.

Адзін з галоўных складальнікаў у дзейнасці Банка – гэта крэдытная падтрымка сацыяльных праграм дзяржавы і якаснае абслугоўванне насельніцтва краіны».

Святлана Генадзьеўна Кажэкіна,
намеснік Старшыні Праўлення

Актыўна падтрымліваючы эканамічную палітыку дзяржавы, спрыяючы дынамічнаму развіццю найважнейшых галін эканомікі і сацыяльнай сферы, паспяховаму выкананню жыллёвай і іншых дзяржаўных праграм, шматтысячны калектыў Беларусбанка ганарыцца тым, што па праву лічыцца «народным». Абслугоўванне насельніцтва, прадастаўленне жыхарам рэспублікі шырокага спектру сучасных банкаўскіх паслуг – адзін з прыярытэтных напрамкаў Банка.

Унёскі насельніцтва перавысілі 8 млрд. руб. Партфель па крэдытаванні фізічных асоб склаў 5,4 млрд. руб., пры гэтым на фінансаванне нерухомасці накіравана 4,9 млрд. руб.

З выкарыстаннем крэдытаў Банка пабудавана 38,3 млн. кв.м. жылой плошчы, што дало магчымасць больш 501 тыс. сем'яў палепшыць свае жыллёвыя ўмовы.

Развіваецца актыўнае і спажывецкае крэдытаванне – крэдытаатрымальнікамі Банка з'яўляюцца 235 тысяч грамадзян Беларусі, а сума астатку запазычанасці перавысіла 395,2 млн. руб.

Аперацыйная зала філіяла ААТ «ААБ Беларусбанк»









Утульная атмасфера, якая пануе ў офісах Беларусбанка, спрыяе плённай працы яго супрацоўнікаў

«Яшчэ зусім нядаўна для апрацоўкі плацяжоў насельніцтва і фарміравання паўнавартаснай справаздачнасці патрабаваліся тыдні і месяцы, а сёння любы плацеж, здзейснены ў аддзяленні за некалькіх секунд знаходзіць свайго атрымальніка. Усё гэта стала магчымым дзякуючы празрыстай і якаснай справаздачнасці, якой давяраюць як кліенты і контрагенты Банка, так і буйныя міжнародныя фінансавыя карпарацыі, разам з якімі Банк рэалізуе важныя для краіны праекты.

Бухгалтарскі ўлік Банка і яго справаздачнасць амаль за векавую гісторыю прайшлі шлях ад ручных запісаў на папяровых носьбітах да аўтаматызаванай апрацоўкі вялікіх масіваў інфармацыі ў рэжыме рэальнага часу».

Ірына Пятроўна Лысакоўская, галоўны бухгалтар

Беларусбанк настойліва і паслядоўна развівае і ўкараняе найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі. Асноўнае месца тут займае створаная Банкам адзіная цэнтралізаваная аўтаматызаваная банкаўская сістэма. Таксама выконваецца праектаванне бізнес-працэсаў па напрамках арганізацыйнага менеджменту і працы з персаналам, стварэнні адзінай базы бізнес-партнёраў, кіраванні рэсурсамі ў Банку, кіраванні рахункамі кліентаў. Паспяхова развіваецца сістэма Інтэрнэт-банкінгу. Банк удзельнічае ў фарміраванні адзінай інфармацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь з магчымасцю маніторынгу ў рэжыме рэальнага часу.

Нязменную ўвагу Беларусбанк надае аптымізацыі кадравага складу і структуры Банка за кошт укаранення новых банкаўскіх тэхналогій, павышэння эфектыўнасці працы. Вядзецца актыўнае пераўтварэнне філіялаў у цэнтры банкаўскіх паслуг, адкрываюцца новыя аддзяленні Банка, прычым у якасці галоўных тут ставяцца інтарэсы насельніцтва.

У эру лічбавай трансфармацыі, калі хуткасць змяненняў пастаянна ўзрастае, а эфектыўнасць бізнесу вызначаюць digital-тэхналогіі, Банк рэалізуе новыя падыходы ў арганізацыі дзейнасці і кіравання, робячы сур'ёзныя крокі ў сваім развіцці. Гадамі назапашаны вопыт дае права і магчымасць з годнасцю адказваць на выклікі часу.

Банк робіць стаўку на новыя тэхналогіі, прапануючы банкаўскія паслугі ў рэжыме рэальнага часу







Беларусбанк прадставіў навінку на рынку банкаўскіх плацежных карт Беларусі – кабэйджынгавую карту БелКарт-Maestro, якой можна карыстацца не толькі ў краіне, але і за яе мяжой, сакавік 2014 г.

Беларусбанк адным з першых у краіне пачаў працаваць з плацежнымі карткамі і працягвае заставацца лідарам у развіцці гэтага віду паслуг. На долю Банка прыпадае 41% рынку банкаўскіх плацежных карт у Рэспубліцы Беларусь. Банк зяўляецца паўнапраўным членам міжнародных плацежных сістэм MasterCard International і VISA International, а таксама плацежнай сістэмы «Белкарт».

Серыі пластыкавых картак ААТ «ААБ Беларусбанк» разнастайных плацежных сістэм: MasterCard, VISA, VISA Electron, Белкарт

«Банкаўскія падраздзяленні ўражваюць новым абліччам – прыгожа, сучасна, утульна для кліентаў. І справа не толькі ў тым, што нашы офісы натуральна ўпісваюцца ў архітэктуру гарадоў і вёсак. Бадай, самае важнае – даступнасць паслуг для ўсіх і кожнага, новы тэхналагічны фармат абслугоўвання».

Уладзімір Леанідавіч Стрыхар, намеснік Старшыні Праўлення



Філіял № 500 (Мінскае ўпраўленне)



Філіял № 300 (Гомельскае абласное ўпраўленне)



Філіял № 100 (Брэсцкае абласное ўпраўленне)



Філіял № 700 (Магілёўскае абласное ўпраўленне)



Філіял №200 (Віцебскае абласное ўпраўленне)



Філіял № 400 (Гродзенскае абласное ўпраўленне)

*Сетка падраздзяленняў Банка складаецца з 30 філіялаў, 100 цэнтраў банкаўскіх паслуг, 1557 аддзяленняў (з якіх 718 – размешчана ў гарадах, а 839 – у сельскай мясцовасці)**

**Па дадзеных на 1 студзеня 2017 г.*





Цэнтр банкаўскіх паслуг № 621 у г. Смалявічы



Цэнтр банкаўскіх паслуг № 624 у г. Стоўбцы



Цэнтр банкаўскіх паслуг № 715 у г. Круглае

Падтрыманне высокага ўзроўню сацыяльнай адказнасці Банк ацэньвае як сведчанне паспяховасці. А ў цэлым, карпаратыўная сацыяльная адказнасць Банка рэалізуецца пры дапамозе пяці праграм і ахоплівае грамадскія сферы такія як культура, здароўе, спорт, адукацыя, дзяцінства. Асаблівы акцэнт – на будаўніцтва дамоў сямейнага тыпу ў рамках праекта «Бацькоўскі дом».

У банкаўскай, крэдытна-фінансавай, дабрачыннай дзейнасці ААТ «ААБ Беларусбанк» плённа ўвасабляецца сінтэз гістарычных здабыткаў і патрабаванняў часу, мясцовых традыцый і сусветнага прафесійнага вопыту.





Дом сямейнага тыпу ў Лагойску





У рамках рэспубліканскай праграмы «Нашы дзеці» Беларусбанк у 2016 г. арганізаваў паездку хлопчыкаў і дзяўчынак з многадзетных сем'яў у Цэнтр кіравання палётамі ў г. Каралёў. Дзецям далі магчымасць выйсці на сувязь і пагутарыць з камандзірам карабля «Саюз МС-03», касманаўтам-земляком Алегам Навіцкім, які ў складзе міжнароднага экіпажа знаходзіўся на МКС.



З кожным годам пашыраюцца сацыяльныя праекты Беларусбанка, за кожным – людзі, якім патрэбна дапамога. Дзеці – у цэнтры асаблівай увагі. Для дзіцячых дамоў сямейнага тыпу Беларусбанкам пабудавана 15 катэджаў, у якіх пражывае больш за 140 дзяцей – яны жаданыя госці Галаўнога офіса Банка.





У рамках праекта «Мост у будучыню» у сярэдняй школе №8 г. Крычава была ўведзена «Карта навучэнца». Дзякуючы Беларусбанку, школа перайшла на новы ўзровень тэхнічнага абсталявання.



Свята для дзяцей, якія выхоўваюцца ў дамах сямейнага тыпу



Пасадка дрэў у г. Клічаў Магілёўскай вобл. падчас «Дажынак-2017»







У рамках праекта «Беларусбанк. Вектар дабрыні», які прадугледжвае дапамогу ўстановам аховы здароўя, сацыяльнай абароны, грамадскім аб'яднанням і грамадзянам, аўтапарк магілёўскіх медыкаў папоўніўся сучаснай тэхнікай – гэты рэанімабіль Банк перадаў з нагоды 750-годдзя г. Магілёва







Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў Аляксандра Герасіменя – рэкламнае імя Беларусбанка

Падтрымка высокіх дасягненняў у спорце і фізічнай культуры ажыццяўляецца ў рамках праекта «Беларусбанк. Пераможам разам!» Дзякуючы яго рэалізацыі, у 2014 г. была аказана фундатарская дапамога баскетбольнаму клубу «Гарызонт», хакейнаму клубу «Ліда», Беларускай федэрацыі парусnага спорту, футбольнаму клубу «Мінск». Штогод Банк ажыццяўляе фінансавую падтрымку шэрагу спартыўных мерапрыемстваў рэспубліканскага значэння.





Даччыныя прадпрыемствы ААТ «ААБ Беларусбанк» – УП «ААБ Санаторый Сонечны» і УП «ААБ Санаторый Спадарожнік» – аказваюць паслугі па санаторна-курортнаму аздараўленню. Асноўным напрамкам іх дзейнасці з'яўляецца арганізацыя паўнавартаснага адпачынку і аздараўленне работнікаў Беларусбанка і членаў іх сем'яў. У комплексе з прыроднымі фактарамі выкарыстоўваюцца фізіятэрапія, дыеталогія, лячэбная фізкультура і іншыя сучасныя эфектыўныя медыцынскія методыкі і тэхналогіі.

Санаторыі «Сонечны» і «Спадарожнік»













XI рэспубліканская зімовая спартакіяда, прысвечаная 95-годдзю ААТ «ААБ Беларусбанк»



Конкурс «Міс Беларусбанк» – яркае свята, арганізаванае прафсаюзнай арганізацыяй Беларусбанка, 2010 г.

Менеджар па рэкламна-інфармацыйнай працы Гомельскага абласнога ўпраўлення Беларусбанка Юлія Перагудава – пераможца першага нацыянальнага конкурсу Місіс Беларусь





Рэспубліканскі фестываль самадзейнай творчасці работнікаў Банка «Голас ААБ», прысвечаны 95-годдзю ААТ «ААБ Беларусбанк», 2017 г.



Саюз жанчын Беларусбанка правёў дабрачынны марафон «Сіла душы – у надзеі», сабраныя сродкі былі перададзены Беларускаму дзіцячаму хоспісу

«Мы гарантуем выкананне ўзятых на сябе абавязацельстваў, верым у каштоўнасць таго, што робім для грамадства. Гэта сімвал нашай карпаратыўнай культуры, сімвал нашай бізнес-адказнасці. Пераемнасць вопыту банкаўскай практыкі папярэдніх пакаленняў, шматвяковыя традыцыі не могуць бясследна знікнуць. На Беларусі стварыўся асаблівы сацыяльны асяродак, і мы заўсёды апраўдаем давер тых, каму сёння патрэбна падтрымка дзяржавы ў імя доўгатэрміновай перспектывы. Дасягнуць гэтага было б немагчыма без павагі да людзей, увагі да інтарэсаў канкрэтнага чалавека».

Таццяна Леанідаўна Міхайлоўская, намеснік Старшыні Праўлення



Для асабістай калекцыі Банк набыў частку тыражу ўнікальнага выдання «Сусветная спадчына Францыска Скарыны»

Прэзентацыя фотаальбома «Перамога. Помнім. Ганарымся», выдадзенага Банкам з нагоды 70-годдзя Вялікай Перамогі





Праект «Беларусбанк. Прастора натхнення» накіраваны на падтрымку арганізацый культуры і мастацтва. За вялікі ўнёсак у папулярызацыю і развіццё беларускай культуры ў 2006 г. Беларусбанк быў адзначаны дыпломам «Мецэнат культуры».



У 2016 г. Банк адзначаны дыпломам Лаўрэата ў намінацыі «Мецэнат тэатра» на 4-ым рэспубліканскім конкурсе тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія»



Інвестыцыі ў культуру. Унікальны фотаальбом «Hotel 1911», набыты Беларусбанкам, быў перададзены палацу Румянцавых і Паскевічаў.

Беларусбанк выступіў фундатарам скульптурнай кампазіцыі «Настаўніца першая мая», якая ўпрыгожыла ўваход у галаўны корпус Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка



ФЛАГМАН БАНКОВСКОЙ СИСТЕМЫ

ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК» ВОЗВОДИЛСЯ НА ОСНОВЕ ОБЩЕГОСУДАРСТВЕННОЙ сети сберегательных касс СССР, которые являлись важным элементом финансовой системы страны. Эти особенности повлияли на структурную организацию Банка и некоторые принципы его деятельности, включая работу с физическими лицами, системные подходы, масштабное видение и исполнение задач.

ОАО «АСБ Беларусбанк» быстро освоил позицию регионального коммерческого банка с большой буквы — ведущего банка на территории Беларуси. Однако, по сути, после республиканского Сбербанка советских времен, это была совершенно иная организация, в которой обрели практическую реализацию многовековые традиции ведения банковского дела в регионе, в творческом сочетании с советским опытом и современными деловыми, организационными подходами и технологиями. Спектр деятельности советских сберкасс в коммерческом и международном контекстах был весьма скудным. Эти направления работы Беларусбанку пришлось выстраивать «на лету». Несомненные достижения в этих областях — верный показатель надёжности и профессионализма регионального лидера.

В результате можно засвидетельствовать, что в банковской, кредитно-финансовой деятельности ОАО «АСБ Беларусбанк» плодотворно воплощается синтез местных традиций и мирового профессионального опыта, что получает положительную оценку как у отечественных, так и у зарубежных клиентов по всему миру.

THE FLAGSHIP OF THE BANKING SYSTEM

JSC "BELARUSBANK" WAS BUILT ON THE BASIS OF THE NATIONAL NETWORK OF savings offices of the USSR that were an important element of the country's financial system. These circumstances affected the structural organization of the Bank and some of the principles of its activities, including work with individuals, systemic approaches, large-scale vision and execution of tasks.

JSC "Belarusbank" quickly mastered the position of the leading regional commercial bank on the territory of Belarus. However, in fact, comparing with the Republican Savings Bank of the Soviet era, it was a completely different organization, which carried out practical realization of a long tradition of banking business in the region, creatively combining Soviet experience and modern business and organizational approaches and technologies. The spectrum of activity of the Soviet savings offices in the commercial and international context was very poor. These areas of work Belarusbank had to build "on the spot". Undoubtedly, achievements in these areas were an indicator of reliability and professionalism of the regional leader.

As a result, it can be testified, that in the banking, credit and financial activities JSC "Belarusbank" fruitfully embodied the synthesis of local traditions and world professional experience that gets a positive evaluation either by domestic clients or foreign clients worldwide.



Станаўленне банкаўскай справы Беларусі – ад скарбонкі ў цэхах і брацтвах, ад першага «пабожнага» банка XVI стагоддзя да сучаснасці – гісторыя, сціснутая ў спружыну, цесна пераплеценая з лёсам зямлі і людзей – з'яўляецца неад'емным складнікам фарміравання банкаўскай справы краін Еўропы.

Напярэдадні свайго 95-годдзя «Беларусбанк» разам з навукоўцамі правёў грунтоўныя даследаванні архіўных фондаў дзяржавы і суседніх краін, з мэтай рэканструкцыі гісторыі грашова-ашчаднай і крэдытнай справы на землях Беларусі.

Развіццё эканамічных адносін на пачатку XIX стагоддзя спрыяла з'яўленню новых формаў фінансава-крэдытных устаноў. Наяўнасць свабоднага капіталу патрабавала яго захавання і прырашчэння. Унёскі пачалі размяшчаць пры прыказах грамадскага догляду, якія, у тым ліку, займаліся кіраваннем маёмасцю, фінансамі, маёмасным апекаваннем сірот і іншых непрацаздольных уласнікаў. Пры прыказах захоўваліся фінансавыя сродкі, на якія налічваліся фіксаваныя працэнты. З часам у прыказы сталі ўкладаць грошы дваране і мяшчане.

Захавалася «Краткая ведомость, показывающая сколько какое лицо и из какого капитала в Могилёвском приказе общественного призрения обращающихся состоит должным и сколько оных за том в остаток ещё налицо находится с 1 января 1813 г.», па якой ужо ў 1813 г. ў Магілёўскім прыказе грамадскага догляду меліся досыць буйныя ўнёскі.

Такім чынам пісьмовыя сведчанні даюць падставу сцвярджаць: 2017-ТЫ ДЛЯ «БЕЛАРУСБАНКА» – ГОД НАПЯРЭДАДНІ 205-Й ГАДАВІНЫ ГІСТАРЫЧНАГА ІСНАВАННЯ АШЧАДНАЙ СПРАВЫ.


Краткая ведомость.

Далей, у дакументах Віцебскага аддзялення Дзяржаўнага банка па справах мясцовага прыказа грамадскага догляду за 1861 г. маюцца згадкі пра рахункі ашчаднай касы прыказа з лістапада 1821 г.



Указам імператара Мікалая I ад 25 лістапада 1841 г. прадугледжвалася стварэнне ашчадных кас пры Санкт-Пецярбургскай і Маскоўскай захоўнай казне.

Аднак у справе Магілёўскага прыказа грамадскага догляду, дзе прадстаўлены падрабязны рахунак укладаў 2 разраду за 1842 г., ёсць інфармацыя аб унесеных на 1 студзеня 1841 г. 79 руб. 99 кап. на ўладкаванне ашчаднай касы, па гэтай суме у пачатку 1842 г. налічана працэнтаў – 3 руб. 80 кап. Гэта значыць каса фактычна існавала. Дату 1 студзеня 1841 г. можна таксама лічыць кропкай адліку гісторыі ашчадных кас у Беларусі.

Гістарычныя пошукі яшчэ не завершаны. Мяркуецца, што будзе адкрыта яшчэ не адна цікавая і карысная старонка каштоўнага працоўнага вопыту і гонару нашых продкаў.



БЕЛАРУСБАНК
БЕЛАРУСБАНК
БЕЛАРУСБАНК

ЗАКЛЮЧЭННЕ

У ГІСТОРЫІ СКЛАДАННЯ І АФАРМЛЕННЯ БАНКАЎСКАЙ СПРАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ

Беларусі вылучаюцца некалькі значных перыядаў:

— перыяд дабанкаўскі (з канца IX тысячагоддзя да н.э. да пачатку XIV стагоддзя н.э.: складанне сістэмы каштоўнасцей, пачатку грашовага абарачэння),

— перыяд протабанкаўскі (XIV–XVI стст.: складанне рэгіянальнай эканамічнай і фінансавай сістэм),

— перыяд раннебанкаўскі (з канца XVI па другую палову XIX ст.: інстытуалізацыя банка, праекты стварэння цэнтральнага банка, рэарганізацыя эканамічнай і грашова-крэдытнай сістэмы),

— перыяд банкаўскі (з канца XIX да пачатку XX стст.: функцыянаванне ў складзе банкаўскай сістэмы),

— перыяд выпрабаванняў на трываласць (першая палова XX ст.: банкаўская дзейнасць на фоне надзвычайных сацыяльных абставін знешняга паходжання),

— перыяд крышталізацыі рэгіянальнага банка (другая палова XX ст.),

— перыяд умацавання пазіцыі вядучага ў рэгіёне Беларусі банка (ад канца XX ст. — да цяперашняга часу).

На гэтым гістарычным шляху варта вылучыць наступныя храналагічныя меткі:

X–XIV стст. – развіццё міжрэгіянальнага гандлю па рэках, засваенне таварнай вытворчасці ў рэгіёне, арганізацыя грашовага абарачэння: на аснове іншаземных манет – з X па XII стст. (у рамках мясцовых княстваў), на аснове мясцовай сістэмы плацежных сродкаў – з XII да сярэдзіны XIV стст. (у рамках мясцовых княстваў і Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ), з чаканкай уласнай манеты – з канца XIV ст. (у рамках ВКЛ),

XV–XVIII стст. – рэалізацыя шэрагу протабанкаўскіх функцый, у тым ліку ашчадную, крэдытную і інш. (свайго роду «віртуальны банк»), у выкананні якіх асаблівую ролю мела брацка-цэхавая арганізацыя насельніцтва рэгіёна Беларусі, а таксама шэраг устаноў і пэўных асоб (банкірска-гандлёвыя дамы, манастыры, «ліхвяры»), у рамках ВКЛ і Рэчы Паспалітай;

XVI–XVIII стст. – шэраг праектаў заснавання цэнтральнага дзяржаўнага банка ў Рэчы Паспалітай;

1592 г., дата зацвярджэння самага ранняга з захаваных у рэгіёне цэхавых Статутаў, як этапны пункт у арганізацыі ашчаднай справы на тэрыторыі Беларусі,

1598 г. інстытуалізацыя банка, у г. Нясвіжы, у форме «пабожнага банка»;

1772–1860 гг. — пераход рэгіёна Беларусі з фінансавай сістэмы Рэчы Паспалітай у фінансавую сістэму Расійскай імперыі,

1860–1917 гг. — фарміраванне рэгіянальных банкаўскіх устаноў у складзе Расійскай банкаўскай сістэмы,

1813 г. – ускосныя сведчанні аб мэтавым выкананні ашчаднай функцыі, пры Магілёўскім прыказе грамадскага догляду.

1821 г. – ускосныя сведчанні аб дзейнасці ашчаднай касы, пры Віцебскім прыказе грамадскага догляду.

1841 г. – прамыя сведчанні аб дзейнасці ашчаднай касы, пры Магілёўскім прыказе грамадскага догляду.

1870 г. — заснаванне першага ў рэгіёне банка Расійскай банкаўскай сістэмы, Гарадскога грамадскага банка ў г. Гомелі,

1873 г. — заснаванне першага ў рэгіёне Акцыянернага камерцыйнага банка, у г. Мінску,

1923 г. — адкрыццё цэнтральнай у рэгіёне – Галоўнай ашчаднай касы № 16, у складзе сістэмы дзяржаўных ашчадных кас СССР, у г. Мінску,

1987 г. — стварэнне рэспубліканскага банка – Ашчаднага банка БССР, у складзе Ашчадбанка СССР,

1991 г. — пераўтварэнне Ашчадбанка БССР у Ашчадбанк Рэспублікі Беларусь; установа АКБ «Беларусбанк»,

1995 г. — стварэнне ААТ «ААБ Беларусбанк», шляхам зліцця Ашчадбанка РБ і АКБ «Беларусбанк».

Будучы сфарміраваным на аснове постсавецкага Ашчадбанка, ААТ «ААБ Беларусбанк» — па сутнасці зусім іншая арганізацыя, у якой адрадзіліся і здабылі практычную рэалізацыю шматвяковыя традыцыі вядзення банкаўскай справы ў рэгіёне, у творчым спалучэнні з савецкім вопытам і сучаснымі дзелавымі, арганізацыйнымі падыходамі і тэхналогіямі.

Спектр дзейнасці савецкіх ашчадных кас у камерцыйным і міжнародным кантэкстах быў вельмі бедным. Гэтыя напрамкі работы «Беларусбанка» прыходзілася выбудоўваць «на ляту». ААТ «ААБ Беларусбанк» аператыўна сфарміраваў свой характар – вывераная аналітыка і здаровыя кантакты, спалучэнне прафесіяналізму і навацый, паслядоўнасці і настойлівасці. І пры гэтым – сацыяльны акцэнт дзелавой палітыкі — таксама адраджэнне і працяг традыцый мінулага, у свой час ярка увасобленых у Нясвіжскім банку – першым інстытуалізаваным банку на тэрыторыі Беларусі (канец XVI ст.)

ААТ «ААБ Беларусбанк» пазіцыянуе сябе менавіта як банк, які паходзіць з Беларусі. Ён лічыць для сябе важным і неабходным асэнсоўваць гісторыю свайго рэгіёна, вучыцца на вопыце папярэднікаў, вылучаць і памнажаць усё лепшае, пазітыўнае, апрабаванае часам.

Сёння ААТ «ААБ Беларусбанк» – прадаўжальнік чатырохвяковай банкаўска-фінансавай традыцыі, займае лідзіруючыя пазіцыі ў айчыннай банкаўскай сістэме па такіх паказчыках, як узровень уласнага капіталу, актываў, крэдытаў, дэпазітаў.

Беларусбанк – буйнейшая ўніверсальная сістэмаўтваральная фінансава-крэдытная ўстанова Рэспублікі Беларусь, рэалізуе эфектыўныя і надзейныя рашэнні, прапануе ўсе віды банкаўскіх паслуг і прадуктаў.

ЗАКЛЮЧЕНИЕ

В ИСТОРИИ СЛОЖЕНИЯ И ОФОРМЛЕНИЯ БАНКОВСКОГО ДЕЛА НА ТЕРРИТОРИИ Беларуси выделяются несколько значимых периодов:

— период добанковский (с конца IX тысячелетия до н.э. по начало XIV века н.э.: сложение системы ценностей, начала денежного обращения),

— период протобанковский (XIV–XVI вв.: сложение региональной экономической и финансовой систем),

— период раннебанковский (с конца XVI по вторую половину XIX в.: институализация банка, проекты создания центрального банка, реорганизация экономической и денежно-кредитной системы),

— период банковский (с конца XIX по начало XX вв.: функционирование в составе банковской системы),

— период испытаний на прочность (первая половина XX в.: банковская деятельность на фоне чрезвычайных социальных обстоятельств, внешнего происхождения),

— период кристаллизации регионального банка (вторая половина XX в.),

— период укрепления позиции ведущего в регионе Беларуси банка (с конца XX в. – по настоящее время).

На этом историческом пути следует выделить следующие хронологические отметки:

X–XIV вв. — развитие межрегиональной торговли по рекам, освоение товарного производства в регионе, организация денежного обращения: на основе иноземных монет — с X по XII вв. (в рамках местных княжеств), на основе местной системы платёжных средств — с XII до середины XIV вв. (в рамках местных княжеств и Великого княжества Литовского (далее — ВКЛ)), с чеканкой собственной монеты — с конца XIV в. (в рамках ВКЛ),

XV–XVIII вв. — реализация ряда протобанковских функций, включая сберегательную, кредитную и др. (своего рода «виртуальный банк»), в исполнении которых особую роль имела братско-цеховая организация населения региона Беларуси, а также ряд учреждений и отдельных лиц (банкирско-торговые дома, монастыри, «лихвяры»), в рамках ВКЛ и Речи Посполитой;

XVI–XVIII вв. — ряд проектов основания центрального государственного банка в Речи Посполитой;

1592 г., дата утверждения самого раннего из сохранившихся в регионе цеховых Статутов, как этапный пункт в организации сберегательного дела на территории Беларуси,

1598 г. институализация банка, в г. Несвиже, в форме «побожного банка»;

1772–1860 гг. — переход региона Беларуси из финансовой системы Речи Посполитой в финансовую систему Российской империи,

1860–1917 гг. — формирование региональных банковских учреждений в составе Российской банковской системы,

1813 г. – косвенные свидетельства о целевом исполнении сберегательной функции, при Могилевским приказе общественного призрения.

1821 г. – косвенные свидетельства о деятельности сберегательной кассы, пры Витебском риказе общественного призрения.

1841 г. – прямые свидетельства о деятельности сберегательной кассы, при Могилевским приказе общественного призрения.

1870 г. — учреждение первого в регионе банка Российской банковской системы, Городского общественного банка в г. Гомеле,

1873 г. — учреждение первого в регионе Акционерного коммерческого банка, в г. Минске,

1923 г. — открытие центральной в регионе – Главной сберегательной кассы № 16, в составе системы государственных сберегательных касс СССР, в г. Минске,

1987 г. — создание республиканского банка – Сберегательного банка БССР, в составе Сбербанка СССР,

1991 г. — преобразование Сбербанка БССР в Сбербанк Республики Беларусь; учреждение АКБ «Беларусбанк»,

1995 г. — образование ОАО «АСБ Беларусбанк», путем слияния Сбербанка РБ и АКБ «Беларусбанк».

Будучи сформированным на основе постсоветского Сбербанка, ОАО «АСБ Беларусбанк» — по сути, совершенно иная организация, в которой возродились и обрели практическую реализацию многовековые традиции ведения банковского дела в регионе, в творческом сочетании с советским опытом и современными деловыми, организационными подходами и технологиями.

Спектр деятельности советских сберкасс в коммерческом и международном контекстах был весьма скудным. Эти направления работы «Беларусбанку» приходилось выстраивать «на лету». ОАО «АСБ Беларусбанк» оперативно сформировал характер — выверенная аналитика и здоровые контакты, сочетание профессионализма и новаций, последовательности и настойчивости. И при этом — социальный акцент деловой политики – также возрождение и продолжение традиций прошлого, в своё время ярко воплощённых в Несвижском банке — первом институализированном банке на территории Беларуси (конец XVI в.).

ОАО «АСБ Беларусбанк» позиционирует себя именно как банк, происходящий из региона Беларуси. Он полагает для себя важным и необходимым осмысливать историю своего региона, учиться на опыте предшественников, выделять и преумножать все лучшее, позитивное, апробированное временем.

Сегодня ОАО «АСБ Беларусбанк», продолжатель четырехвековой банковско-финансовой традиции, занимает лидирующие позиции в отечественной банковской системе по таким показателям, как уровень собственного капитала, активов, кредитов, депозитов.

Беларусбанк – крупнейшее универсальное системообразующее финансово-кредитное учреждение Республики Беларусь, реализует эффективные и надежные решения, предлагает все виды банковских услуг и продуктов.

CONCLUSION

THERE WERE SEVERAL SIGNIFICANT PERIODS IN THE HISTORY OF BANKING ON THE territory of Belarus:

— The pre—bank period (from the end of the 9th millennium BCE to the beginning of the 14th century CE: the formation of values system, the beginning of monetary circulation),

— The proto—bank period (the 14th – 16th centuries: the formation of regional economic and financial systems),

— The early banking period (from the end of the 16th to the second half of the 19th century: the institutionalization of the bank, the projects of creation of a central bank, the reorganization of the economic and monetary system),

— The bank period (from the end of the 19th to the beginning of the 20th centuries: functioning as part of the banking system),

— The "strength test" period (first half of the twentieth century: banking activity against the backdrop of extraordinary social circumstances of external origin),

— The period of crystallization of regional bank (second half of the twentieth century),

— The period of strengthening the position of the leading bank in the region of Belarus (the end of the twentieth century — present time).

On this historical path, the following chronological markers should be highlighted:

The 10th – 14th centuries, development of interregional trade along rivers, development of commodity production in the region, organization of monetary circulation. This processes were developing on the basis of foreign coins in the local principalities from the 10th to the 12th centuries; on the basis of local system of payment means in the framework of local principalities and the Grand Duchy of Lithuania (hereinafter – the GDL) from the 12th to the middle of the 14th centuries; on the basis of its own coin within the framework of the GDL from the end of the 14th century;

The 15th – 18th centuries, the implementation of a number of proto—banking functions, including savings, credit, etc. (a kind of "virtual bank"), in which a special role played the guilds of the region of Belarus, as well as a number of institutions and individuals (banking and trading houses, monasteries, lihviary) within the framework of the GDL and the Polish—Lithuanian Commonwealth;

The 16th – 18th centuries, a number of projects for the establishment of the central state bank in the Commonwealth;

1592, approval of the earliest guild statutes preserved in the region, a milestone in the organization of savings on the territory of Belarus,

1598, institutionalization of the bank in the town of Nesvizh in the form of pobozhny bank;

1772–1860, the transition of the region of Belarus from the financial system of the Commonwealth to the financial system of the Russian Empire,

1860–1917, the formation of regional banking institutions within the Russian banking system,

1813, indirect evidence of the purposeful realization of the savings function, under the Mogilev department of public assistance.

1821, indirect evidence of the activity of the savings bank, under the Vitebsk department of public assistance.

1841, direct evidence of the activity of the savings bank, under the Mogilev department of public assistance.

1870, the establishment of the first regional bank of the Russian banking system, the City Public Bank in Gomel,

1873, the establishment of the first joint—stock commercial bank in Minsk,

1923, the opening of the central regional Main Savings Office No. 16, as part of the system of state savings banks of the USSR in Minsk,

1987, the creation of a republican bank — the Savings Bank of the BSSR as part of the Sberbank of the USSR,

1991, the transformation of the Savings Bank of the BSSR into the Savings Bank of the Republic of Belarus; establishment of JSCB "Belarusbank"

1995, the formation of JSC "ASB Belarusbank", through the merging of the Savings Bank of the Republic of Belarus and JSCB "Belarusbank".

Being formed on the basis of the post—Soviet Sberbank, ASB Belarusbank is in fact an entirely different organization, in which the centuries—old traditions of banking in the region were revived and gained practical realization in creative combination with Soviet experience and modern business, organizational approaches and technologies.

The range of activities of Soviet savings banks in the commercial and international contexts was very limited. These areas of work "Belarusbank" had to build "on the spot". JSC ASB Belarusbank quickly developed a well—tested analyst and healthy contacts, a combination of professionalism and innovation, consistency and perseverance, and at the same time, makes emphasis on social policy, the revival and continuation of the traditions of the past, once vividly embodied in the Nesvizh Bank, the first institutionalized bank on the territory of Belarus (the late 16th century).

JSCB "Belarusbank" positions itself as a bank originating from the region of Belarus. It believes it is important and necessary to comprehend the history of its region, to learn from the experience of its predecessors, to distinguish and multiply all the best, positive, time—tested.

"Belarusbank" is defined as a natural result of professional evolution – from the first Bank in the region – to the First regional Bank.

Today, ASB Belarusbank, the successor of the four—century banking and financial tradition, has the leading positions in the domestic banking system in terms of its own capital, assets, loans, and deposits.

"Belarusbank" is the largest universal system—forming financial and credit institution of the Republic of Belarus, which implements effective and reliable solutions and offers all types of banking services and products.

Ад рэдакцыйнай калегіі

Матэрыял, які напоўніў старонкі гэтай кнігі яскрава сведчыць: карані сённяшняга Беларусбанка, яго традыцыі прарастаюць з даўніны, іншым разам, амаль нябачнай за цягам часу.

Намаганнямі аўтараў, рэдактараў, выдаўцоў знойдзена не адна «кропка адліку», дзе яскрава выявіліся найважнейшыя рысы сённяшняга банка – яго ашчадная, крэдытная і сацыяльная функцыі. Удалося прасачыць паслядоўнасць удасканалення банкаўскай справы, развіцця стасункаў між банкам і грамадскасцю, дзяржаўнымі інстытутамі.

Але не ўсё яшчэ асэнсавана і ўключана ў навуковы ўжытак, пэўныя адкрыцці чакаюць свайго часу на паліцах архіваў Еўропы.

Агульнапрызнана прафесійнымі міжнароднымі інстытутамі, Беларусбанк сёння – высока-тэхналагічная, надзейная грашова-крэдытная ўстанова, якая значна ўплывае на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. Гэта вельмі пачэсна для ўсяго калектыву Беларусбанка, але гэта і надзвычай адказна.

Кніга дазваляе зрабіць вельмі важную, лёсавызначальную выснову – напрацоўкі ў банкаўскай справе, што засталіся ад прашчураў, захоўваюцца і памнажаюцца ў сённяшнім Беларусбанку і як Банк «нумар адзін» у Рэспубліцы Беларусь мы нясём вялікі абавязак.

Для гэтага створаны добры падмурак і матэрыяльны, і арганізацыйны, і тэхналагічны, і фінансавы, і, што сёння асабліва важна, у сферы IT-тэхналогій. А галоўнае – ёсць калектыў высокакваліфікаваных спецыялістаў, калектыў аднадумцаў, якія ведаюць куды ісці, як удасканальваць банкаўскі бізнес, цалкам арыентаваны на захаванне і памнажэнне ролі Банка ў развіцці і станаўленні нашай маладой краіны.

Пройдзе час і цяперашнія клопаты калектыву Беларусбанка папоўняць пералік адметных падзей і фактаў развіцця банкаўскай справы на Беларусі, што сабраны пад вокладкай гэтай кнігі.

Беларусбанк скіраваны ў будучыню!

СЛОЎНІК ГІСТАРЫЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

Аблікг — пісьмовае пазыковае абавязацельства ў ВКЛ у XVI–XVIII стст. з пэўнымі рэквізітамі, якое рэгулявала крэдытную здзелку.

Акцыянерныя зямельныя банкі — іпатэчныя банкі, крэдытныя ўстановы, якія спецыялізаваліся на выдачы пазык пад нерухомую маёмасць шляхам выпуску закладных лістоў. Сетка акцыянерных зямельных банкаў у Расійскай імперыі складалася з пачатку 1870-х гадоў.

Апякунская рада — вышэйшая дзяржаўная ўстанова, створаная ў Расійскай імперыі ў 1763 г., якая кіравала дабрачыннасцю і грамадскім доглядам.

Асігнацыі — папяровыя грашовыя знакі Расійскай імперыі (уведзены ў абарачэнне Кацярынай II), якія выпускаліся з 1769 па 1843 г. Разменьваліся на медную манету. К XIX ст. моцна абясцэніліся і ў ходзе грашовай рэформы 1839–1843 гг. былі выключаны з абарачэння.

Ашчадныя касы — крэдытныя ўстановы, якія праводзілі аперацыі на фондавым рынку Расійскай імперыі. Былі адкрыты ў 1842 г., іх галоўнай задачай з'яўлялася прыцягненне грашовых сродкаў насельніцтва. Прыказы грамадскага догляду павінны былі заняцца арганізацыяй ашчадных кас, якія павінны былі сродкаў «людей всякого звания малых остатков от расходов, в запас на будущие необходимости», прымаючы невялікія сумы ад 50 кап. да 10 руб. срэбрам. Ашчадныя касы прымалі ўклады па выдаваемых кніжках на любую суму, не менш за 1 руб. срэбрам, на тэрміновы або бестэрміновы час і на ўмовах па жаданні ўкладчыка. У 1851 г. ашчадныя касы функцыянавалі ва ўсіх прыказах грамадскага догляду беларускалітоўскіх губерняў Расійскай імперыі.

Банк — прыватная, грамадская або дзяржаўная ўстанова, якая займаецца грашовымі і крэдытнымі аперацыямі. у залежнасці ад крыніцы асноўнага капіталу банкі дзяліліся на катэгорыі: дзяржаўныя, грамадскія, саслоўныя, акцыянерныя, таварыствы ўзаемнага крэдыту.

Банкірскія ўстановы — прыватныя крэдытныя ўстановы, якія падзяляліся на 3 віды: банкірскія дамы, банкірскія канторы і мяняльныя лаўкі.

Банкірска-гандлёвы дом — папярэднік сучасных банкаў у ВКЛ, які ажыццяўляў, акрамя іншых функцый, фінансава-крэдытныя аперацыі (ліхвярства).

Банкірскія канторы — прыватныя крэдытныя ўстановы, якія належалі асобным банкірам або групе банкіраў. Узніклі на базе развіцця ліхвярства. Спачатку выконвалі гандлёвыя і банкаўскія аперацыі, затым — толькі банкаўскія.

Банкавае срэбра — высакапробная сярэбраная манета, якая выпускалася расійскім Дзяржаўным банкам да 1915 г.

Білеты Дзяржаўнага казначэйства — разнавіднасць каштоўных папер, эмітаваных урадам Расійскай імперыі (у 1917 г. — Расійскай Рэспублікі) з 1831 па 1917 г. Прымаліся казной ва ўсе плацяжы народзе з папяровымі грашовымі знакамі.

Боны — 1) умоўнае найменне любых папяровых грошай, якія выйшлі з абароту; 2) сурагаты, што замяняюць які-небудзь канкрэтны від грошай. Так, агульнадзяржаўныя боны могуць замяняць разменную манету, а боны, якія эмітуюцца гарадскімі ўладамі і прыватнымі асобамі — замяняць агульнадзяржаўныя папяровыя грашовыя знакі. Як правіла, боны выпускаюцца ў папярова-грашовым выглядзе, але сустракаюцца і выпускі металічных бон (токенаў).

Барацінка — бытавая назва меднага соліда Рэчы Паспалітай 1659–1661, 1663–1666 гг. Назва паходзіць ад прозвішча Ц. Л. Бараціні, ініцыятара іх чаканкі і арандатара манетных двароў Рэчы Паспалітай у 2-й палове XVII ст. Афіцыйная назва ў дакументах — шэлег.

Брэсцкі манетны двор — адзін з цэнтраў манетнай вытворчасці ў Рэчы Паспалітай. Створаны падчас грашовай рэформы 1659–1666 гг. для выпуску меднай манеты — соліда. Праіснаваў з 4 снежня 1665 па 16 снежня 1666 г.

Вэксаль — дакумент, складзены з захаваннем вызначаных патрабаванняў, які ўяўляе сабой грашовае абавязацельства.

Відэркаўф (ад ням. wiederkauf — выкуп) — разнавіднасць іпатэчнага крэдыту, пры якім пазычальнік перадаваў крэдытору маёмасць, што служыла забеспячэннем крэдыту, але захоўваў за сабой права яе выкупу ва ўстаноўлены тэрмін.

Віленскі манетны двор — галоўны цэнтр манетнай вытворчасці ВКЛ. Існаваў з 1492 г. да 30 снежня 1667 г. Выпускаў дэнарыі, соліды, грошы, шастакі, талеры, дукаты, партугалы.

ВКЛ — скарочаная назва Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага — манархічнай дзяржавы беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў у XIII–XVIII стст., з 1569 па 1795 г. — у саюзе з Польскім Каралеўствам у складзе Рэчы Паспалітай.

Ваенны камунізм — назва ўнутранай палітыкі савецкай дзяржавы, якая праводзілася ў 1918–1921 гг. ва ўмовах грамадзянскай вайны. Характарызуецца крайняй цэнтралізацыяй кіравання эканомікай, нацыяналізацыяй буйной, сярэдняй і нават дробнай прамысловасці (часткова), дзяржаўнай манаполіяй на многія прадукты сельскай гаспадаркі, харчразвёрсткай, забаронай прыватнага гандлю, згортваннем таварна-грашовых адносін, ураўняльным размеркаваннем матэрыяльных дабротаў, мілітарызацыяй працы.

Гербавая папера — спецыяльная папера з выявай дзяржаўнага герба, якая прадавалася ўрадам і на якой пісаліся разнастайныя дагаворы і афармляліся здзелкі паміж прыватнымі асобамі і арганізацыямі.

Гербавыя маркі — разнавіднасць фіскальных марак, прызначаная для аплаты пошлін (падат-каў) за аперацыі, звязаныя з дакументамі, дзелавымі паперамі і аказаннем адміністрацыйных або судовых паслуг. На гербавых марках можа паказвацца канкрэтны выгляд збору або падатку, альбо яны могуць выступаць у якасці ўніверсальнага сродку плацяжу. Гербавыя маркі, у ад-розненне ад паштовых, як правіла, не прызначаюцца для аплаты паштовага збору.

Галоўны Трыбунал ВКЛ — галоўны суд, вышэйшая апеляцыйная судовая інстанцыя ВКЛ. Створаны 1 сакавіка 1581 г., пачаў дзейнічаць з 1582 г. Акрамя судовых спраў выконваў натарыяльныя функцыі — завяраў запаветы, пацвярджаў дагаворы куплі-продажу маёнткаў, пазык і г.д.

Гарадскія грамадскія банкі — муніцыпальныя крэдытныя ўстановы, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні органаў гарадскога самакіравання. Існавалі з канца XVIII ст. у Расійскай імперыі, развіццё атрымалі з пачатку 1860-х гадоў. Капітал гарадскіх грамадскіх банкаў утвараўся за кошт адлічэнняў з бюджэтаў гарадоў. Банкі дзейнічалі пад наглядам і адказнасцю гарадскіх дум, аперацыі вяліся на камерцыйнай аснове. Крэдыты выдаваліся як прыватным асобам, так і органам гарадскога самакіравання і мясцовага земства, прыбытак ад аперацый адлічваўся на патрэбы гарадской гаспадаркі і дабрачынныя мэты. Да 1914 г. у Расійскай імперыі дзейнічала 319 гарадскіх грамадскіх банкаў (48 у губернскіх, астатнія ў павятовых гарадах).

Дзяржаўнае казначэйства — дзяржаўны фінансавы орган, у функцыі якога ўваходзілі прыём і захоўванне дзяржаўных даходаў, правядзенне плацяжоў і перавод грашовых сум, выдача пасведчанняў на права займацца гандлем і промысламі, продаж гербавай паперы і інш.

Дзяржаўныя крэдытныя білеты — папяровыя грашовыя знакі, забяспечаныя каштоўнымі металамі, эмітаваныя ў Расіі з 1843 г. З 1843 па 1897 г. разменьваліся на срэбра і золата, з 1897 па 1914 г. — на золата. Эмісія спынена ў пачатку 1920-х гадоў урадам РСФСР.

Дзяржаўны банк Расійскай імперыі — цэнтральны банк, найбуйнейшы банк у крэдытнай сістэме Расійскай імперыі. Заснаваны ў 1860 г. Падпарадкоўваўся непасрэдна міністру фінансаў.

Гатавізна — пэўная сума наяўных грошай у ВКЛ.

Грыўня кіеўская — грашовая і вагавая адзінка Кіеўскай Русі ў XI–XII стст. Вагавае значэнне — 163-165 грамаў. У выглядзе грашовай адзінкі ўяўляла сабой злітак срэбра шасцівугольнай формы. Мела хаджэнне ў «безманетны перыяд».

Грыўня літоўская (ізрой) — грашовая і вагавая адзінка, якая мела абарот на тэрыторыі ВКЛ. Вагавае значэнне — каля 105 грамаў. У выглядзе грашовай адзінкі ўяўляла сабой злітак срэбра палачкападобнай формы. Мела хаджэнне ў «безманетны перыяд». У XIV ст. на змену літоўскай грыўні прыйшоў літоўскі рубель — трохгранны злітак срэбра палачкападобнай формы вагой 170-189 грамаў. Пасля літоўскі рубель стаў таксама лічыльнай грашовай адзінкай ВКЛ.

Грыўня наўгародская — грашовая і вагавая адзінка Наўгародскай феадальнай рэспублікі ў XII–XV стст. З сярэдзіны XIII ст. была распаўсюджана на большай частцы тэрыторыі Старажытнай Русі. Вагавае значэнне — 204 грамы. у выглядзе грашовай адзінкі ўяўляла сабой злітак срэбра палачкападобнай формы. Мела хаджэнне ў «безманетны перыяд». Выпуск наўгародскай грыўні быў спынены ў 1447 г. З канца XV ст. — падліковая грашовая адзінка, роўная 14 наўгародскім дзенгам.

Грыўня польская — грашова-падліковая адзінка ў Польшчы, у ВКЛ бытавала як эквівалент у XIV — пачатку XVI ст. 48 пражскім грошам, а з 1510 г. — 48 польскім грошам або 39,4 грошам літоўскім.

Дваранскія грашовыя казны — крэдытныя ўстановы ў Расійскай імперыі, якія ў сваіх аперацыях павінны былі дзейнічаць на аснове правілаў Пазыковага банка, але дваранскія дэпутацкія сходы ўносілі ад сябе некаторыя карэктывы. Пад заклад душы яны давалі не 40 руб., як было ўстаноўлена законам, а 50-60 руб., а часам нават і больш. Памер пазыкі звычайна ўсталёўваўся сходам у 1 тыс. руб., а тэрмін пазыкі вызначаўся 3 гадамі. У выпадку пратэрміноўкі плацяжу дазвалялася адтэрміноўка або складалася новая закладная.

Дваранскі зямельны банк — крэдытная ўстанова ў Расійскай імперыі, якая выдавала доўгатэрміновыя пазыкі спадчынным дваранам-землеўладальнікам пад заклад зямельнай уласнасці. Заснаваны ў 1885 г. Знаходзіўся ў падпарадкаванні Міністэрства фінансаў.

Грашовая рэформа Вітэ — рэформа грашовага абароту ў Расійскай імперыі ў другой палове 1890-х гадоў, якая ўсталявала залаты монаметалізм. Сваю назву атрымала ад прозвішча міністра фінансаў С. Ю. Вітэ, што праводзіў яе.

Дырэкцыя Скарбовых білетаў — орган часовага ўрада, створанага падчас паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, для падрыхтоўкі і эмісіі папяровых грошай у Рэчы Паспалітай.

Дукат — (ад лац. ducatus — княства) агульнаеўрапейская назва залатой манеты, у тым ліку ў ВКЛ, у 1480 г. быў роўны 21 пражскаму грошу.

Закладныя лісты — разнавіднасць каштоўных папер, якія выпускаліся іпатэчнымі банкамі ў мэтах атрымання сродкаў для выдачы пазык пад заклад нерухомай маёмасці (зямлі і будынкаў). Трымальніку закладныя лісты прыносілі цвёрды даход, што выплачваўся банкам са сродкаў, атрыманых у выглядзе працэнта па пазыках. У Расійскай імперыі іпатэчныя банкі выдавалі пазыкі не грашыма, а закладнымі лістамі, якія рэалізоўваліся непасрэдна пазычальнікам на біржы.

Закупніцтва — заклад асобы да адпрацоўкі або пагашэння пазыкі, які склаўся ў ВКЛ у раннім сярэднявеччы.

Залаты стандарт — сістэма залатога манаметалізму. Усталявана ў Вялікабрытаніі ў канцы XVIII ст., у большасці іншых краін Еўропы — у канцы XIX ст. У Расійскай імперыі ўведзены ў перыяд грашовай рэформы 1895–1897 гг. Для залатога стандарту характэрныя свабодная чаканка і абарот залатых манет, размен банкнотаў на золата (у злітках або манеце). У большасці еўрапейскіх краін быў адменены ў сувязі з пачаткам Першай сусветнай вайны.

Запас эмісійнага права Дзяржаўнага банка — суадносіны паміж сумай выпушчаных у абарот крэдытных білетаў, наяўным залатым запасам Дзяржбанка Расійскай імперыі і аб'ёмам папяровых грашовых знакаў, якія эмітаваліся без залатога пакрыцця. У Расійскай імперыі ў 1897 г. была ўведзена эмісійная сістэма, у адпаведнасці з якой дзяржбанкам дазвалялася выпускаць не пакрытыя золатам крэдытныя білеты на суму да 300 млн руб., а ўся эмісія, што перавышала гэты ліміт, падлягала 100% забеспячэнню золатам. Запас эмісійнага права Дзяржбанка быў роўны, такім чынам, суме залатога запасу плюс 300-мільённы рэзерв.

Застава — заклад на нерухомасць у ВКЛ і Рэчы Паспалітай у форме перадачы маёмасці крэдытору, які выкарыстоўваў працу перададзеных разам з маёнткам феадальна залежных людзей у кошт працэнтаў па пазыцы і мог перасаступаць свае правы іншым асобам.

Застаўны ліст — дакумент, які афармляў прадастаўленне пазыкі вярхоўнай уладзе, як, зрэшты, і іншым пазычальнікам, да якога ў ВКЛ у першую чаргу адносіліся маёнткі, а таксама землі.

Захоўны скарб — крэдытныя ўстановы, якія дзейнічалі ў Расійскай імперыі ў 1772–1860 гг. Выдавалі пазыкі пад заклад населеных маёнткаў, дамоў, фабрык і працэнтных папер. Іх аперацыі распаўсюджваліся на ўсю тэрыторыю Расійскай імперыі, хоць канторы знаходзілася толькі ў Пецярбургу і Маскве. Захоўны скарб абавязваўся плаціць працэнты толькі па тэрміновых укладах, па бестэрміновых укладах бралі з укладчыка адзін працэнт. Злоты (злотувка) — манетны намінал і грашова-падліковы тэрмін. У XIV–XV стст. назва дуката і парытэтнай яму сумы ў 30 грошаў у Польшчы і ВКЛ. У XVI–XVIII стст. асноўная грашова-падліковая адзінка Рэчы Паспалітай.

Імперыял — расійская залатая манета, чаканілася з 1755 па 1897 г. наміналам 10 рублёў, з 1897 па 1911 гг. – 15 руб.

Іпатэка — заклад на нерухомасць у ВКЛ і Рэчы Паспалітай у форме запісу доўгу на маёнтак без перадачы яго крэдытору.

Іпатэчныя банкі — банкі, якія спецыялізуюцца на прадастаўленні доўгатэрміновых пазык пад заклад нерухомасці.

Казённыя крэдытныя ўстановы — Дзяржаўны пазыковы банк, Дзяржаўны камерцыйны банк, захоўны скарб пры выхаваўчых дамах у Пецярбургу і Маскве, прыказы грамадскага догляду. Пацярпелі крах падчас банкаўскага крызісу 1857–1859 гг. У 1860 г. замененыя Дзяржаўным банкам.

Казначэйскі білет — білет Дзяржаўнага казначэйства, які іграў ролю разменных грошай.

Камерцыйныя банкі — акцыянерныя прыватныя банкі, якія займаліся крэдытаваннем і фінансаваннем прамысловасці, гандлю, транспарту, будаўніцтва і іншых галін народнай гаспадаркі за кошт грашовых капіталаў, мабілізаваных у форме ўкладаў і шляхам выпуску ўласных акцый. Узніклі ў Расійскай імперыі з 1860-х гадоў (першы — Пецярбургскі прыватны камерцыйны банк — у 1864 г.). Да 1914 г. у Расійскай імперыі функцыянавала 50 акцыянерных камерцыйных банкаў з 778 аддзяленнямі.

Камерцыйны (гандлёвы) крэдыт — адтэрміноўка плацяжу за перададзены для рэалізацыі тавар.

Кантрактавая манета — абавязацельства вэксальнага тыпу, проціпастаўленне рэальнай манеце, якое патрабуе выплаты пэўнай грашовай сумы.

Капа — падлікова-манетная адзінка ў ВКЛ, якая ўтрымлівала 60 адзінак. Утварылася на аснове эмісіі пражскага гроша, якога чаканілі па стапе 60 манет з пражскай вагавой маркі срэбра («грыўні-капы» вагой 237,3 г чэшскага караля Яна Люксембургскага (1310–1346 гг.)

Крэдытныя білеты — 1) грашовыя знакі, якія эмітаваліся Дзяржаўным банкам (асігнацыі, банкноты); 2) грашовыя знакі, што эмітаваліся Дзяржаўным казначэйствам пад забеспячэнне банкаўскіх білетаў і якія ігралі ролю разменных грошай.

Крэдытныя таварыствы — арганізацыйная форма крэдытнай кааперацыі. Ствараліся для крэдытавання сваіх удзельнікаў пад заклад маёмасці з дапамогай аб'яднання іх сродкаў, атрымання пазык у дзяржаўных і прыватных банках.

Сялянскі пазямельны банк — дзяржаўная крэдытная ўстанова ў Расійскай імперыі, якая выдавала доўгатэрміновыя пазыкі галоўным чынам сялянам на куплю прыватнаўласніцкіх, перш за ўсё дваранскіх, зямель. Створаны ў 1882 г. у Пецярбургу. К 1915 г. меў 68 аддзяленняў. Знаходзіўся ў падпарадкаванні Міністэрства фінансаў.

Ламбард — крэдытная ўстанова, прыватная, казённая ці грамадская, якая займаецца выдачай пазык пад заклад рухомай маёмасці.

ЛітБел — Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, ЛітБел (Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі) — савецкая рэспубліка, дзяржаўнае ўтварэнне, створанае на занятых Чырвонай Арміяй тэрыторыях сучасных Беларусі і Літвы. Існавала некалькі месяцаў (люты — ліпень 1919 г.).

Лічба «літоўская» — сістэма пераразліку больш-менш буйных сум, прадстаўленых рознымі наміналамі на аднастайнай аснове — рынкавыя курсы літоўскага, польскага ці пражскага грошаў. Дзейнічала ў ВКЛ з 1501 г.

Ліхвярства (ліхва) — прадастаўленне грошай у доўг пад працэнт.

Маркі нямецкія (рэйхсмаркі) — грашовыя знакі Германскай імперыі, якія мелі абарот на акупаваных тэрыторыях Расійскай імперыі (Обер Ост) у якасці акупацыйных грашовых знакаў. Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецкай акупацыі, з 11 лютага 1919 г. быў забаронены прыём германскіх акупацыйных грашовых знакаў (у тым ліку і нямецкіх марак) усім савецкім установам, як дзяржаўным, так і прыватным. У час польскай акупацыі Беларусі 1919–1920 гг. каціроўкі нямецкіх марак рэгулярна з'яўляліся ў мясцовым перыядычным друку.

Маркі польскія — акупацыйныя грашовыя знакі Германіі для Варшаўскага генерал-губернатарства ўзору 1916 г. і грашовыя знакі Польскай Дзяржаўнай пазыковай касы ўзору 1919–1923 гг.

Маркі-грошы — грашовыя сурагаты, што ўяўлялі з сябе эмісію паштовых марак на цвёрдай паперы з нанясеннем на іх наддруковак, якія прыраўноўвалі іх у абароце да разменнай манеты. Маглі выкарыстоўвацца і як грашовыя знакі, і як знакі паштовай аплаты.

Мяняльныя лаўкі — дробныя прыватна-крэдытныя прадпрыемствы, якія займаліся разменам грошай.

Міністэрства фінансаў Расійскай імперыі — цэнтральная дзяржаўная ўстанова Расійскай імперыі, якая вяла кіраванне фінансамі і эканомікай. Створана ў 1802 г.

Міністр скарбу (казны) — міністр фінансаў (аўтаномнага) Царства Польскага ў складзе Расійскай Імперыі. Пасада заснавана ў 1815 г. у адпаведнасці з Канстытуцыяй Царства Польскага. Міністр скарбу адказваў за правядзенне адзінай фінансавай палітыкі, ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва і кантроль у галіне арганізацыі фінансаў. Першым міністрам скарбу Царства Польскага ў 1815–1817 гг. быў Тадэвуш Матушэвіч. З 1821 па 1830 г. гэту пасаду займаў князь Францішак Ксаверы Друцкі-Любецкі. У час паўстання 1830–1831 гг. пасада міністра скарбу была ліквідаваная пасля ўстанаўлення дыктатуры генерала Юзэфа Гжэгажа Хлапіцкага 5 снежня 1830 г. Канчатковая ліквідацыя пасады была аформлена з адменай Канстытуцыі Царства Польскага і ўвядзеннем Арганічнага статута Царства Польскага 14 (26) лютага 1832 г.

Народны банк РСФСР — адзіны крэдытны, разліковы і эмісійна-касавы цэнтр Савецкай Расіі. Створаны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у выніку далучэння да Дзяржаўнага банка Расіі акцыянерных камерцыйных банкаў і банкірскіх кантор на падставе Дэкрэта УЦВК аб нацыяналізацыі банкаў ад 14 (27) снежня 1917 г.

Народны камісарыят фінансаў (Наркамфін або НКФ) — цэнтральны дзяржаўны орган кіравання фінансамі ў савецкіх рэспубліках у 1917-1946 гг. Уваходзіў у склад Часовага рабочага і сялянскага ўрада Расіі, створанага згодна з «Дэкрэтам аб заснаванні Савета народных камісараў» 26 кастрычніка (8 лістапада) 1917 г. Наркамат быў прызваны забяспечваць правядзенне адзінай фінансавай палітыкі, а таксама ажыццяўляць агульнае кіраўніцтва ў галіне арганізацыі фінансаў у краіне.

НЭП — новая эканамічная палітыка. Сістэма мерапрыемстваў, звернутых да дзяржаўных функцый кіравання: дзяржаўнага гандлю, дзяржаўнага крэдыту, гаспадарчага разліку, развіцця ўсіх формаў кааперацыі. Праводзілася ў Савецкай Расіі і СССР у 1920-я гады. Была прынята ў сакавіку 1921 г. X з'ездам РКП(б), замяніўшы палітыку «ваеннага камунізму», якая праводзілася ў ходзе грамадзянскай вайны. Мела на мэце аднаўленне народнай гаспадаркі.

Обер Ост — ваеннае адміністрацыйнае ведамства, утворанае ў верасні-лістападзе 1915 г. на акупаваных тэрыторыях Расійскай імперыі, занятых нямецкімі 8-й, 9-й і 12-й арміямі. Агульная плошча 108,8 тыс. км². Афіцыйная назва «Обер Ост» (Ober Ost) узнікла ад скарачэння нямецкага найменння ваеннай пасады фельдмаршала Гіндэнбурга — Вярхоўнага Галоўнакамандуючага на Усходзе (Oberbefehlshaber Ost). Пазней так сталі называць усю мясцовую нямецкую адміністрацыю, а таксама тэрыторыі, якія знаходзіліся пад юрысдыкцыяй Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Ост Каса — так званае Darlehnckasse Ost, аддзяленне нямецкага Усходняга банка для гандлю і прамысловасці (Ostbank fur Handel und Gewerbe), заснаванае ў пачатку 1916 г. у Познані. У сярэдзіне 1916 г. аддзяленне Ост Касы адкрылася ў Коўна. З канца красавіка 1917 г. Darlehnckasse Ost у Коўна атрымала статус незалежнага банка з правам эмісіі папяровых грошай і цалкам перайшло пад кантроль нямецкага Галоўнакамандуючага на Усходзе.

Ост-маркі — акупацыйныя грашовыя знакі (касавыя абавязацельствы) Darlehnckasse Ost у Коўна ўзору 1918 г. Мелі наміналы ½, 1, 2, 5, 20, 50, 100, 1000 марак. Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецкай акупацыі, з 11 лютага 1919 г. забаронены прыём германскіх акупацыйных грашовых знакаў (у тым ліку і ост-марак) усім установам, як савецкім, так і прыватным, за выключэннем Казначэйства. У час польскай акупацыі 1919–1920 гг. каціроўкі ост-марак рэгулярна з'яўляліся ў мясцовым перыядычным друку.

Ост-рублі (осты) — акупацыйныя грашовыя знакі (крэдытныя касавыя чэкі і жалезныя манеты ў 1, 2, 3 капейкі) Германіі для «Усходніх тэрыторый» узору 1916 г., якія выпускаліся Усходнім банкам для гандлю і прамысловасці (Ostbank fur Handel und Gewerbe) у Познані праз Усходнюю пазыковую касу (Darlehnskasse Ost). Мелі наміналы: 20 і 50 капеек, 1, 3, 10, 25, 100 рублёў. Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецкай акупацыі, з 11 лютага 1919 г. забаронены прыём германскіх акупацыйных грашовых знакаў (у тым ліку і ост-рублёў) усім установам, як савецкім, так і прыватным, за выключэннем Казначэйства. У час польскай акупацыі 1919–1920 гг. каціроўкі ост-рублёў рэгулярна з'яўляліся ў мясцовым перыядычным друку.

Паборца — службовая асоба ў ВКЛ, у цэлым адпавядае пасадзе падатковага інспектара ў сучасным разуменні.

Падскарбі дворны (надворны) ВКЛ — службовая асоба ў ВКЛ, асабісты каралеўскі казначэй, адказны за забеспячэнне матэрыяльных патрэб манарха.

Падскарбі земскі ВКЛ — службовая асоба, падскарбі земскі адпавядае ў цэлым міністру фінансаў і эканомікі ў сучасным разуменні. Падскарбі земскі падпарадкоўваўся непасрэдна манарху, ён адказваў за захаванасць дзяржаўнага скарбу, паступленне падаткаў і пазык, кіраваў дзейнасцю манетнага двара і каралеўскіх рэвізораў, паборцаў і іншых чыноўнікаў па гаспадарчай частцы. Падскарбі сачыў за бягучымі дзяржаўнымі выдаткамі, у тым ліку і выплатай грошай войску. Аж да 1634 г. падскарбіі земскія ажыццяўлялі нагляд за станам арсенала і артылерыі ў дзяржаве.

Пазыковыя казны — крэдытныя ўстановы, адкрытыя ў 1772 г. у Пецярбургу і Маскве, сталі дзейнічаць як установы пры выхаваўчых дамах Расійскай імперыі. Згодна са Статутам 1772 г., выдавалі пазыкі ад 10 да 1000 руб. асігнацыямі пад заклад на тэрмін ад 3 да 12 месяцаў, з 6% гадавых. Паўгрош — медная або білонная манета коштам у палову гроша. У ВКЛ хадзілі паўгрош літоўскі, паўгрош польскі і паўгрош свідніцкі.

Паўгрош Свідніцы — білонная манета, якая чаканілася ў Сілезіі ў горадзе Свідніца ў 1517–1527 гг. ад імя вугорскага і чэшскага караля Людвіга Ягелона.

Паўімперыял — расійская залатая манета, якая чаканілася з 1755 па 1897 гг. наміналам 5 руб., з 1897 па 1911 гг. – 7,5 руб.

Пражскі грош — (ад лац. grossi pragensis) чэшская сярэбраная манета, упершыню адчаканеная ў 1300 г. рэальнай вагой 3,78 г, у ВКЛ у XIV–XV стст. складаў аснову рэгіянальных і агульнадзяржаўных грашовых сістэм. У крыніцах называецца чэшскім, шырокім, плоскім або проста грошам.

Прыказы грамадскага догляду — мясцовыя ўстановы, адкрытыя Кацярынай II у 1775 г. У дакуменце «Установы для кіравання губерняў Усерасійскай імперыі» прыказам даручаўся апякунскі нагляд за заснаваннем народных школ і богаўгодных грамадскіх устаноў. Прыказы грамадскага догляду павінны былі выконваць некаторыя крэдытныя аперацыі, ім адпускалася адначасова 15 тыс. руб. асігнацыямі з даходаў губерні і дазвалялася аддаваць гэтыя грошы ў рост, пад заклад нерухомых населеных маёнткаў, якія знаходзяцца ў гэтай губерні, тэрмінам не больш чым на адзін год, не больш за 1 тысячу рублёў і не менш за 500 рублёў у адны рукі. Таксама, як і Захоўны скарб, яны прымалі ўклады ад прадстаўнікоў усіх «праваздольных» саслоўяў. Сродкі прыказа грамадскага догляду заключаліся ў абарачэнні сум, якія захоўваюцца ў прыказе і паступаюць у яго, і ў некаторых старонніх даходах. Капіталы прыказа размяркоўваліся на некалькі разрадаў: капіталы, якія належаць прыказу; прыватныя ўклады; спрэчныя капіталы, г.зн. тыя, што паступілі ў прыказ па іскавых справах; уклады ашчаднай касы, апеляцыйныя, перасыльныя і капіталы, вылучаныя на прызначанае ўжыванне.

Праменныя канторы — былі заснаваны з 1772 г. у буйных гарадах Расійскай імперыі для ліквідацыі манетнага дэфіцыту ў правінцыі, у буйных гарадах імперыі з капіталам у асігнацыях.

Рабочы кантроль — кантроль, які ажыццяўляўся рабочымі над вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў і звязанымі з імі працэсамі.

Рубель літоўскі — грашовая адзінка, якая з'явілася ўпершыню ў Віцебскім княстве каля 1298 г. у выглядзе сярэбранага злітка вагой 189 грамаў, пад назвай «літоўскі рубель» згадваецца ў 1399 г. З 1406–1407 гг. адпавядаў 100 пражскім грошам або 1000 літоўскіх пенязяў. Як грашова-падліковая адзінка выкарыстоўваўся ў ВКЛ да 1772 г.

Рублі «думскія» («думкі») — дзяржаўныя крэдытныя білеты наміналамі 1000 і 250 рублёў узору 1917 г., эмітаваныя Часовым Урадам Расіі.

Рублі «керанскія» («керанкі») — казначэйскія знакі наміналамі 20 і 40 рублёў узору 1917 г., эмітаваныя Часовым Урадам Расіі.

Рублі «савецкія» («саўзнакі», «саветкі») — грашовыя знакі РСФСР і СССР узору 1919–1923 гг.

Рублі «царскія» («мікалаеўка», «мікалаеўскія») — дзяржаўныя крэдытныя білеты Расійскай імперыі ўзору 1898–1912 гг. Выпускаліся і прымаліся ў плацяжы і пасля звяржэння самадзяржаўя. Карысталіся папулярнасцю ў насельніцтва, прымаліся ў плацяжы і досыць высока каціраваліся за мяжой і на акупаваных тэрыторыях.

Скарбнік, скарбны (казначэй) — службовая асоба ў ВКЛ. У кампетэнцыю скарбніка ўваходзіў нагляд за казной (скарбам). У рэальнасці скарбнік з'яўляўся намеснікам падскарбія земскага ў Вільні.

Скарбовая камісія ВКЛ — эканамічная рада скарбу (казны) ВКЛ, цэнтральны калегіяльны орган улады ВКЛ па кіраванні фінансамі і дзяржаўнай казной. Створана 16 мая 1764 г. з мэтай абмежавання паўнамоцтваў вялікага і надворнага падскарбія, а таксама для паляпшэння кіравання фінансамі і павелічэння дзяржаўных даходаў. Дзейнічала з 1 студзеня 1765 г. па 29 кастрычніка 1791 г. і з 23 лістапада 1793 г. па 9 мая 1794 г.

Скарбовы Трыбунал ВКЛ — вышэйшы фінансавы суд, адміністрацыйная і судовая ўстанова ў ВКЛ, якая ажыццяўляла кантроль за прыбыткамі і выдаткамі дзяржаўнай казны (скарбу), разглядала справы па нявыплаце падаткаў дзяржаве. Дзейнічаў з 1591 па 1764 г.

СНК — Савет Народных Камісараў. Назва ўрада Савецкай Расіі з 1918 па 1946 г. Першапачаткова быў сфарміраваны дэкрэтам II Усерасійскага З'езда Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў як Савет народных камісараў. Пасля прыняцця Канстытуцыі РСФСР 1918 г. стварэнне Савета народных камісараў РСФСР з'яўлялася прэрагатывай УЦВК. У склад СНК уваходзілі народныя камісары, якія кіравалі народнымі камісарыятамі (наркаматамі, НК). Падобныя саўнаркамы ствараліся і ў іншых савецкіх рэспубліках. Пры ўтварэнні СССР быў створаны Савет Народных Камісараў СССР.

Савет дзяржаўных крэдытных устанаўленняў — заснаваны ў 1817 г. у Расійскай імперыі. На яго быў ускладзены абавязак назірання за пагашэннем дзяржаўных пазык і за казённымі банкамі.

ССРБ — Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь. Дзяржаўнае ўтварэнне, якое існавала на частцы тэрыторыі сучаснай Беларусі з 1 студзеня да 27 лютага 1919 г. З 31 студзеня 1919 г. афіцыйная назва — Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь.

СПА СССР — Савет Працы і Абароны СССР. Орган па кіраўніцтву гаспадарчым будаўніцтвам і абаронай, які накіроўваў дзейнасць эканамічных камісарыятаў і ўсіх ведамстваў. Утвораны ў красавіку 1920 г. як камісія СНК РСФСР. У 1923 г. пры ўтварэнні СНК СССР СПА РСФСР быў ліквідаваны і ўтворaны СПА СССР.

Таварыствы ўзаемнага крэдыту — установы кароткатэрміновага крэдыту ў Расійскай імперыі, якія забяспечвалі дробных прамыслоўцаў недарагім крэдытам з дапамогай уліку вэксаляў і выдачы пазык у памеры адкрытага пэўнай асобе крэдыту ў залежнасці ад яе крэдытаздольнасці і асабістых якасцей.

Талер — сярэбраная манета, якая з'явілася ўпершыню ў Аўстрыі ў 1484 г. (т.зв. «гульдэнгрошэн»), затым у 1518 г. — у Чэхіі («іохімсталер»), атрымаў у Германіі назву «талер», у Расіі — «ефімок». У Польшчы ўпершыню быў адчаканены ў 1567 г. у Гданьску, а ў ВКЛ — у 1564 г. Упершыню ў беларускіх крыніцах згадваецца ў 1555 г., быў роўны 30 літоўскім грошам.

Тымф — непаўнавартасная сярэбраная манета Рэчы Паспалітай 2-й паловы XVII — 1-й паловы XVIII ст. Назва паходзіць ад прозвішча арандатара манетных двароў Анджэя Тымфа, ініцыялы якога ставілі на рэверсе манеты. Афіцыйная назва ў дакументах — орт злотавы, орт тымфавы.

Урад — назва кіраўнічага апарату і пасадаў у цэнтры і на месцах у ВКЛ.

УЦВК — Усерасійскі цэнтральны выканаўчы камітэт. Вышэйшы заканадаўчы, распарадчы і кантралюючы орган дзяржаўнай улады Расійскай Савецкай Рэспублікі ў 1917–1918 гг. і РСФСР з 1918 па 1937 г.

Фанты — тавары, якія выкарыстоўваліся ў ВКЛ у XV–XVI стст. для разлікаў і плацяжоў пры адсутнасці наяўных грошай.

Цэрограф — пісьмовае пазыковае абавязацельства ў ВКЛ у XVI–XVIII стст. з пэўнымі рэквізітамі, якое рэгулявала крэдытную здзелку.

Шастак — сярэбраная манета наміналам у 6 грошаў, якая мела хаджэнне ў ВКЛ у Рэчы Паспалітай у XVI–XVIII стст.

Ялмужна — добраахвотная міласціна.

ЗМЕСТ

Дабанкаўскі перыяд

На шляху да грошай 10
Манетныя імпарты 16
Пачатак фарміравання мясцовай сістэмы разліковых сродкаў 18
Першыя эмісіі ўласных манет у ВКЛ 20

Протабанкаўскі перыяд

Грашовае абарачэнне Вялікага Княства Літоўскага 26
Фінансавыя інстытуцыі Вялікага Княства Літоўскага 34
Захаванне і ашчаджанне грошай 40
Крэдытныя адносіны 44
Протабанкаўскія элементы 52
Прававая база крэдытных адносін 54

Раннебанкаўскі перыяд

Раннія царкоўныя банкі («montes pietatis») 64
Крокі да цэнтральнага банка 74
Грашовае абарачэнне: папяровыя грошы 78
Рэарганізацыя грашовага абарачэння 82
Рэарганізацыя крэдытна-ашчадных адносін 88
Арганізацыя банкаў у Расіі 94
На парозе расійскай банкаўскай сістэмы 98
Знешні выгляд банкаўскіх служачых 108

Банкаўскі перыяд

Уваходжанне ў расійскую дзяржаўную банкаўскую сістэму 114
Гарадскія банкі 120
Камерцыйныя банкі 128
Дробныя банкаўскія ўстановы 140
Таварыствы ўзаемнага крэдыту 142
Іпатэчныя банкі 150
Ламбарды 154
Ашчадныя касы 154

Выпрабаванні на трываласць

Напярэдадні: у складзе імперыі 192
І Сусветная вайна 196
Падчас нямецкай акупацыі (I) 202
Дзеянні савецкай улады 206
У палітычных кругаротах 212
На польскім баку 214
На савецкім баку 224
ІІ Сусветная вайна 234
Падчас нямецкай акупацыі (II) 236

Крышталізацыя рэгіянальнага банка

Аднаўленне фінансавай сістэмы 248
Ашчадныя касы: новая якасць 254
Ашчадная каса № 16 262
Ашчадны банк 264

Флагман банкаўскай сістэмы

ААТ «ААБ Беларусбанк» 272
Прафесіяналы банкаўскай справы 274
Праўленне ААТ «ААБ Беларусбанка» 282
Стратэгія лідарства 284

P.S 338
Заключэнне 342
Ад рэдакцыйнай калегіі 348
Слоўнік гістарычных тэрмінаў 349

Навукова-папулярнае выданне

Банкаўская справа Беларусі. Гісторыя
на беларускай мове

Рэдактары:
Т.У. Бялова, С.Ю. Баравіцкая, К.М. Чарапок

Мастацкае афармленне і камп'ютарная вёрстка:
М.В. Чэчко, У.П. Свентахоўскі, В.В. Салодкая

Стыль-рэдактар:
Л.В. Дранько-Майсюк

Падпісана да друку 14.11.2017. Фармат 70Х100/8.
Папера мелаваная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 45. Ул.-выд. арк. 59,5.
Тыраж 1210 экз. Заказ 30418.

+0

Выдавецтва:
ТДА «Беловагрупп»
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў №1/70 ад 01.11.2013.
Вул. Чапаева, 3-116, 220034, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
e-mail: belovagroup@yandex.ru

Паліграфічнае выкананне:
ОАО «Подольская фабрика офсетной печати».
г. Подольск, Ревпроспект, 80/42.
www.ofsetpodolsk.ru.
Тел. 8(4967) 69-97-29, 8(4967) 69-97-22.